КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ №22 (150)
◂ 19 ЧЭРВЕНЯ ◂ 2009 г.

Новы Час

“У БЕЛАРУСІ АДНОЙЧЫ МУСІЦЬ РАСПРАНУЦЦА КОЖНЫ”

Стар. 15

ЯК КОСТКА Ў ГОРЛЕ

Другі раз у гэтым годзе і пяты раз з 2004-га брэсцкім грамадскім актывістам адмаўляюць у рэгістрацыі праваабарончага грамадскага аб’яднання “Брэсцкая вясна”.

Стар. 6

ВАЙНА ЗА “НАЦЫЯНАЛЬНЫ КАМПАНЕНТ”

Акрамя Рэспублікі Беларусь апошнім часам выклік Крамлю кінула і іншая РБ — Рэспубліка Башкірыя.

Стар. 11

ВЕРШНІКІ НА КОНЯХ

Стар. 14

ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!

Мастак стагоддзя з Астравеччыны

Нарыс Сяргея Гваздзёва з цыклу «Мастакі Віленскай школы»

ГЕАПАЛІТЫКА

РАСІЙСКА-БЕЛАРУСКІЯ ВОЙНЫ

Аляксей Кароль

Тры вайны за апошнія шэсць няпоўных гадоў: газавая ў 2004-м, нафтавая ў 2007-м і ўрэшце малочная. Пачалася яна 28 мая з рэзкай публічнай ацэнкі эканомікі Беларусі расійскім міністрам фінансаў Аляксеем Кудрыным і затрымкі чарговай траншы абяцанага крэдыту. Далей па нарастаючай. Забарона на пастаўкі беларускай малочнай прадукцыі ў Расію, у адказ — увядзенне з 9 гадзін раніцы 17 чэрвеня ўзмоцненага мытнага кантролю. Аднак ужо пад вечар таго ж дня ў выніку перамоў забарона і кантроль былі ўзаемна адменены. Такі вось двухтыднёвы бліцкрыг. Без відавочных пераможцаў. Тады чаму і навошта?

Палітыкі прыходзяць і сыходзяць, а Беларусь – застаецца.

Тым больш, што ўсе канфлікты адбываліся пасля і на фоне шматгадовай фантасмагарычнай плыні інтэграцыйнай рыторыкі пра славянскае братэрства і пабудову саюзнай дзяржавы. Вось ужо сапраўды па Джорджу Оруэлу: “Вайна — гэта мір. Мір — гэта вайна”. Як спецыяльна да шасцідзесяцігоддзя з дня выхаду бессмяротнай антыўтопіі вялікага пісьменніка “1984”, у пацвярджэнне яе, на жаль, не старэючай і не слабеючай актуальнасці.

Ключ да адказу на пытанне: “Чаму і нашто?”, бадай што, мы знойдзем у інтэрв’ю А. Лукашэнкі расійскім журналістам ад 1 чэрвеня. Беларускі лідэр пагрозліва папярэдзіў, што ён, магчыма, і не супраць поўнага і канчатковага саюза з Расіяй, але тады гарантавана вайна: “У нас жа ў Беларусі не дурны народ, ён мысліць таксама, як і расіяне: “Свая зямля, нікому не аддадзім, кашулю рванулі і пайшлі”. Вы што, хочаце стварыць яшчэ адну Чачню тут? Я не хачу”.

У малочнай вайне, у адрозненні ад папярэдніх, упершыню наўпрост звязалася эканамічнае супрацоўніцтва з ваенным (байкот пасяджэння АДКБ і падпісання адпаведнай дамовы пра стварэнне супольнага войска) і ўпершыню наўпрост быў закрануты памежны рэжым. Канфлікт па сутнасці ахапіў усе сферы двухбаковага супрацоўніцтва. Гэта не мір, а замірэнне, у якім кожны з бакоў чакае свайго часу дзеля дасягнення сваіх мэтаў. І таму трэба чакаць новых абвастрэнняў.

Як ні парадаксальна, разварот ад інтэграцыі да войнаў на самай справе ёсць не адмаўленне папярэдніх палітычных курсаў двух рэжымаў, а іх непасрэдны працяг. Двух рэжымаў аднаго аўтарытарнага тыпу. Расійскага, як спадкаемцы эсэсэсэраўскага, з вялікадзяржаўнай імперскай традыцыяй за плячыма, завостранага на аднаўленне і пашырэнне свайго геапалітычнага ўплыву. І беларускага, адбудаванага на аскепку савецкай імперыі, завостранага на самасцвярджэнне і, па абставінах, на пашырэнне. З істотнай, аднак, асаблівасцю — пашырэнне не праз тэрытарыяльныя заваёвы, а праз прарыў вярхоўнага беларускага кіраўніка ў лідэры новаствораной саюзнай дзяржавы. На той самы крамлёўскі пасаг.

Была выгоднай інтэграцыйная ідэя — абодва бакі актыўна, кожны пад сябе, эксплуатавалі яе. Не прынесла чаканых вынікаў — пачаліся канфлікты. У сукупнасці тры вайны вызначылі два стратэгічных напрамкі і адпаведныя ім інструменты барацьбы за свае інтарэсы. Валоданне энергарэсурсамі і рынкам збыту для беларускіх тавараў — зброя расійскай кіроўнай эліты. Валоданне пэўным кантролем на пэўным адрэзку шляху за транзітам нафты і газа з Расіі на Захад — зброя беларускай. Адсюль і крэн афіцыйнага Мінска на Захад як дадатковая магчымасць для манеўра. Павернецца сітуацыя ў іншы бок — імгненна ж, на паўноце, аднавіцца інтэграцыйная песня.

Выключна ў гэтых рамках — улада і яе пашырэнне — беларускі рэжым і ўспрыняў ідэю незалежнасці. Не выпадкова ж за ўсе гады свайго існавання ўладная вертыкаль не зрабіла ніводнага кроку спрыяння развіццю беларускай мовы і культуры.

У малочнай вайне А. Лукашэнка адкрыта прадэманстраваў, што яму не даспадобы поза васала. Адбіўся як характар аўтарытарнай улады, якая імкнецца быць самастойнай, так і характар Лукашэнкі. Ён не адмовіўся ад сваёй ранейшай мэты. І таму не мог дапусціць слабасці. Мусіў выглядаць у вачах расійскага электарату моцным і нязломным. Па сведчанню расійскіх аналітыкаў, у пэўнай ступені яму гэта ўдалося.

Гэта наўрад ці можна сказаць пра беларускі электарат. Безумоўна, антырасійская кампанія ў афіцыйных СМІ спрацуе на мабілізацыю цвёрдых прыхільнікаў А. Лукашэнкі. Але ж у нейтральных, што не вызначыліся і вагаюцца, адаб’ецца сумбурам у галовах. І ў любым варыянце — на лязе крызісу і войнаў паглыбілася лінія расколу ў грамадстве.

Аднак ідэя незалежнасці, тым больш рэалізаваная ў форме дзяржаўнасці на працягу двух дзесяцігоддзяў, мае сваю логіку развіцця. Ёсць падставы, якія таксама выявілася на лязе канфліктаў, спадзявацца, што ўжо незваротную — ні праз інкарпарацыю Беларусі ў склад Расіі, ні праз пераўтварэнне яе ў расійскага сатэліта, ні праз стварэнне саюзнай дзяржавы. Логіка, непадуладная волі любых правадыроў, якім найлепш гэтую логіку зразумець і ёй не супраціўляцца.

Ідэя незалежнасці, наглядная дэманстрацыя неабходнасці ўмацавання суверэнітэту Беларусі ёсць ці не адзіны пазітыўны вынік трох расійска-беларускіх войнаў. Але найлепш гэтая ідэя ажыццяўляецца ў рамках дэмакратычнага грамадства. І на гэтым фоне становіцца зразумела, што праграма “Усходняга партнёрства” Еўрасаюза была абсалютна своечасовай. Беларусь у другі раз ад пачатку 1990-х гадоў атрымала унікальны гістарычны шанец увайсці ў еўрапейскую супольнасць і застацца ў добрасуседскіх адносінах з Расіяй. Не прамінуць бы зноў.

ФАКТЫ, ПАДЗЕІ, ЛЮДЗІ

НАВІНЫ РЭГІЁНАЎ

ДАЎГАЎПІЛС. МАЙСТРЫ І МАСТАКІ

Браслаўскі клуб майстроў і мастакоў "Ля возера", які працуе пры музейным аб'яднанні горада, быў запрошаны на фестываль народных мастацтваў у Даўгаўпілс (Латвія). У рамках фестывалю праводзілася свята ганчарства. Побач з цэнтральнай плошчай была зроблена вялікая печ для абпалу керамікі. Яна была ўрачыста закладзена, і з гэтага моманту пачаўся кірмаш.

На свяце можна было ўбачыць як сучасныя дэкаратыўна-ўжытковыя, так і аўтэнтычныя экспанаты. Ля пляцоўкі разгарнулі нацыянальныя кухні зямляцтвы ўкраінцаў, літоўцаў, расіян, палякаў, беларусаў. Побач выступалі творчыя калектывы з вышэйназваных краін. Браслаўскія ўмельцы прадставілі на выставу-продаж рэчы з саломкі, гліняныя вырабы, тканыя паясы, габелены, разьбу па дрэве.

ВІЛЕЙКА. МАНУМЕНТАЛЬНЫЯ "ДРАЎЛЯНШЧЫКІ" СПАБОРНІЧАЮЦЬ

З 11 па 20 чэрвеня ў Вілейцы адбываецца Мінскае абласное свята-конкурс майстроў манументальнай драўлянай скульптуры "Сонечная цеплыня дрэва". У конкурсе ўдзельнічаюць 8 лепшых майстроў Міншчыны і 3 умельцы з Брэсцкай вобласці, якія на працягу 10 дзён будуць паказваць сваё майстэрства. Яны павінны стварыць не менш за два вырабы традыцыйнага характару (драўляную скульптуру, дэкаратыўнае пано і інш.), выкарыстоўваючы розныя віды і тэхналагічныя прыёмы мастацкай апрацоўкі дрэва.

Усімі неабходнымі матэрыяламі канкурсанты забяспечаны. Скульптуры, якія будуць зробленыя падчас свята-конкурсу, упрыгожаць Вілейку і іншыя населеныя пункты раёна. Кампетэнтнае журы абярэ пераможцаў у 4 намінацыях — "За захаванне і творчае развіццё традыцый разьбярства па дрэве", "За высокае майстэрства і мастацкі густ", "За творчую фантазію", "За творчы дэбют".

ГЛЫБОКАЕ. БАРДЫ СПЯВАЛІ Ў ВЁСЦЫ

У вёсцы Перадолы 13–14 чэрвеня адбыўся фестываль бардаўскай песні. Ён прайшоў на сядзібе Мар'яна Місевіча, прадпрымальніка з Падсвілля, які вельмі паважае роднае слова, а таксама тых, хто ім карыстаецца, захоўвае гісторыю свайго роду.

Арганізатарамі фестывалю сталі культурна-асветніцкі цэнтр імя Язэпа Драздовіча і рэсурснага цэнтр «Барміца» ў асобах іх кіраўнікоў Ады Райчонак і Яраслава Берніковіча. Адкрыла фестываль Ада Райчонак — менавіта яна прыклала найбольш намаганняў, каб гэты фестываль адбыўся. Пасля слоў прывітання выступіў мясцовы бард Антон Марговіч. Ён выканаў чатыры песні на словы паэткі з Падсвілля Марыі Баравік.

Дзве песні былі выкананыя дуэтам, Антону дапамагала Лера Райчонак, унучка Ады Эльеўны. Пасля выступіла знакамітая беларуская спявачка Кася Камоцкая. Пасля выступлення ўдзельнікаў прывітала Яніна Ермалаева, браслаўчанка, якая жыве зараз у Швецыі. Яна падзякавала за магчымасць пачуць беларускія песні, якія людзі спяваюць ад чыстага сэрца, не за грошы. Затым эстафету прыняў Эдуард Акулін, не менш вядомы беларускі паэт і бард.

Пасля прысутных парадавала сваім талентам Вольга Акуліч. Тым больш, што шмат хто з прысутных чуў яе ўпершыню. Яшчэ на большы ўзровень падняў настрой гледачоў знакаміты беларускі бард Андрэй Мельнікаў, які ўзяў слова пасля Вольгі. І завяршыла першую частку праграмы наша зямлячка палачанка Лера Сом. У заключэнне слова ўзяла Ада Райчонак. Яна падзякавала выканаўцам за беларускую песню, якую зараз мала дзе пачуеш. Нават на вяселлях, як адзначыла арганізатарка, ніхто не спявае беларускіх песень, хаця амаль усе іх ведаюць. Таксама было сказана, што гэта першы бардаўскі фестываль, які адбыўся не за мяжой, а ў Беларусі, і ён абяцае стаць традыцыйным.

МЯДЗЕЛ. КІРМАШ РАМЁСТВАЎ

20 чэрвеня ў вёсцы Камарова Мядзельскага раёна адбудзецца чацвёртая выстава-кірмаш народных рамёстваў і промыслаў "Камарова — кола дзён". Да ўдзелу ў мерапрыемстве запрошаны рамеснікі і суб'екты прадпрымальніцтва з абласцей і сталіцы. Кірмаш разгорнецца на тэрыторыі сядзібна-паркавага комплексу.

На кірмашы будзе арганізаваная дэманстрацыя працаў народных рамеснікаў, праведзеныя майстар-класы, тэатралізаванае шоу, святочны канцэрт, дзіцячыя і спартовыя конкурсы. Плануецца правесці круглы стол "Досвед і далягляды правядзення выставаў-кірмашоў у малых гарадах і сельскай мясцовасці".

ПАСТАВЫ. УСПАМІН ПРА КІРЗАВЫЯ БОТЫ

Пабачыла свет новая кніга журналіста з Пастаў Алеся Касцяня "Каменьчыкі ў кірзавым боце". У ёй распавядаецца пра службу аўтара ў савецкім войску ў 70-я гады мінулага стагоддзя. Прачытаць успаміны будзе цікава як тым, хто сам праходзіў службу ў гады СССР, так і маладым людзям. Кніжка выдадзена пры дапамозе рэсурснага цэнтра "Барміца". Дапамаглі ў выданні таксама Зміцер Лупач, Юры Калбасіч, Яраслаў Берніковіч з Глыбоччыны і Міхал Гіль з Пастаў.

Падрыхтаваў Язэп Палубятка

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

АБРАБАВАЛІ ДЫРЭКТАРКУ "БЕЛСАТУ"

Барыс ЖАЎТКОЎ

Панішчылі ды абрабавалі варшаўскую кватэру дырэктаркі каналу "Белсат" Агнешкі Рамашэўскай.

Невядомыя злачынцы папсавалі маёмасць. На думку Агнешкі Рамашэўскай, да звычайнага крадзяжу гэта не падобна. Дзверы ў кватэру злачынцы адчынілі прафесійнымі адмычкамі. Беспарадак пакінулі ва ўсіх пакоях без выключэння. Паўсюль — параскіданыя рэчы, кнігі, паперы. Са словаў паліцыі, усё рабілі ў пальчатках, бо адбіткаў пальцаў не знайшлі. Пры гэтым забралі найбольш танныя рэчы, а даражэйшыя — тэхніка, сямейнае срэбра, мабільныя тэлефоны — засталіся некранутымі. Усе ж скрадзеныя рэчы (3 залатыя ланцужкі ды некалькі срэбных пярсцёнкаў), як цвердзіць Агнешка Рамашэўская, не былі схаваныя, іх не трэба было шукаць ва ўсёй кватэры. На кухні злачынцы разаслалі кашулю з надпісам "Небяспека: журналіст на працы". Паліцыя, як і Агнешка Рамашэўская мяркуюць, што, магчыма, гэта крадзеж. Аднак не выключана, што здарэнне магло адбыцца на замову беларускіх спецслужбаў, якія неаднаразова пераследавалі журналістаў і працаўнікоў тэлеканалу.

ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА

ЗАБАРОНА НА ПРАФЕСІЮ

15 чэрвеня кіраўніцтва Гомельскай абласной клінічнай псіхіятрычнай бальніцы паведаміла ўрачу-псіхіятру, актывісту аргкамітэта па стварэнні партыі "Беларуская хрысціянская дэмакратыя" Сяргею Трыфанаву пра непадаўжэнне працоўнага кантракта, тэрмін якога заканчваецца 19 ліпеня. У бальніцы ён адпрацаваў 3 гады.

Як паведаміў БелаПАН Сяргей Трыфанаў, ён звязвае непадаўжэнне кантракта з актыўнай палітычнай і грамадскай дзейнасцю. Падчас працы ў псіхіятрычнай бальніцы ўрач не меў сур'ёзных дысцыплінарных спагнанняў, адміністрацыя медыцынскай установы не выказвала заўваг наконт прафесійнай дзейнасці. Пры гэтым яго неаднаразова папярэджвалі пра недапушчальнасць удзелу ў апазіцыйных партыях і масавых мерапрыемствах, не санкцыянаваных уладамі.

Паводле слоў актывіста, у гутарцы з ім 15 чэрвеня галоўны ўрач патлумачыў, што да выканання прафесійных абавязкаў ён заўваг не мае, але яго не задавальняла, што ўрач "не праяўляў актыўнасці ў грамадскім жыцці", "быў мала прыкметны ў бальніцы" і быў "аморфным". "Я парываў наконт сваёй "прыкметнасці", што не нашу шапку-невідзімку і мяне заўсёды можна было ўбачыць на працоўным месцы. І наконт удзелу ў грамадскім жыцці — гэта спрэчнае сцвярджэнне. Напэўна, мы жывем у розных грамадствах", — падкрэсліў Сяргей Трыфанаў.

Раней актывіст апазіцыі за ўдзел у масавых мерапрыемствах, што былі ініцыяваныя недзяржаўнымі арганізацыямі, штрафаваўся і арыштоўваўся. Вясной 2008 года Трыфанаў быў арыштаваны на 10 сутак за ўдзел у акцыі, прымеркаванай да Дня Волі 25 сакавіка.

СПРАВА

ПЕРАСЛЕД ЗА "МІРНЫ АТАМ"

Язэп Палубятка

На мінулым тыдні чыноўнікі Міністэрства інфармацыі склалі пратакол аб адміністрацыйным правапарушэнні на праваабаронцу, ініцыятара стварэння грамадскага руху "Астравецкая атамная — гэта злачынства" Івана Крука.

Фармальнай прычынай стала тое, што на кватэры аднаго з жыхароў Астраўца супрацоўнікі РАУС знайшлі асобнік газеты "Новы час" і бюлетэні "Астравецкі веснік", "Мірны атам", "Глоток воздуха". Гэтыя выданні грамадзянін атрымаў ад Івана Крука. Міліцыя канфіскавала іх і накіравала ў Міністэрства інфармацыі, дзе прышлі да высновы, што Крук распаўсюджваў друкаваную прадукцыю без адпаведных выходных дадзеных, акрамя газеты "Новы час", якую міністэрства вярнула ўладальніку.

Неўзабаве адбудзецца суд, які, згодна Кодэксу аб адміністрацыйных правапарушэннях, можа аштрафаваць Крука на 30–50 базавых велічынь.

ГРАМАДЗЯНСКАЯ СУПОЛЬНАСЦЬ. НАВІНЫ ТЫДНЯ

СМАРГОНЬ. ПОМНІК ФРАНЦІШКУ БАГУШЭВІЧУ

6 верасня ў Дзень беларускай пісьменнасці, які сёлета адбудзецца ў Смаргоні, плануецца адкрыць помнік Францішку Багушэвічу. Чатырохметровы помнік — Францішак Багушэвіч, які сядзіць на камяні, — размесціцца побач са смаргонскім гатэлем. Ідэя стварыць помнік заснавальніку беларускай літаратуры, чыё жыццё была звязана са Смаргоншчынай (вёскай Кушляны), з'явілася яшчэ ў 1990-я гады мінулага стагоддзя. Тады правялі конкурс і вызначылі лепшы праект помніка. Аднак праз розныя абставіны ўвасобіць творчую ідэю народнага мастака Беларусі, заслужанага дзеяча мастацтваў, скульптара Льва Гумілеўскага тады не атрымалася. Тэма стала зноў актуальнай, калі стала зразумела, што Дзень беларускай пісьменнасці–2009 будзе прымаць Смаргонь. У Кушлянах, дзе Багушэвіч правёў апошнія гады жыцця, размяшчаецца музей-сядзіба паэта — філіял Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры. У музеі адноўленыя два пакоі — гасцёўня і кабінет. У літаратурнай частцы экспазіцыі — дакументы, першыя складанкі вершаў, жалобныя стужкі, фатаграфіі, прысвячэнні. Захаваліся альтанка, стары парк і каштанавая алея, большасць дрэваў у якіх пасаджаныя рукамі паэта. Пахаваны паэт у Жупранах (Ашмянскі раён).

НАВАПОЛАЦК. ПРЭЗЕНТАЦЫЯ

18 чэрвеня суполка "Рубон" Наваполацкай гарадской арганізацыі Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны арганізавала прэзентацыю "Полацкага нумара" часопіса ARCHE. У мерапрыемстве прынялі ўдзел рэдактар часопіса Валеры Булгакаў, пісьменнік Уладзімір Арлоў, філолаг Лявон Баршчэўскі.

МАСТЫ. ЧЫНОЎНІКІ НЕ ВЕДАЮЦЬ МОВЫ

Старшыня Мастоўскага райвыканкама Шафарэвіч афіцыйна адказаў на запыт рэгіянальнага каардынатара Руху "За Свабоду" па Гродзенскай вобласці Алеся Зарэмбюка, што зрабіць беларускамоўную версію райвыканкамаўскага сайта немагчыма, і спаслаўся на дзяржаўныя нарматыўныя дакументы, хоць рэгламент інфармацыйнага папаўнення інтэрнэт-старонкі прадугледжвае размяшчэнне звестак па-беларуску і па-англійску.

ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

БЕЗ КРЭДЫТУ, ЗАТОЕ З МАЛАКОМ

Аксана Харлан

Безумоўна, галоўнай тэмай гэтага тыдня стаў малочны канфлікт паміж Беларуссю і Расіяй, але пра яго дэталі і наступствы чытайце ў іншых артыкулах гэтага нумару. Спынімся на іншых падзеях, хаця і пра малако ўсё ж пагаворым.

14 чэрвеня каля сталічнага Палаца спорту прайшоў рэспубліканскі фестываль "Дзень малака". Бясплатныя дзіцячыя атракцыёны, гульні, конкурсы, святочны канцэрт з удзелам артыстаў беларускай эстрады і, зразумела, дэгустацыі і кірмаш малочнай прадукцыі ўсіх беларускіх вытворцаў — чаго тут толькі не было. Тыя, хто не з'ехаў на лецішча ці на шашлыкі, маглі пачаставацца высакаякаснай беларускай прадукцыяй і тое-сёе прыкупіць дахаты. І чаго гэтыя расіяне выпендрываюцца? То ім якасць не тая, то кошты занізкія. Дарэчы, напярэдадні ў сталіцы прайшло яшчэ адно свята малака — "МалочнаСакавіты фестываль Мінск–2009", арганізатары якога падкрэслівалі, што фестываль — "не аператыўная піяр-акцыя, звязаная з праблемамі паставак беларускай малочнай прадукцыі на расійскім рынку", а запланаванае мерапрыемства. Сапраўды, нашто нам такі піяр, лепш самі з'ядзім. А калі пачаць харчавацца толькі малочнымі вырабамі, можна і заробкі не падвышаць.

Тым больш, што грошы на гэта трэба яшчэ пашукаць. "Беларусь не зможа прэтэндаваць на расійскі крэдыт, калі зацягне прыняцце мер па аздараўленні эканомікі", — лічыць міністр фінансаў Расіі Аляксей Кудрын. Выдзяленне Расіяй апошніх 500 мільёнаў долараў з двухмільярднага крэдыту залежыць ад "прыняцця рашучых мер урадам Беларусі па аздараўленні сваёй эканомікі", як заявіў міністр у размове з журналістамі ў Лечэ (Італія), дзе праходзіла сустрэча міністраў фінансаў "Вялікай васьмёркі".

"Тым часам урад Беларусі не прымае дастатковых мер", — перадае "*РИА Новости*" словы Кудрына. Вось і разбярыся: МВФ кажа, што ўсё не так дрэнна, Сусветны банк грошы дасць. А гэтыя зноў нешта круцяць. За два тыдні Кудрын некалькі разоў змяніў сваё меркаванне наконт грошай і Беларусі. 28 мая сказаў, што грошы пакуль не дадуць, бо Беларусь не хоча іх браць расійскімі рублямі. 5 чэрвеня абяцаў, што дадуць 500 мільёнаў долараў, але трэба яшчэ перамовіцца. А вось 100 мільярдаў расійскімі нам не пазычаць. 9 чэрвеня міністр заявіў, што крэдыт Беларусі ў памеры 500 мільёнаў долараў можа быць выдзелены са сродкаў антыкрызіснага фонду ЕўрАзЭС. А зараз зноў — не дадуць. Можна вызначыцца і больш дакладна, мы б тады пашукалі ў іншых месцах.

Ці то пакрыўдзіўшыся з-за грошай, ці то раззлаваўшыся з-за малака, ці нарэшце задумаўшыся пра лёс свайго народа, але кіраўніцтва Беларусі адмовілася ўдзельнічаць у запланаванай на 14 чэрвеня ў Маскве сесіі Савета калектыўнай бяспекі АДКБ. "Аксіёмай з'яўляецца тэзіс пра тое, што эканоміка служыць падмуркам нашай агульнай бяспекі, — гаворыцца ў паведамленні, распаўсюджаным прэс-службай Аляксандра Лукашэнкі. — Аднак калі найбліжэйшы саюзнік Беларусі па АДКБ спрабуе, добра ўсведамляючы тое, што адбываецца, знішчыць гэтую аснову, фактычна паставіць беларусаў на калені — як у такой сітуацыі можна казаць пра ўмацаванне калектыўнай бяспекі на агульнай прасторы арганізацыі?"

Беларускі бок упэўнены, што "нельга прымаць вельмі важныя рашэнні ў межах АДКБ, ісці на пэўнае ўшчамленне сваіх нацыянальных інтарэсаў дзеля агульнай справы ў сітуацыі, калі парушаюцца асноватворныя прынцыпы пабудовы калектыўнай бяспекі. Гэта было б безадказна ў дачыненні да свайго народа і стварыла б небяспечны прэцэдэнт, які пагражае далейшаму развіццю арганізацыі і падрывае давер яе сяброў адзін да аднаго". Але нягледзячы на адсутнасць беларускай дэлегацыі, пагадненне пра стварэнне Калектыўных сіл аператыўнага рэагавання ўсё ж было падпісана. "Гэта спроба ігнараваць не толькі прынцыповую пазіцыю дзяржавы — сябра АДКБ, але і асноватворнае правіла арганізацыі — правіла кансенсусу пры прыняцці рашэнняў, якое гарантуе на практыцы няўхільны ўлік меркаванняў усіх без выключэння сябраў арганізацыі ў такой важнай справе, як бяспека", — пракаментаваў сітуацыю прэс-сакратар МЗС Беларусі Андрэй Папоў.

Не паехалі ў Маскву, затое пасля 13-гадовага перапынку правялі пасяджэнне беларуска-германскага савета эканамічнага супрацоўніцтва. "Мы даўно супрацоўнічаем з Германіяй, і ў нас добры гандаль. Нас прыцягваюць новыя тэхналогіі, якія распрацоўваюцца ў Германіі. Маючы стабільную і прадказальную эканоміку, стабільнасць у дзяржаве, Беларусь можа быць добрым партнёрам для Германіі, — зазначыў Аляксандр Лукашэнка падчас сустрэчы. — Мы заўсёды будзем вітаць германскі бізнес і забяспечым надзейнасць інвестыцый". Прэзідэнт таксама заявіў пра гатоўнасць разглядзець любую прапанову германскага боку па супрацоўніцтве. У сваю чаргу, дзяржаўны сакратар Федэральнага міністэрства эканомікі і тэхналогій ФРГ, старшыня германскай часткі беларуска-германскага савета эканамічнага супрацоўніцтва Бернд Пфафенбах адзначыў, што германскія бізнесмены гатовы не толькі гандляваць з Беларуссю, але і інвеставаць у эканоміку. І праўда, нашто нам тая Масква, калі ёсць заможная Германія і з ёй увесь Еўрасаюз?

Але хопіць пра палітэканоміку. У Беларусі пачалося цэнтралізаванае тэставанне ў межах уступнай кампаніі. Каб быць дапушчаным да ЦТ, зарэгістраваны абітурыент павінен паказаць пашпарт або даведку, якая яго замяняе. Тэставанне праводзіцца на базе 74 навучальных устаноў, у тым ліку 32 — у Мінску. Для ўдзелу ў ЦТ у гэтым годзе зарэгістраваліся больш як 175 тысяч чалавек. Сёлета ўпершыню сертыфікаты ЦТ будуць выдавацца ўсім абітурыентам са станоўчым балам, што "заклікана павялічыць іх шансы на паступленне ў вышэйшыя і сярэднія навучальныя ўстановы". Маўляў, набраў дваццаць балы са ста — і добра, ідзі вучыся далей не бясплатна, дык за грошы. Чаму б не дапамагчы радзіме ў крызіс.

Дарэчы, пра крызіс. З 1 ліпеня цэны на паслугі пральняў, хімчыстак, цырульняў і дакументальныя фотаздымкі ў Беларусі будуць фарміравацца свабодна. Такое рашэнне ўтрымліваецца ў пастанове Савета міністраў № 752 ад 8 чэрвеня 2009 года, паведамляе прэс-служба ўрада. Згодна з дакументам, гэтыя віды паслуг выключаюцца з пераліку сацыяльна значных тавараў (работ, паслуг) і лекавых сродкаў, цэны (тарыфы) на якія рэгулююцца Міністэрствам эканомікі, аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам. Дадаткова з рэгуляваных тавараў выключаюцца: малако стэрылізаванае, адтопленае, казінае, здобныя булачныя вырабы, абаранкавыя і сухарныя вырабы, пірагі, піражкі, пончыкі. Наколькі свабодна вырастуць цэны на манікюр і пончыкі, хутка даведаемся.

ФІГУРЫ ТЫДНЯ

СЯРГЕЙ СКРАБЕЦ

Фота Юрыя Дзядзінкіна

Адным кандыдатам у кандыдаты стала болей. Сяргея Скрабца, старшыню аргкамітэта па стварэнні сацыял-дэмакратычнай партыі «Свабода», яго аднадумцы абралі для ўдзелу ў выбарах адзінага кандыдата ў прэзідэнты ад праеўрапейскіх сіл, якія пройдуць на Кангрэсе за еўрапейскія каштоўнасці 21 чэрвеня ў Мінску. Акрамя таго, была прынятая Стратэгія Еўрапейскай кааліцыі. Правядзенне ўстаноўчага з'езда партыі СДП «Свабода» запланавана на верасень. Гэтай вясной былы дэпутат Палаты прадстаўнікоў Сяргей Скрабец заявіў пра свой выхад з Беларускай сацыял-дэмакратычнай Грамады, якую ўзначальвае Станіслаў Шушкевіч, і пра намер стварыць новую партыю. Падставай для такой дзейнасці з'яўляецца тое, што Скрабец і група яго прыхільнікаў не змагла знайсці агульную мову з партыйным кіраўніком, іх не задавольвала "асцярожная і пасіўная пазіцыя кіраўніцтва партыі па парламенцкіх выбарах, па будучых прэзідэнцкіх выбарах, па міжнароднай рабоце".

УЛАДЗІМІР КАНАПЛЁЎ

Фота Юрыя Дзядзінкіна

Рэзкая крытыка (што ў беларускім спорце з'ява нячастая) на адрас беларускіх гандбалістаў прагучала з боку старшыні беларускай федэрацыі гэтага віду спорту Уладзіміра Канаплёва. Паводле яго слоў, цяперашні склад мужчынскай зборнай Беларусі па гандболу не дазваляе "выходзіць спакойна ў фінал чэмпіянату свету або выконваць тыя задачы, што пастаўленыя дзяржавай нам як федэрацыі па ўдзеле ў Алімпійскіх гульнях 2012 года".

"У нас няма ігракоў, якія б з 11–12 метраў забівалі. У нас брамнікі прапускаюць мячы з 10 метраў. У нас сяміметровыя стала не забіваюцца, і на гэтым мы шмат страчваем. А чыя гэта праца? Гэта праца трэнераў, пачынаючы з юнацкай зборнай, школьнікаў і да нацыянальнай зборнай. Не забіваюць — пастаў, няхай суткамі кідаюць, каб забівалі", — цытуе прапановы Канаплёва БелаПАН. Старшыня БФГ заклікаў не адмаўляцца ад лепшага, што было ў Савецкім Саюзе, "калі мы з вамі станавіліся алімпійскімі чэмпіёнамі не за грошы, а найперш за патрыятызм да радзімы, і фізічная падрыхтоўка гандбалістаў была лепшай... Поўзаеце, як блохі, па пляцоўцы... Агульная бяда ўсіх трэнераў як мужчынскіх камандаў, так і жаночых — гэта дрэнная псіхалагічная падрыхтоўка", — заявіў кіраўнік федэрацыі. Разам з тым эксперты адзначаюць, што праблема найперш у растрачаным патэнцыяле беларускай гандбольнай школы. У 1980-я беларускі гандбол быў наймацнейшы ў свеце. Але пасля развалу Савецкага Саюзу ён пачаў дэградаваць з-за адсутнасці дзяржаўнай падтрымкі. Лепшыя ігракі з'ехалі за мяжу, маладую змену амаль не рыхтавалі. Зборная Беларусі 12 гадоў — з 1995 па 2007 год — не магла трапіць на чэмпіянаты Еўропы ці свету.

Цяпер у 5-й адборачнай групе Чэмпіянату Еўропы–2010 Беларусь пасля шасці гульняў займае трэцяе месца з 8 ачкамі і разам са славенцамі працягвае прэтэндаваць на другую пуцёўку ў фінальную частку.

МАКСІМ ДАШУК



Непаўналетні Максім Дашук, удзельнік акцыі пратэсту прадпрымальнікаў у студзені 2008 года, атрымаў адзін год і тры месяцы абмежавання волі без накіравання ў спецкамендатуру, так званай «хатняй хіміі». Новае пакаранне Максім атрымаў за парушэнне парадку адбыцця абмежавання волі. У маі мінулага года Максім Дашук і яшчэ 13 чалавек былі пакараныя за ўдзел у мітынгу прадпрымальнікаў. Сёлета міжнародная праваабарончая арганізацыя *"Amnesty International"* прызнала фігурантаў «Працэсу чатырнаццаці» вязнямі сумлення.

На мінулым тыдні быў амніставаны адзін з удзельнікаў гэтай справы — Міхаіл Пашкевіч. Таксама была зменена мера адбыцця пакарання Алесю Стральцову і Алесю Чарнышову на папраўчыя працы. Вядома, што цяпер рыхтуюцца дакументы ў суд з рэкамендацыяй амніставаць Міхаіла Суба і Паўла Вінаградава. Разам з тым пагрозу новых пакаранняў за парушэнне парадку адбыцця абмежавання волі маюць Таццяна Цішкевіч, якая з'ехала вучыцца ў Польшчу, і Арцём Дубскі.

Падрыхтавала Вольга Хвоін

ДЗЕНЬ САЛІДАРНАСЦІ

ІМІТАЦЫЯ ДЭМАКРАТЫЗАЦЫІ

Генадзь Кеснер

16 чэрвеня, у традыцыйны Дзень беларускай салідарнасці, які адзначаецца ўжо шмат гадоў менавіта шаснаццатага дня кожнага месяца, вядомыя тутэйшыя палітыкі ў прысутнасці журналістаў агучылі зварот, які непасрэдна тычыцца выканання ўладамі правоў чалавека ў нашай краіне. Паводле меркавання вядомых у Беларусі і ў свеце асобаў, сітуацыя з правамі чалавека ў нас не паляпшаецца.

Сярод тых, хто падпісаў дакумент, — экс-кандыдат у прэзідэнты, прафесар Аляксандр Казулін, першы кіраўнік незалежнай Беларусі, былы спікер Вярхоўнага Савета 12-га склікання Станіслаў Шушкевіч, а таксама экс-намеснік міністра замежных спраў, каардынатар кампаніі "Еўрапейская Беларусь" Андрэй Саннікаў, лідэр Партыі БНФ Лявон Баршчэўскі і каардынатар "Еўрапейскае кааліцыі" Мікалай Статкевіч.

"У Беларусі па-ранейшаму цалкам адсутнічае сістэма прававой абароны грамадзян ад пераследу за палітычныя, рэлігійныя і іншыя перакананні, не выконваюцца найважнейшыя абавязацельствы, узятыя на сябе ў гэтай сферы дзяржавай: у любы час асоба можа зрабіцца ахвяраю неабгрунтаваных брутальных дзеянняў з боку міліцыі і спецыяльных сіл, не мае шансаў на аб'ектыўны і справядлівы суд, магчымасцяў нармальнага працаўладкавання або вучобы на тэрыторыі краіны, калі ўлада лічыць гэту асобу сваім палітычным праціўнікам", — адзначыў, агучваючы дакумент, лідэр ПБНФ Лявон Баршчэўскі.

Па словах палітыка, афіцыйныя ўлады Беларусі хаваюць сапраўднае становішча з правамі чалавека ў краіне — перадусім у кантактах з Еўрасаюзам. Такая сітуацыя, сцвярджаюць аўтары звароту, абсалютна не нармальная: яна патрабуе неадкладных карэнных змен.

Аляксандр Казулін нагадаў, што мінула ўжо два месяцы, як былы прадпрымальнік з Ваўкавыску Мікалай Аўтуховіч трымае галадоўку пратэсту ў сталічным следчым ізалятары.

"Гэта галадоўка можа прывесці да таго, што Аўтуховіч скончыць сваё жыццё, — адзначыў былы кандыдат на прэзідэнцкую пасаду. — Але ніякіх заяў ні з боку дыпламатаў, ні з боку Еўрасаюза няма. Аднак маўчаць у гэтай сітуацыі папросту немагчыма. Тое ж самае тычыцца і новага прысуду фігуранту "Працэсу чатырнаццаці" Максіму Дашуку. Гэта сведчыць пра тое, што ўлады не зрабілі ніякіх высноў, яны працягваюць ужываць звыклыя метады свайго палітычнага кіравання краінай праз ужыванне сілы".

Аляксандр Казулін нагадаў пра тое, што ў Беларусі рыхтуецца закон, які дасць магчымасць МУС, КДБ і Камітэту дзяржаўнага кантролю праводзіць арышты грамадзян без санкцыі пракурора, што таксама ёсць істотным парушэннем правоў чалавека. "Праз гэта ўлады рыхтуюцца вырашаць эканамічныя праблемы сілавымі метадамі", — зрабіў выснову палітык.

Па словах каардынатара "Еўрапейскай кааліцыі" Мікалая Статкевіча, "зараз рэжым імкнецца імітаваць нейкую дэмакратызацыю". "Але насамрэч тыя касметычныя дзеянні, якія ён праводзіць, не кранаюць яго аснову. Улады нават не дазваляюць сабе выпусціць усіх палітвязняў, бо гэта знізіць узровень страху ў грамадстве", — падкрэсліў Мікалай Статкевіч.

Фота Юрыя Дзядзінкіна

Злева направа: Аляксандр Казулін, Станіслаў Шушкевіч, Лявон Баршчэўскі, Андрэй Саннікаў, Мікола Статкевіч.

Як мяркуе каардынатар кампаніі "Еўрапейская Беларусь" Андрэй Саннікаў, у краіне ёсць асобы, якія спрабуюць інтэрпрэтаваць узніклы цяпер расійска-беларускі канфлікт як паварот Аляксандра Лукашэнкі на Захад. "І мы ўжо бачым некаторыя каментары з Захаду, што сяброўства, супрацоўніцтва з Лукашэнкам дае нейкі плён, але ж з нядаўніх інтэрв'ю Лукашэнкі мы шмат чаго даведаліся. Напрыклад, з інтэрв'ю расійскай газеце "Завтра" стала вядома, што былі забітыя нашы сябры і калегі. У інтэрв'ю Уладлены Функ мы пачулі пра тое, што насамрэч адбываецца ў беларускіх турмах. Мы, канешне, ведалі пра гэта і раней, але да сённяшняга дня не было такіх сведчанняў з боку заходніх грамадзян. І зараз мы звяртаемся да еўрапейскай супольнасці, да журналістаў, каб акцэнтаваць увагу на праблеме правоў чалавека ў Беларусі", — заявіў Андрэй Саннікаў.

Вяртаючыся да актуальнай сітуацыі ў беларуска-расійскіх дачыненнях, старшыня Партыі БНФ Лявон Баршчэўскі агучыў свой зварот як кіраўніка палітычнай структуры, у якім назваў усё, што адбываецца ў апошнія месяцы, "пахавальным звонам" па "саюзнай дзяржаве".

"Аб'яднаная Еўропа магла б ясна заявіць пра сваю гатоўнасць інстытуцыянальна дапамагчы Беларусі — і фінансава, і допускам беларускіх тавараў на свае рынкі — пры ўмове неадкладных захадаў улады дзеля дэмакратызацыі краіны, празрыстасці прыняцця палітычных і эканамічных рашэнняў", — падкрэсліў Лявон Баршчэўскі.

ГЕАПАЛІТЫКА

"ТАННЫХ ПРАДУКТАЎ З БЕЛАРУСІ НАМ НЕ ТРЭБА"

Малочны канфлікт, што разгарэўся паміж Беларуссю і Расіяй, мала каго пакінуў абыякавым. Шмат хто з высокапастаўленых чыноўнікаў выказаўся на гэты конт, шмат хто яшчэ выкажацца. Прапануем вашай увазе некаторыя цытаты — без купюр і каментараў.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка:

— Нам гавораць: "Беларуская прадукцыя занадта танная, вы збіваеце нам кошты на ўнутраным рынку". Я спытаў Пуціна: "Вы што, перакармілі рускі народ танным беларускім малаком і мясам? Вашы людзі, якія лічаць капейкі, імкнуцца купіць нашы танныя прадукты. Рабіце свае прадукты таннымі". А нам адказваюць: "Не, танных прадуктаў з Беларусі нам не трэба. Вы сваім дэмпінгам абваліце наш рынак". Але чаму расійскія сельгаспрадукты дарагія? Ды таму, што на іх уздымаюць кошты вашы пасярэднікі, вашы сельскагаспадарчыя алігархі. Менавіта ім невыгодныя танныя беларускія прадукты. Чаму расійскія службоўцы не пазбавяцца ад пасярэднікаў паміж сялянскай гаспадаркай і крамай? Ды таму, што там у вас гуляюць вялікія грошы, і службоўцы ведаюць пах гэтых грошай. Чаму не вярнуцца да досведу Савецкага Саюза? Мы тады сваім харчаваннем падтрымлівалі Маскву і Ленінград, і ўсе заходнія вобласці Расіі. Не, не хочуць вярнуцца. Таму што няма адкатаў. У нас не можа быць адкатаў, у нас дзяржаўная форма ўласнасці. А ў вас адкаты. І кошты на прадукты заліміта вы я. І завозіце палову харчавання з-за мяжы. Чаму ж не хочаце купіць у нас якаснае і таннае? Мы праводзім у Маскве кірмашы і пад іх імкнёмся вывезці вялізную колькасць тавараў. Дзве гадзіны гандлю — і масквічы ўсё змятаюць. Таму што без пасярэднікаў, таннае і вышэйшай якасці. Такім чынам, з-за сталых перашкодаў мы знізілі таваразварот з Расіяй з 85 да 47 працэнтаў. Гэту розніцу мы перакінулі ў іншыя краіны не таму, што хацелі, а таму, што Расійская Федэрацыя выцесніла нас са свайго рынку.

Віцэ-прэм'ер Расійскай Федэрацыі Сяргей Сабянін:

— Беларускі бок залішне палітызуе гэта пытанне і робіць вельмі некарэктныя заявы.

Прэм'ер-міністр Расійскай Федэрацыі Уладзімір Пуцін:

— М-да, некарэктныя... Нядобра... Але крыўдзіцца не трэба. Крызіс... Стамляльнасць... Стрэсы... Нам самім трэба быць больш акуратнымі ў выказваннях, нават калі мы лічым, што маем рацыю. Трэба ведаць, што мы гаворым і дзе мы гаворым, і праяўляць стрыманасць. Я выхоўваўся на Ленінградскай вуліцы, і ў нас у двары ў такіх выпадках гаварылі: хто як абзываецца, той так і называецца. А ў палітыцы такі падыход не прыняты.

Пасол Расіі ў Беларусі Аляксандр Сурыкаў:

— Я спажываю малочныя прадукты, вырабленыя ў Беларусі. Дзе вы тут бачыце калізію? За першы квартал бягучага года з Беларусі ў Расію паступіла малочнай прадукцыі ў пералічэнні на малако на 37 працэнтаў больш, чым летась. Хіба гэта калізія? Гэта рэаліі. Галоўнае, безумоўна, абарона спажыўцоў, каб не атруціліся людзі, каб з імі нічога не здарылася, каб куплялі прадукцыю больш якасную. Адносіны паміж міністэрствамі сельскай гаспадаркі Расіі і Беларусі акрамя як добрымі не назавеш. Усё ідзе сваёй чаргой. Але прэсе заўсёды цікава мусіраваць гарачыя факты. Я ледзь не захлынуўся ўжо ў гэтым малацэ, па праўдзе кажучы.

Намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Беларусі Міхаіл Савельеў:

— Зараз пры рашэнні папярэдняй праблемы ўзнікае новая. Усё робіцца для таго, каб беларуская прадукцыя не пайшла на расійскі рынак. Мы не знаходзім паразумення з Расспажыўнаглядам. У першы раз мы чакалі тры дні, калі нас прыме кіраўнік Расспажыўнагляду. Зараз нас спачатку прынялі добра, мы вызначылі парадак дзеянняў для таго, каб пачаліся пастаўкі беларускай прадукцыі. Сёння дамовіліся сустрэцца і падпісаць неабходныя пратаколы. Аднак раніцай было заяўлена, што наша дэлегацыя чамусьці нелегітымная. Хоць у нас ёсць усе дакументы і паўнамоцтвы. У другой палове дня ў Расспажыўнаглядзе нам ніхто не адказваў нават на тэлефонныя званкі. Мы прыехалі сюды, нікога няма, на нашы просьбы звязацца з кіруючымі асобамі адказ быў адзін: яны не даступныя".

Міністр аграрнай палітыкі Украіны Юрый Млынар:

— Я лічу, што сёння ёсць магчымасць павелічэння экспартных паставак з украінскіх прадпрыемстваў, калі расійскі бок прадэманструе такое запатрабаванне. Гэта каля 20 прадпрыемстваў, якія маюць права на экспарт прадукцыі і праінспектаваныя расійскімі інспектарамі. Я думаю, што або пастаўкі гэтых прадпрыемстваў можна павялічыць, або можна прымаць рашэнні па тых прадпрыемствах, якія былі праінспектаваныя, але па якіх пакуль не прынята рашэнне.

Паводле "Завтра", "Российской газеты", інфармагенцтваў БЕЛТА, "РИА Новости", уласнай інфармацыі

КАНФЛІКТ

БУРА Ў ШКЛЯНЦЫ

Вольга Хвоін

Беларускія малочныя прадпрыемствы тэрмінова шукаюць новыя рынкі збыту. Расія, якую ўважалі за "надзейнага партнёра", пасля палітычных сварак перакрыла плаціну на малочнай рацэ з Беларусі, добра патрапаўшы нервы вытворцам.

З рэестру дазволенай на ўвоз прадукцыі былі выключаныя або прыпыненыя санітарна-эпідэміялагічныя заключэнні больш чым на 1,2 тысячы найменняў беларускай малочнай прадукцыі. Яшчэ 200 заявак былі "замарожаныя" на этапе афармлення. Цяпер пастаўляць у Расію сваю прадукцыю могуць толькі тры беларускія прадпрыемствы, якія афармілі дакументы згодна з усімі патрабаваннямі расійскага заканадаўства. І тое ў скарочаным варыянце — на тэрыторыю краіны-суседкі дазволена ўвозіць толькі 51 від малочнай прадукцыі.

Расія штогод імпартуе больш 7 мільёнаў тон малочнай прадукцыі. Беларусь пастаўляе 50–56 тысяч тон масла, 100–102 тысячы тон сыроў, 50 тысяч тон сухога малака і 85 тысяч тон малочных кансерваў. За першы квартал гэтага года было пастаўлена 27,7 працэнта гадавой квоты з перавышэннем плана на 10 працэнтаў.

Расспажыўнагляд папярэджваў пра магчымыя санкцыі ў дачыненні да Беларусі яшчэ ў красавіку гэтага года, а забарону на ўвоз малочнай прадукцыі з-за таго, што вытворцы і пастаўшчыкі так і не пераафармілі дакументы ў адпаведнасці з тэхнічным рэгламентам Расіі, увёў з 6 чэрвеня. Акурат пасля канфліктаў на ўзроўні кіраўнікоў дзвюх дзяржаў. Не хаваецца і той факт, што абмежаванні былі ўведзеныя з мэтай абараніць расійскіх вытворцаў малочнай прадукцыі ад дэмпінгавых беларускіх коштаў. 5 чэрвеня міністэрствы сельскіх гаспадарак дзвюх дзяржаў быццам бы дамовіліся на гэты год пра скарачэнне аб'ёмаў паставак беларускага сухога малака — са 110 да 70 тысяч тон, а таксама пра павелічэнне паставак беларускага сыра і тварагу са 100 да 132 тысяч тон. Аднак кропка ў канфлікце так і не была пастаўленая.

Тым часам беларускія малочныя прадпрыемствы пачалі актыўна шукаць іншыя рынкі збыту. Напрыклад, ААТ "Слонімскія малочныя прадукты" разглядае магчымасць паставак прадукцыі ва Украіну. "Частку сваёй сыравіны мы перапрацоўваем на давальніцкіх умовах на ваўкавыскім ААТ "Беллакт", якое мае ўсю неабходную дакументацыю для паставак прадуктаў, у прыватнасці, сухога малака на рынак Украіны, — распавёў БЕЛТА дырэктар прадпрыемства Аляксандр Буйчык. — Цяпер мы прапрацоўваем магчымасці экспарту ва Украіну". Акрамя ўкраінскага рынку, ёсць намеры пастаўляць прадукцыю і ў Казахстан. "Мы спадзяемся, што пасля адведзеных па працэдуры 30 дзён расійскія спецыялісты выдадуць нам усе неабходныя дакументы", — адзначыў Аляксандр Буйчык. За пяць месяцаў прадпрыемства адгрузіла ў Расію 1589 тон прадуктаў, што на 18 працэнтаў больш, чым за аналагічны перыяд мінулага года. У грашовым эквіваленце экспарт склаў 3 мільёна долараў.

Намеснік начальніка аддзелу продажу мінскага ААТ «Гарадскі малочны завод № 1» Аляксандр Зыкаў паведаміў, што прадпрыемства не пастаўляе прадукцыю ў Расію з мінулага тыдня. "Мяркую, пастаўкі адновяцца. Прычынаю спынення экспарту з'яўляецца той факт, што мы быццам бы раней афармлялі дакументы, рабілі аналізы прадукцыі не ў тых лабараторыях, а трэба было зусім у іншых. Аб'ём экспарту ў Расію складаў прыблізна 20 працэнтаў ад агульнай вытворчасці прадукцыі. Прастою прадпрыемства як такога няма, мы стараемся больш пастаўляць па рэгіёнах Беларусі, нешта адгружаем ва Украіну", — патлумачыў спецыяліст.

Намесніца дырэктара па збыту ААТ «Савушкін прадукт» Алена Бабкіна на тэлефонны званок з "НЧ" адрэагавала вельмі нервова. Спадарыня Бабкіна толькі сказала, што пастаўкі спыніліся з мінулага тыдня, а расійскі экспарт займаў "дастатковы працэнт" у аб'ёме вытворчасці. Пасля супрацоўніца буйнога прадпрыемства па перапрацоўцы малака кінула слухаў.

На мінскім ААТ "Гарадскі малочны завод № 2" суразмоўца — намеснік дырэктара па збыту Віктар Мяшчанінаў — быў больш гаваркі. Спецыяліст падзяліўся, што пакуль кіраўніцтва прадпрыемства не можа зразумець, якія захады яму рабіць. "Мы яшчэ не ведаем, што рабіць. Калі яны хочуць новую сертыфікацыю прадукцыі, мы адразу ж адвязем узоры ў тыя лабараторыі, якія нам назавуць. Аднак сітуацыя няпэўная. Вы ведаеце, што перамовы пакуль нічым не скончыліся. Ёсць абмежаванні на пастаўкі сухога малака, але мы ім не гандлюем, — расказаў намеснік дырэктара. — Ёсць намеры разгледзець у якасці спажыўцоў іншыя краіны. Мы абралі Расію, думалі, што яна надзейны партнёр..." Прадпрыемства пастаўляла на расійскі рынак прыкладна траціну сваёй прадукцыі. Віктар Мяшчанінаў зазначыў, што прадукцыя пастаўлялася ў Расію па коштах з прыблізна 10-працэнтнай рэнтабельнасцю.

P.S. Праблема з пастаўкамі малочнай прадукцыі ў Расію вырашыліся гэтак жа імкліва, як і ўзнікла. 17 чэрвеня кіраўнікі міністэрстваў сельскай гаспадаркі і харчавання і аховы здароўя Беларусі Сямён Шапіра і Васіль Жарко з кіраўніком Расспажыўнагляду Генадзем Анішчанкам прыйшлі да сумеснага пагаднення. Пакуль на беларускую малочную прадукцыю не будуць афармленыя новыя дакументы ў адпаведнасці з расійскім тэхнічным рэгламентам, яна будзе пастаўляцца ў Расію па раней выдадзеных. Аб'ёмы паставак не будуць скарочаныя, а толькі адкарэктаваная іх наменклатура.

Эканаміст Леанід Злотнікаў лічыць, што гэта не апошні канфлікт паміж дзяржавамі на эканамічнай глебе. "У асноўным гэтыя канфлікты паўстаюць з-за таго, што моцна адрозніваюцца эканамічныя мадэлі. У рынкавай эканоміцы паняцце справядлівай канкурэнцыі — не пусты гук, а пытанне жыцця і смерці прадпрыемства. У нас многія прадпрыемствы субсідзіруюцца. Доля дзяржпадтрымкі ў нас складае прыблізна 20 працэнтаў, у іх — каля трох. Праблему першапачаткова лабіравалі расійскія вытворцы. Магчыма, выкарыстоўваліся не зусім прадуманыя хады, кшталту прэтэнзій да тэхнічных стандартаў. Але ім неабходна было абараніць сябе. Праўда, узгадніць узровень падтрымкі прадпрыемстваў розных дзяржаў не так проста, таму гандлёвыя войны паміж Беларуссю і Расіяй на гэтым не скончыліся. Істотныя разыходжанні па дэмпінгу так хутка не вырашаюцца", — падкрэслівае Злотнікаў.

ГЕАПАЛІТЫКА

МАЛОЧНЫЯ РЭКІ Ў СІЛАВЫХ БЕРАГАХ

Вольга Хвоін

Беларусь увяла ўзмоцнены рэжым кантролю за перамяшчэннем грузаў на асноўных расійска-беларускіх магістралях. З малочна-тварожнага канфлікт паміж Беларуссю і Расіяй разліўся ў сферу геапалітычных інтарэсаў. Але, хутчэй, з яе і пачаўся.

У чарадзе ўзаемных шпілек паміж дзвюма дзяржавамі выплылі факты, якія да гэтага чамусьці старанна замоўчваліся. Відаць, так было выгодна абодвум бакам. Напрыклад, увядзенне пунктаў кантролю на мяжы з Расіяй абгрунтавалі плынямі кантрабандных тавараў. "За 15 дзён чэрвеня 2009 года мытнымі органамі ў звычайным рэжыме працы затрымана кантрабандных тавараў на суму 8 мільярдаў 620 мільёнаў беларускіх рублёў. За 2008 год на калінінградскім кірунку знікла грузаў на 10 мільёнаў долараў", — паведаміў старшыня Дзяржаўнага мытнага камітэта Беларусі Аляксандр Шпілеўскі.

Дзяржаўны сакратар Савета бяспекі Беларусі Юры Жадобін заявіў, што прынятыя меры — усяго толькі сіметрычны адказ на дзеянні Расіі. "Беларусь вымушаная ўвесці ў бліжэйшы час узмоцнены кантроль за перамяшчэннем тавараў на асноўных аўтамабільных магістралях, якія злучаюць нашы краіны. Гэтыя крокі будуць цалкам аналагічныя тым дзеянням, якія ўжо на працягу многіх гадоў практыкуе расійскі бок у асобе органаў Федэральнай мытнай службы", — зазначыў сакратар Саўбеза. Распараджэнне пра ўзмацненне мытнага кантролю даваў асабіста кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка. Сумнеўна, што дагэтуль пра мытныя махінацыі ніхто не ведаў. Чакалі патрэбнага моманту. Але ўзнікаюць лагічныя пытанні: хто адкажа за кантрабанду і чаму вінаватыя не былі дагэтуль пакараныя?

Адкрытае ігнараванне Беларуссю саміту Арганізацыі Дамовы аб калектыўнай бяспецы, які праходзіў 14 чэрвеня ў Маскве, не прымусіла расійскі бок пайсці на саступкі. Самі правялі без Беларусі, падпісалі пакет дакументаў, у тым ліку Дамову аб стварэнні Калектыўных сіл аператыўнага рэагавання. МЗС Беларусі абвясціў, што гэтыя дакументы

"па сваёй юрыдычнай прыродзе з'яўляюцца дакументамі групы дзяржаў і не маюць статусу і сілы рашэнняў Арганізацыі Дамовы аб калектыўнай бяспецы", аднак меркаванне беларускага знешнепалітычнага ведамства ў Беларусі мала каго зацікавіла.

Галоўны і самы каштоўны рэсурс Беларусі — яе тэрыторыя і інфраструктура — задзейнічалі ў міждзяржаўных спрэчках як найбольш важкі аргумент. Але ў Расіі супраць лому свае прыёмы. Не паспелі на мяжы арганізаваць пункты кантролю, як ААТ "Газпрам" запатрабаваў ад ААТ "Белтрансгаз" пагасіць запазычанасць у суме больш за 230 мільёнаў долараў за пастаўлены ў студзені — красавіку газ, без уліку пені і штрафаў за нявыбарку газу ў прадугледжаным аб'ёме. Між іншым, афіцыйныя асобы дагэтуль заяўлялі, што Беларусь не мае запазычанасцяў па аплаце за расійскі газ. Хлусілі? Паводле кантракту, Беларусь павінна была плаціць па 210 долараў за тысячу кубаметраў, аднак фактычна плаціла толькі па 150 долараў. Такая сістэма аплаты грунтавалася на вуснай дамове прэзідэнтаў дзвюх дзяржаў, ніякіх дакументаў падпісана не было. Відавочна, гэтую розніцу і прад'явіў "Газпрам".

Эксперт Станіслаў Гусак на канфлікт паміж "будаўнікамі" Саюзнай дзяржавы глядзіць з іроніяй. "Усе гэта — спектакль для народа на тэму таго, што Лукашэнка — вялікі барацьбіт за незалежнасць. Не выключаю, што малочная вайна хутка скончыцца, і ўсё стане на свае месцы, гэта не варта было і выедзенага яйка. Думаю, скандал гэты штучны і зроблены па просьбе беларускага боку. Праблемы, што стаяць за Саюзам, на некалькі парадкаў вышэйшыя за тыя, што зараз маем з малаком і смятанай. Зброя, ахова кардонаў, геапалітычныя і ваенныя пытанні — вось што насамрэч хвалюе кіраўнікоў дзяржаў. Калі Беларусь перастане быць санітарным кардонам ад Захаду, чым Расія прыкрые Маскву?"

ПРАВААБАРОНЦЫ

ЯК КОСТКА Ў ГОРЛЕ

Любоў Праневіч

Другі раз у гэтым годзе і пяты раз з 2004-га брэсцкім грамадскім актывістам адмаўляюць у рэгістрацыі праваабарончага грамадскага аб'яднання "Брэсцкая вясна". Паслядоўнае адстойванне гарантаваных Канстытуцыяй і законамі Рэспублікі Беларусь грамадзянскіх правоў сталася справай запатрабаванай, але непажаданай у беларускім грамадстве.

Праваабарончая дзейнасць у Брэсцкім рэгіёне бярэ пачатак з 1996 года, з часоў стварэння Брэсцкай абласной філіі рэспубліканскага грамадскага аб'яднання Праваабарончы цэнтр "Вясна". Напачатку прыярытэтам у дзейнасці арганізацыі была дапамога ахвярам палітычных рэпрэсій. Праз некаторы час праваабаронцы сталі аказваць дапамогу ўсім грамадзянам без абмежаванняў. "Для таго, каб павялічыць эфектыўнасць нашай працы, мы актыўна ўдзельнічалі ў выбарах, выступалі ў розных якасцях: кандыдатаў і назіральнікаў, сябраў ініцыятыўных груп, былі даверанымі асобамі кандыдатаў. Працавалі па ўсёй вобласці. Поспехам можна назваць перамогу на выбарах праваабаронцы Уладзіміра Малея, абранага дэпутатам Маларыцкага раённага савета", — расказвае праваабаронца Уладзімір Вялічкін.

Дзейнасць па абароне правоў грамадзян спрыяла пазітыўнаму іміджу сябраў арганізацыі. Вялічкін узгадвае смешны выпадак, калі на творчую вечарыну ў Брэст запрасілі вядомага беларускага барда Зміцера Бартосіка. Па дарозе ён згубіў адрас офісу арганізацыі, але памятаў, што памяшканне знаходзіцца недалёка ад гатэля "Беларусь". У Брэсце ён падышоў да гатэлю "Беларусь" і запытаўся ў першага ж мінака: "Дзе тут апазіцыя?" Яму адразу паказалі на вакно будынку недалёка ад гатэлю, дзе ў той час знаходзіўся офіс Брэсцкай філіі РГА ПЦ "Вясна".

У практыцы праваабаронцаў уздымаюцца розныя пытанні — ад палітычнай і рэлігійнай дыскрымінацыі і моўных пытанняў да правоў на маёмасць і вяртання права на мацярынства. Аднойчы жанчына, якая адбыла пакаранне ў Гомельскай калоніі, звярнулася з просьбай дапамагчы адстаяць права на мацярынства. Адрас праваабаронцаў ёй далі ў калоніі, калі яна вызвалялася. Пры сумеснай працы са старшынёй гарсавета і службай сацыяльнай дапамогі праваабаронцы дапамаглі жанчыне даказаць яе права на мацярынства. Ёй вярнулі дваіх дзяцей, дапамаглі працаўладкавацца, а праз некаторы час яна выйшла замуж і стварыла паўнавартасную сям'ю. Адметная таксама справа, якой займаўся праваабаронца Рыгор Варвашэвіч: у 2000 годзе ён дабіўся, каб усім жыхарам горада быў зроблены перараслік за гарачую ваду.

Сёння арганізацыйны камітэт па стварэнню ПГА "Брэсцкая вясна" аб'ядноўвае вядомых у вобласці грамадскіх актывістаў, сярод якіх Уладзімір Вялічкін, Уладзімір Малей, Сяргей Вакуленка, Юрась Жыдовіч і іншыя грамадзяне, якія больш за дзесяць гадоў аказваюць юрыдычную дапамогу землякам. За сваю дзейнасць праваабаронцы неаднаразова цярпелі ціск з боку уладаў. Людзей, якія звяртаюцца па дапамогу многа, таму ў 2004 годзе, праз месяц пасля ліквідацыі Брэсцкай абласной філіі РГА ПА "Вясна", пачаліся першыя спробы зарэгістраваць праваабарончую арганізацыю ў Брэсцкім рэгіёне. Тады ў рэгістрацыі было адмоўлена тры разы. Сёння гісторыя паўтараецца.

15 студзеня 2009 года адбыўся ўстаноўчы сход па стварэнні грамадскага праваабарончага аб'яднання "Брэсцкая вясна". Арганізацыя была прадстаўлена ў 9 адміністрацыйных раёнах вобласці з 16-ці. Кіраўніком аб'яднання быў абраны праваабаронца Уладзімір Вялічкін, ягоным намеснікам стаў Уладзімір Малей. У лютым прыйшоў адказ аб адмове ў рэгістрацыі грамадскай арганізацыі — у пакеце дакументаў не было квітанцыі аплаты за размяшчэнне ў газеце абвесткі пра рэгістрацыю арганізацыі.

У сувязі з адмовай актывісты вымушаныя былі паўторна склікаць ўстаноўчы сход, сабраць сябраў з рэгіёнаў, зацвердзіць статут аб'яднання, абраць кіраўнікоў, заплаціць дзяржаўны падатак, падаць абвестку ў газету аб рэгістрацыі арганізацыі і зноў падаць дакументы на рэгістрацыю. У адказ спецыялісты Брэсцкага аблвыканкама вызначылі адтэрміноўку ў рэгістрацыі аб'яднання — пры разглядзе дакументаў высветлілася, што статут арганізацыі быццам бы не адпавядае Артыкулу 11 Закона Рэспублікі Беларусь "Аб грамадскіх аб'яднаннях". Чарговы адмоўны адказ з аблвыканкама прыйшоў 4 чэрвеня, у гэты раз уласнік будынку адклікаў свой гарантыйны ліст аб выдзяленні памяшкання для юрыдычнага адрасу праваабарончай арганізацыі.

У выніку адмоваў у рэгістрацыі ГПА "Брэсцкая вясна" праваабарончая дзейнасць не можа выконвацца паўнавартасна, жыхары Брэста і вобласці па фармальных падставах пазбаўленыя магчымасці атрымаць пэўную юрыдычную дапамогу і значную інфармацыйную падтрымку ў галіне правоў чалавека. Сітуацыя сведчыць пра тое, што легалізацыя дзейнасці спецыялістаў па абароне правоў чалавека можа высветліць хібы ў працы дзяржаўных і сацыяльных структур у рэгіёне. Таму выкарыстоўваюцца ўсе сродкі, каб не дапусціць праваабаронцаў да легальнай дзейнасці ад імя грамадскай арганізацыі.

КАЛОНКА ЮРЫСТА

ПРА МАЛАКО, ГРОШЫ І ДТЗ

Мы працягваем публікацыю адказаў вядомага юрыста і праваабаронца Алега Волчака на пытанні людзей, якія звярнуліся ў грамадскую прыёмную.

- *У 2005 годзе, калі я працаваў на дзяржаўным прадпрыемстве, па вытворчых справах я выязджаў у службовую камандзіроўку ў Маскву. Цяпер міліцыя прапануе мне прызнаць факт прысваення дзяржаўных грашовых сродкаў шляхам складання фіктыўных камандзіровачных дакументаў і кампенсаваць нанесеную шкоду. У выпадку адмовы ў дачыненні да мяне будзе распачата крымінальная справа.*

Самахвал Л. П., Мінск

Органы ўнутраных спраў у сваёй дзейнасці кіруюцца Канстытуцыяй РБ, Законам аб міліцыі, Крымінальным кодэксам, Крымінальна-працэсуальным кодэксам і іншымі законамі, у адпаведнасці з якімі дзяржава і надзяліла гэтыя органы правам расследавання здзейсненых злачынстваў і прыняцця мер па іх прадухіленні і кампенсацыі нанесенай шкоды. Аднак у дзяржаве ні аднаму з праваахоўных органаў не дазволена схіляць грамадзяніна да прызнання ўчынкаў, якіх ён не здзяйсняў, і гэта замацавана ў артыкуле 27 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь: "Ніхто не павінен прымушацца да дачы паказанняў і тлумачэнняў супраць самога сябе, сваіх сямейнікаў, блізкіх сваякоў. Доказы, атрыманыя з парушэннем закона, не маюць юрыдычнай сілы". Вы можаце звярнуцца да пракурора раёна і паскардзіцца на незаконныя дзеянні супрацоўнікаў міліцыі. Пракуратура праверыць гэты факт. У выпадку яго пацвярджэння, будуць прынятыя меры пракурорскага рэагавання ў дачыненні да пэўных супрацоўнікаў міліцыі.

- *Калі я знаходзіўся ў службовай камандзіроўцы ў Оршы, здзейсніў дарожна-транспартнае здарэнне, па якому быў прызнаны вінаватым. Раней я ўжо прыцягваўся да адміністрацыйнай адказнасці за аналагічнае правапарушэнне. З якога моманту я буду лічыцца асобай, якая не прыцягвалася да адміністрацыйнай адказнасці?*

Дзярноў Е. І., Віцебская вобласць

У адпаведнасці з артыкулам 2.8 Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях, фізічная або юрыдычная асоба лічыцца той, што не мела адміністрацыйнага спагнання, калі на працягу года з дня заканчэння выканання адміністрацыйнага спагнання не здзейсніць новага адміністрацыйнага правапарушэння. Гэта акалічнасць улічваецца таксама і пры накладанні адміністрацыйнага спагнання.

- *Мая дачка была ўдзельніцай дарожна-транспартнага здарэння, у выніку чаго ёй нанесены цялесныя пашкоджанні. На падставе медыцынскага заключэння пракуратура Віцебска адмовіла ў распачынанні крымінальнага справы. З высновамі экспертызы я не згодная, як і з рашэннем пракуратуры. Якім чынам я магу абскардзіць дзеянні пракуратуры і эксперта?*

Лоская Е. Н., Віцебск

Вам неабходна даслаць скаргу ў Пракуратуру Віцебскай вобласці, абгрунтаваць там усе вашы аргументы наконт нязгоды з атрыманым рашэннем пракуратуры. У скарзе трэба прасіць, каб пастанова была адменена і справа накіравана на новы разгляд. Таксама вы маеце права патрабаваць прызначэння дадатковай судова-медыцынскай экспертызы ў дачыненні да вашай дачкі.

- *Які парадак унясення змянення месца знаходжання юрыдычнага адрасу ў Статут прадпрыемства?*

Шастакоў В. Ф., Наваполацк

Гэта працэдура праводзіцца заяўным чынам — падачай пісьмовага паведамлення ў орган, які рэгіструе, па месцы рэгістрацыі вашага прадпрыемства.

- *Я атрымала адпускныя, але ў адпачынак я не пайшла, бо ў апошні дзень працы на прадпрыемстве атрымала траўму і была шпіталізаваная. У бухгалтэрыі пры налічэнні зарплаты заявілі, што будуць утрымліваць з мяне адпускныя. Ці законныя іх дзеянні?*

Баркоўская Н. П., Магілёў

Не, прадпрыемства не мае такога права. У адпаведнасці з артыкулам 107 Працоўнага кодэкса РБ, заработная плата, залішне выплачаная працаўніку наймальнікам, у тым ліку пры няправільным стасаванні закона, не можа быць з яго спагнаная, за выключэннем выпадкаў рахунковай памылкі.

- *На прадпрыемстве, дзе я працую зваршчыкам, дырэктар адмяніў сваім загадам выдачу малака, матывуючы гэта адсутнасцю грашовых сродкаў. Ці мае ён права выдаваць такі загад?*

Сахарукаў А. Н., Брэсцкая вобласць

Дырэктар мае права выдаваць на прадпрыемстве загады, распараджэнні, аднак у сваёй дзейнасці ён павінен кіравацца нарматыўна-прававымі актамі. Адмена выдачы малака працаўніку, дзейнасць якога звязана з шкоднымі ўмовамі працы, на падставе адсутнасці грашовых сродкаў, незаконная.

Паводле пункта 7 артыкула 55 Працоўнага кодэкса РБ, наймальнік абавязаны пры арганізацыі працы рабочых своечасова прадстаўляць гарантыі і кампенсацыі ў сувязі са шкоднымі ўмовамі працы, у выпадку адмовы ад гэтага наймальнік можа быць прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці згодна з артыкулам 9.17 Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях.

ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

22 ЧЭРВЕНЯ, ПАНЯДЗЕЛАК

1

06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55 Навіны.
06.05, 07.05, 08.10 "Добрай раніцы, Беларусь!"
06.45, 07.45 Зона Х.
07.30, 08.25, 11.50 Дзелавое жыццё.
08.20 Гатуем разам.
08.30 У свеце матораў.
09.05, 15.25 "Беларусь. Гісторыя Перамогі".
09.15 Nota Bene.
09.40 "Здароўе".
10.10 Жаночае ток-шоў "Жыццё як жыццё".
11.05 Серыял "Два бакі адной Ганны".
12.10 Кінааповесць "Цераз могілкі".
13.35 Відэафільм АТН "Зброя Перамогі. Віцебшчына".
14.05 Хранікальна-дакументальны цыкл "Нябачны фронт" (Беларусь).
15.15, 19.20 Навіны рэгіёна.
15.30 Культурныя людзі.
16.05 Серыял "Двое з куфара" (Расія).
16.50 Меладрама "Тэрыторыя прыгажосці".
17.50 Серыял "Два бакі адной Ганны" (Украіна).
18.50, 00.55 "Зона Х". Крымінальная хроніка.
19.35 "Арэна". Праграма аб спорце.
19.55 Ток-шоў "Ход у адказ".
21.00 Панарама.
21.40 Футбол. Чэмпіянат Еўропы. U-21. Германія-Англія. Прамая трансляцыя.
23.40 Камедыйны серыял "Офіс" (ЗША).
01.00 Дзень спорту.

Н

06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00 Нашы навіны.
06.05 АНТ прадстаўляе: "Наша раніца".
09.05 Контуры.
10.10 Фільм "Не было смутку".
11.00 Нашы навіны.
11.05 Навіны спорту.
11.10 "Не было смутку". Працяг.
11.30 "Кантрольны закуп".
12.00 "Малахаў+".
13.00 Нашы навіны.
13.05 Навіны спорту.
13.10 "Зразумець. Прабачыць".
13.45 "Модны прысуд".
14.45 "Хачу ведаць".
15.10 АНТ прадстаўляе: "Рэкламная паўза".
16.00 Нашы навіны.
16.10 Навіны спорту.
16.15 "Прынцэса цырку". Шматсерыйны фільм.
18.00 Нашы навіны.
18.15 Навіны спорту.
18.20 Серыял «Гуманоіды ў Каралёве».
19.05 Чакай мяне.
20.00 Час.
20.30 Нашы навіны.
21.00 Навіны спорту.
21.05 Ток-шоў "Выбар".
22.05 "Смерць шпіёнам. Крым". Серыял.
23.10 Нашы навіны.
23.25 Навіны спорту.
23.30 "Зваротны адлік".
00.00 "Шпіталь каралеўства". Серыял.
00.45 Нашы навіны.
01.00-01.10 Навіны спорту.

СТВ

06.00 "24 гадзіны".
06.10 "Міншчына".
06.20 "Раніца. Студыя добрага настрою".
07.30 "24 гадзіны".
07.40 "Раніца. Студыя добрага настрою".
08.30 "Тыдзень". Інфармацыйна-аналітычная праграма.
09.30 "Вялікі сняданак".
10.00 "Пяць гісторый".
10.30 "24 гадзіны".
11.00 "Танга ўтрох". Тэленавэла.
11.50 "Сіла прыцягнення". Серыял.
12.40 "Званая вячэра".
13.30 "24 гадзіны".
13.50 Канцэрт "Песні роднай зямлі".
16.00 "Культурнае жыццё".
16.30 "24 гадзіны".
16.50 "Спартыўны тыдзень".
17.10 "Наша справа".
17.20 "Міншчына".
17.30 "Званая вячэра".
18.30 "Сіла прыцягнення". Серыял.
19.30 "24 гадзіны".
20.00 "Сталічныя падрабязнасці".
20.10 "СТБ-спорт".
20.15 "Добры вечар, маляня".
20.35 Фільм "Птушка шчасця". Расія, 2007 г.
22.30 "24 гадзіны".
22.55 "СТБ-спорт".
23.00 "Сталічны футбол".
23.30 "Інструктар". Серыял.
00.25 "Гучная справа".

ТВ3

06.55 ЛАДная раніца.
07.55 Смачна з Барысам Бурдой.
08.25 Тэлебарометр.
08.40 Усё аб бяспецы.
09.10 У гэты дзень.
09.15 Гадзіна суду. Справы сямейныя.
10.05 Серыял "Спадчынніца" (Мексіка).
10.50 Кінараман "Сыны ідуць у бой".
12.30 Гаспадар.
12.55 Бухта капітанаў.
13.35 Мультсерыял "Русалачка" (ЗША).
14.20 Пазакласная гадзіна.
14.35 Таемны густ.
15.05 Экспедыцыя.
15.35 Гадзіна суду з Паўлам Астахавым.
16.25 Смачна з Барысам Бурдой.
16.55 Медычныя таямніцы.
17.35 Серыял "Спадчынніца" (Мексіка).
18.35 Навіны культуры.
18.50 Серыял "Згон" (Расія). Заключная серыя.
19.45 Беларуская часіна.
20.40 Калыханка.
21.00 Экспедыцыя.
21.05 "І зноў рану сэрца кранаючы..." Маналогі аб вайне.
21.15 Дакументальны фільм "1100 дзён".
21.50 Драма "Знак бяды". 1-я і 2-я серыі.

РОССИЯ

07.00 Добрай раніцы, Расія!
09.00 Фільм "Наша дача".
10.30 "Ранішняя пошта".
11.00 Весткі.
11.30 "Брэсцкая крэпасць". Д/ф.
12.25 "Трымай мяне мацней". Тэлесерыял.
13.15 "Кулагін і партнёры".
13.50 Навіны - Беларусь.
14.00 Весткі.
14.20 Пакой смеху.
15.35 Фільм «Варыянт «Амега». 1-я серыя.
16.50 Навіны - Беларусь.
17.00 Весткі.
17.25 "Сумленны дэтэктыў".
17.55 "Трымай мяне мацней". Тэлесерыял.
18.50 Навіны - Беларусь.
19.00 Весткі.
19.30 Тэлесерыял «Кармеліта".
21.20 Т/с «Тэрмінова ў нумар-2». Закл. серыя.
22.20 Тэлесерыял «Трое супраць усіх-2».
23.20 "Нічога асабістага". Інфармацыйна-сатырычная праграма.
23.35 Навіны - Беларусь.
23.45 "Весткі+".
00.05 "Кулагін і партнёры".
00.35 Заканчэнне эфіру.

НТВ

06.00 Сёння.
06.05 Інфармацыйны канал "Сёння раніцай".
08.55 Сёння. Выніковая праграма.
10.00 Сёння.
10.25 "Кулінарны паядынак".
11.15 "Кватэрнае пытанне".
12.15 "Следства вялі...".
13.00 Сёння.
13.35 Дэтэктыўны серыял "Вяртанне Мухтара-2".
15.10 Серыял "Аэрапорт".
16.00 Сёння.
16.30 Серыял "Вуліцы пабітых ліхтароў".
18.15 "Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне".
18.35 "Агляд. Надзвычайнае здарэнне".
19.00 Сёння.
19.35 Прэм'ера. Вострасюжэтны серыял "Горад спакус".
21.35 "Сумленны панядзелак".
22.35 "Агляд. Надзвычайнае здарэнне".
23.00 Сёння.
23.25 Вострасюжэтны серыял "Псеўданім "Албанец-2".
00.20 Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял "Эксперты".
01.10 "Школа зласлоўя".

EUROSPORT

09.30 Мотаспартыўны часопіс.
10.00 Супербайк. Чэмпіянат свету. Мізана (Сан-Марына). Заезд 2.
11.00 Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе Турынг. Брно (Чэхія). Гонка 2.
12.00 Тэніс. Турнір WTA. Істборн (Англія/Вялікабрытанія). Фінал.
13.00 Тэніс. Турнір АТР. Істборн (Англія/Вялікабрытанія). Фінал.
14.00 Веславанне. Кубак свету . Мюнхен (Германія).
16.00 Лёгкая атлетыка. Камандны чэмпіянат Еўропы. Партугалія. Дзень 2.
19.00 Снукер. Сусветная серыя. Ірландыя. Дзень 2.
20.15 Самыя моцныя людзі планеты. Ліга чэмпіёнаў. Сербія.
21.20 Вось дык так!!!
21.30 Армрэстлінг. PAL/NAL.
22.00 Пра рэстлінг. Агляд WWE (World Wrestling Entertainment).
22.30 Пра рэстлінг. Vintage Collection. ЗША.
23.30 Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб. Total Knock Out.
00.30 Лёгкая атлетыка. Камандны чэмпіянат Еўропы. Партугалія. Дзень 2.

БЕЛСАТ TV BELSAT

18.00 Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
18.05 «Элі Макбіл», тэлесерыял.
18.50 «Васіль Быкаў. Апошнія дні», дак. фільм.
19.20 Госць «Белсату».
19.35 «Васіль Быкаў. Апошнія дні», дак. фільм.
20.00 Невядомая Беларусь: «Распавяду вам пра сябе», дак. фільм, 2009 г., Беларусь.
21.00 Аб'ектыў (навіны).
21.20 «Гісторыя пад знакам Пагоні»: «Багі».
21.30 «Застава», маст. фільм, 2006 г., Вялікабрытанія–Сербія і Чарнагорыя–Боснія і Герцагавіна–Македонія–Славенія–Харватыя.
23.05 Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
23.20 «Еўрапейскі Саюз без сакрэтаў», 1 серыя: «Валютная палітыка».
23.40 Аб'ектыў.

23 ЧЭРВЕНЯ, АЎТОРАК

1

05.35 Серыял "Як сказаў Джым" (ЗША).
06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55 Навіны.
06.05 Дзень спорту.
06.10, 07.05, 08.10 "Добрай раніцы, Беларусь!".
06.45, 07.45 Зона Х.
07.30, 08.30, 11.50 Дзелавое жыццё.
08.20 Гатуем разам.
08.35 "Арэна". Праграма аб спорце.
09.10, 12.55 "Беларусь. Гісторыя Перамогі".
09.15 Дакументальны цыкл "Мая праўда".
10.00 Меладрама "Тэрыторыя прыгажосці".
10.50 Серыял "Два бакі адной Ганны".
11.40 Відэафільм АТН "Берасцейскі арыенцір-да зорак" цыклу "Зямля беларуская".
12.10 Дакументальны фільм "Пінская флатылія".
13.05 Камедыйны дэтэктыўны серыял "Монк".
14.05 Ток-шоў "Ход у адказ".
15.15, 19.20 Навіны рэгіёна.
15.25 Мастацка-публіцыстычны цыкл "Аперацыя "Баграціён". Хроніка Перамогі". Фільм 1-ы.
16.05 Вострасюжэтны серыял "Двое з куфара".
16.55 Меладрама "Тэрыторыя прыгажосці".
17.50 Серыял "Два бакі адной Ганны" (Украіна).
18.50, 00.55 "Зона Х". Крымінальная хроніка.
19.30 Сфера інтарэсаў.
19.55 Прыгодніцкі баявік "Танкер "Танга".
21.00 Панарама.
21.40 Футбол. Чэмпіянат Еўропы. U-21. Беларусь-Італія. Прамая трансляцыя.
23.40 Камедыйны серыял "Офіс" (ЗША).
01.00 Дзень спорту.

Н

06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00 Нашы навіны.
06.05 АНТ прадстаўляе: "Наша раніца".
09.05 Чакай мяне.
10.00 "Смерць шпіёнам. Крым". Серыял.
11.00 Нашы навіны.
11.05 Навіны спорту.
11.10 АНТ прадстаўляе: "Адзін супраць усіх".
12.00 "Малахаў+".
13.00 Нашы навіны.
13.05 Навіны спорту.
13.10 "Зразумець. Прабачыць".
13.45 "Модны прысуд".
14.45 "Хачу ведаць".
15.10 "Гарачы лёд". Шматсерыйны фільм.
16.00 Нашы навіны.
16.10 Навіны спорту.
16.15 "Прынцэса цырку". Шматсерыйны фільм.
17.10 "Хай кажуць".
18.00 Нашы навіны.
18.15 Навіны спорту.
18.20 Серыял «Гуманоіды ў Каралёве».
18.55 "Рудая". Шматсерыйны фільм.
20.00 Час.
20.30 Нашы навіны.
21.00 Навіны спорту.
21.05 "Музычныя вечары ў Мірскім замку". Канцэрт класічнай музыкі "Опера Мадэрн".
22.40 "Смерць шпіёнам. Крым". Серыял.
23.45 Нашы навіны.
00.00 Навіны спорту.
00.05 "Наша Russia".
00.30 "Шпіталь каралеўства". Серыял.
01.15 Нашы навіны.
01.30-01.40 Навіны спорту.

СТВ

06.00 "24 гадзіны".
06.10 "Міншчына".
06.20 "Раніца. Студыя добрага настрою".
07.30 "24 гадзіны".
07.40 "Раніца. Студыя добрага настрою".
08.30 Фільм "Птушка шчасця". Расія, 2007 г.
10.00 Пяць гісторый.
10.30 "24 гадзіны".
11.00 "Танга ўтрох". Тэленавэла.
11.50 "Сіла прыцягнення". Серыял.
12.40 "Званая вячэра".
13.30 "24 гадзіны".
13.50 "Новыя падарожжы дылетанта".
14.20 "Далёкія сваякі".
14.40 "Гадкае качаня". Моладзевы серыял.
15.30 "Інструктар". Серыял.
16.30 "24 гадзіны".
16.50 "Сталічны футбол".
17.20 "Міншчына".
17.30 "Званая вячэра".
18.30 "Сіла прыцягнення". Серыял.
19.30 "24 гадзіны".
20.00 "Сталічныя падрабязнасці".
20.10 "СТБ-спорт".
20.15 "Добры вечар, маляня".
20.30 "Зграя". Серыял.
21.40 "Аўтапанарама".
22.00 "Вайна. Вядомая і невядомая".
22.30 "24 гадзіны".
22.55 "СТБ-спорт".
23.00 "Інструктар". Серыял.
23.55 "Надзвычайныя гісторыі".

ТВ3

06.55 ЛАДная раніца.
07.55 Смачна з Барысам Бурдой.
08.25 Серыял "Згон" (Расія). Заключная серыя.
09.15 У гэты дзень.
09.20 Гадзіна суду. Справы сямейныя.
10.10 Серыял "Спадчынніца" (Мексіка).
10.55 "І зноў рану сэрца кранаючы..." Маналогі аб вайне.
11.10 Дэтэктыўны серыял "Двайняты" (Расія).
12.05 Дэтэктыўны серыял "Вераніка Марс".
13.30 Мультфільм.
13.45 Мультсерыял "Русалачка" (ЗША).
14.30 Пазакласная гадзіна.
14.40 Бітва экстрасэнсаў.
15.35 Гадзіна суду з Паўлам Астахавым.
16.30 Смачна з Барысам Бурдой.
16.55 Медычныя таямніцы.
17.35 Серыял "Спадчынніца" (Мексіка).
18.35 Навіны культуры.
18.50 Серыял "Вяртанне Турэцкага".
19.45 Беларуская часіна.
20.40 Калыханка.
21.00 Экспедыцыя.
21.05 "І зноў рану сэрца кранаючы..." Маналогі аб вайне.
21.15 Спорт-кадр.
21.45 Гістарычны баявік "Апакаліпсіс" (ЗША).

РОССИЯ

07.00 Добрай раніцы, Расія!
09.20 Тэлесерыял «Кармеліта".
11.00 Весткі.
11.20 "Нічога асабістага". Інфармацыйна-сатырычная праграма.
11.35 Тэлесерыял "Тэрмінова ў нумар-2". Заключная серыя.
12.25 "Трымай мяне мацней". Тэлесерыял.
13.15 "Кулагін і партнёры".
13.50 Навіны - Беларусь.
14.00 Весткі.
14.20 "Апраўданне Гогаля". Дакументальны серыял. Фільм 1.
14.50 Тэлесерыял «Трое супраць усіх-2».
15.35 Фільм «Варыянт «Амега». 2-я серыя.
16.50 Навіны - Беларусь.
17.00 Весткі.
17.25 "Падарожжы музыкі".
17.55 "Трымай мяне мацней". Тэлесерыял.
18.50 Навіны - Беларусь.
19.00 Весткі.
19.30 Тэлесерыял «Кармеліта".
21.20 Тэлесерыял «1941». 2009 г.
22.20 Тэлесерыял «Трое супраць усіх-2».
23.20 Навіны - Беларусь.
23.30 "Весткі+".
23.50 "Кулагін і партнёры".
00.20 Заканчэнне эфіру.

НТВ

06.00 Сёння.
06.05 Інфармацыйны канал "Сёння раніцай".
09.05 "Праграма Максімум.Скандалы. Інтрыгі. Расследаванні".
10.00 Сёння.
10.25 "Чыстасардэчнае прызнанне".
10.50 "Жаночы погляд".
11.20 Вострасюжэтны серыял "Пагоня за анёлам".
12.10 Вострасюжэтны серыял "Псеўданім "Албанец-2".
13.00 Сёння.
13.35 Серыял "Вяртанне Мухтара-2".
15.05 Серыял "Аэрапорт".
16.00 Сёння.
16.25 Серыял "Вуліцы пабітых ліхтароў".
18.30 "Агляд. Надзвычайнае здарэнне".
19.00 Сёння.
19.35 Серыял "Горад спакус".
21.40 "Вочная стаўка".
22.35 "Агляд. Надзвычайнае здарэнне".
23.00 Сёння.
23.25 Вострасюжэтны серыял "Псеўданім "Албанец-2".
00.20 Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял "Эксперты".

EUROSPORT

09.30 Футбол. Кваліфікацыя да Кубка свету 2010. ПАР. Літва - Францыя.
10.15 Футбол. Кваліфікацыя да Кубка свету 2010. ПАР. Нідэрланды - Шатландыя.
11.00 Футбол. Кваліфікацыя да Кубка свету 2010. ПАР.
12.00 Веславанне. Кубак свету. Мюнхен.
14.00 Лёгкая атлетыка. Камандны чэмпіянат Еўропы. Партугалія. Дзень 2.
17.00 Футбол. Кваліфікацыя да Кубка свету 2010. ПАР. Літва - Францыя.
17.45 Футбол. Кваліфікацыя да Кубка свету 2010. ПАР. Нідэрланды - Шатландыя.
18.30 Футбол. Кваліфікацыя да Кубка свету 2010. ПАР. Чарнагорыя - Італія.
19.00 Футбол. Кваліфікацыя да Кубка свету 2010. ПАР.
20.00 Лёгкая атлетыка. Камандны чэмпіянат Еўропы. Партугалія. Дзень 2.
22.00 Бокс. Паядынак за тытул Чэмпіёна міру па версіі IBF. Германія.
23.30 Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе Турынг. Часопіс.
00.00 Ралі. Ралійная серыя IRC. Бельгія. Агляд.
00.30 Ралі. Сусветны тур па ралі рэйду. Трансіберыйскае ралі. Агляд.
01.00 Аўтаспорт. Суперкубак Паршэ. Сільверстоун (Вялікабрытанія).
01.30 Супербайк. Чэмпіянат свету. Агляд.

БЕЛСАТ TV BELSAT

18.00 Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
18.05 «Угару, уніз», маст. фільм.
19.55 Асабісты капітал.
20.10 Акно ў Еўропу.
20.40 Побач з намі.
21.00 Аб'ектыў (навіны).
21.20 Гісторыя пад знакам Пагоні: «Давыд Гарадзенскі» (спазнаваўчая праграма).
21.25 Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Звычайны прэзідэнт», дак. фільм, 1997 г., Беларусь.
22.25 «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял.
23.15 Еўропа сёння.
23.45 Аб'ектыў.

ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

24 ЧЭРВЕНЯ, СЕРАДА

1

05.35 Серыял "Як сказаў Джым" (ЗША).
06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55 Навіны.
06.05 Дзень спорту.
06.10, 07.05, 08.10 "Добрай раніцы, Беларусь!".
06.45, 07.45 Зона Х.
07.30, 11.50 Дзелавое жыццё.
08.20 Гатуем разам.
08.35 Сфера інтарэсаў.
09.05, 12.55 "Беларусь. Гісторыя Перамогі".
09.10 Баявік "Танкер "Танга" (Расія).
10.05 Меладрама "Тэрыторыя прыгажосці".
10.50 Серыял "Два бакі адной Ганны".
11.40 "OFF STAGE LIFE".
12.10 Дакументальны фільм "Апошнія сведкі".
13.05 Камедыйны дэтэктыўны серыял "Монк".
14.05 Альманах вандраванняў.
14.30 Камедыйны серыял "Офіс" (ЗША).
15.15, 19.20 Навіны рэгіёна.
15.25 Мастацка-публіцыстычны цыкл "Аперацыя "Баграціён". Хроніка Перамогі". Фільм 2-і.
16.05 Вострасюжэтны серыял "Двое з куфара".
16.55 Меладрама "Тэрыторыя прыгажосці".
17.50 Серыял "Два бакі адной Ганны".
18.50, 01.20 "Зона Х". Крымінальная хроніка.
19.30 Зямельнае пытанне.
19.55 Баявік "Танкер "Танга" (Расія). Закл. серыя.
20.50 "Спортлато 5 з 36". Забаўляльнае шоў.
21.00 Панарама.
21.50 Відэафільм АТН "Зброя Перамогі. Гомельшчына".
22.15 Серыял "Адчайныя хатнія гаспадыні".
23.20 Псіхалагічная драма "Паляванне Ханта".
01.25 Дзень спорту.
01.35 Камедыйны серыял "Офіс" (ЗША).
01.05 Дзень спорту.
01.15 Камедыйны серыял «30 РОК» (ЗША).

Н

09.05-16.00 Тэхнічная прафілактыка ў Слоніме
06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00 Нашы навіны.
06.05 АНТ прадстаўляе: "Наша раніца".
09.05 "Рудая". Шматсерыйны фільм.
10.05 "Смерць шпіёнам. Крым". Серыял.
11.00 Нашы навіны.
11.05 Навіны спорту.
11.10 "Кантрольны закуп".
11.40 "Ералаш".
12.00 "Малахаў+".
13.00 Нашы навіны.
13.05 Навіны спорту.
13.10 "Зразумець. Прабачыць".
13.45 "Модны прысуд".
14.45 "Хачу ведаць".
15.10 "Гарачы лёд". Шматсерыйны фільм.
16.00 Нашы навіны.
16.10 Навіны спорту.
16.15 "Прынцэса цырку". Шматсерыйны фільм.
17.10 "Хай кажуць".
18.00 Нашы навіны.
18.15 Навіны спорту.
18.20 Серыял «Гуманоіды ў Каралёве».
18.55 "Рудая". Шматсерыйны фільм.
20.00 Час.
20.30 Нашы навіны.
21.00 Навіны спорту.
21.05 "Музычныя вечары ў Мірскім замку". "Новыя галасы Беларусі". Частка 1.
22.50 "Смерць шпіёнам. Крым". Серыял.
23.55 Нашы навіны.
00.10 Навіны спорту.
00.15 "Наша Russia".
00.40 "Шпіталь каралеўства". Серыял.
01.25 Нашы навіны.
01.40-01.50 Навіны спорту.

ТВ

06.00 "24 гадзіны".
06.10 "Міншчына".
06.20 "Раніца. Студыя добрага настрою".
07.30 "24 гадзіны".
07.40 "Раніца. Студыя добрага настрою".
08.30 "Аўтапанарама".
08.50 "Зграя". Серыял.
10.00 "Пяць гісторый".
10.30 "24 гадзіны".
10.40 "Рэальны спорт".
10.55 "Танга ўтрох". Тэленавэла.
11.45 "Сіла прыцягнення". Серыял.
12.40 "Званая вячэра".
13.30 "24 гадзіны".
13.50 "Top Gear. Руская версія".
14.40 "Гадкае качаня". Моладзевы серыял.
15.30 "Інструктар". Серыял.
16.30 "24 гадзіны".
16.50 "Вайна. Вядомая і невядомая".
17.20 "Міншчына".
17.30 "Званая вячэра".
18.30 "Сіла прыцягнення". Серыял.
19.30 "24 гадзіны".
20.00 "Сталічныя падрабязнасці".
20.10 "СТБ-спорт".
20.15 "Добры вечар, маляня".
20.30 "Зграя". Серыял. Заключная серыя.
21.40 "Дабро пажаліцца".
22.00 "Мінск і мінчане".
22.30 "24 гадзіны".
22.55 "СТБ-спорт".
23.00 "Інструктар". Серыял.
23.55 "Дэтэктыўныя гісторыі".

1+1

06.55 ЛАДная раніца.
07.55 Смачна з Барысам Бурдой.
08.20 Серыял "Вяртанне Турэцкага" (Расія).
09.10 У гэты дзень.
09.15 Гадзіна суду. Справы сямейныя.
10.05 Серыял "Спадчынніца" (Мексіка).
10.50 "І зноў рану сэрца кранаючы..." Маналогі аб вайне.
11.05 Свая музыка.
11.35 Пасоўванне+.
12.00 Спорт-кадр.
12.30 Дэтэктыўны серыял "Двайняты" (Расія).
13.25 Дэтэктыўны серыял "Вераніка Марс".
14.50 Мультфільм.
15.05 М/с "Русалачка". Заключная серыя.
15.25 Пазакласная гадзіна.
15.40 Гадзіна суду з Паўлам Астахавым.
16.35 Смачна з Барысам Бурдой.
16.55 Медычныя таямніцы.
17.35 Серыял "Спадчынніца" (Мексіка).
18.35 Навіны культуры.
18.50 Серыял "Вяртанне Турэцкага" (Расія).
19.45 Беларуская часіна.
20.40 Калыханка.
21.00 Экспедыцыя.
21.05 "І зноў рану сэрца кранаючы..." Маналогі аб вайне.
21.15 Камедыя "Джо супраць вулкана" (ЗША).
23.05 Меладрама "Жыкіна дынастыя".

РОССИЯ

07.00 Добрай раніцы, Расія!
09.20 Тэлесерыял «Кармеліта".
11.00 Весткі.
11.30 Тэлесерыял «1941». 2009 г.
12.20 "Трымай мяне мацней". Тэлесерыял.
13.15 "Кулагін і партнёры".
13.50 Навіны - Беларусь.
14.00 Весткі.
14.20 "Апраўданне Гогаля". Д/с. Фільм 2.
14.45 Тэлесерыял «Трое супраць усіх-2».
15.35 Фільм «Варыянт «Амега». 3-я серыя.
16.50 Навіны - Беларусь.
17.00 Весткі.
17.25 "Спецыяльны карэспандэнт".
17.55 "Трымай мяне мацней". Тэлесерыял.
18.50 Навіны - Беларусь.
19.00 Весткі.
19.30 Тэлесерыял «Кармеліта".
21.20 Тэлесерыял «1941». 2009 г.
22.20 Тэлесерыял «Трое супраць усіх-2».
23.20 Навіны - Беларусь.
23.30 "Весткі+".
23.50 "Кулагін і партнёры".
00.20 Заканчэнне эфіру.

НТВ

06.00 Сёння.
06.05 Інфармацыйны канал "Сёння раніцай".
09.00 "Вочная стаўка".
10.00 Сёння.
10.20 "Асоба небяспечны!".
10.55 "Галоўная дарога".
11.20 Серыял "Пагоня за анёлам".
12.10, 23.25 Серыял "Псеўданім "Албанец-2".
13.00 Сёння.
13.35 Дэтэктыўны серыял "Вяртанне Мухтара-2".
15.05 Серыял "Аэрапорт".
16.00 Сёння.
16.25 Серыял "Вуліцы пабітых ліхтароў".
18.30 "Агляд. Надзвычайнае здарэнне".
19.00 Сёння.
19.35 Вострасюжэтны серыял "Горад спакус".
21.40 "І зноў добры дзень!".
22.35 "Агляд. Надзвычайнае здарэнне".
23.00 Сёння.
00.20 Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял "Эксперты".

EUROSPORT

09.30 Паралімпійскія віды спорту. Кубак свету. Манчэстэр (Вялікабрытанія).
10.30 Футбол. Кваліфікацыя да Кубка свету 2010. ПАР.
11.30 Лёгкая атлетыка. Камандны чэмпіянат Еўропы. Партугалія. Дзень 2.
14.30 Снукер. Сусветная серыя. Ірландыя. Дзень 2.
16.30 Футбол. Кваліфікацыя да Кубка свету 2010. ПАР. 7-ы тур. Паўднёвая Карэя - КНДР.
17.30 Футбол. Кваліфікацыя да Кубка свету 2010. ПАР. Літва - Францыя.
18.15 Футбол. Кваліфікацыя да Кубка свету 2010. ПАР. Турцыя - Іспанія.
19.00 Футбол. Кваліфікацыя да Кубка свету 2010. ПАР.
20.00 Супербайк. Чэмпіянат свету. Агляд.
21.00 "Еўраспорт за чыстую планету". Часопіс.
21.35 Конны спорт. Кубак нацый. Ратэрдам (Нідэрланды).
22.40 Гольф.
22.50 Гольф. Еўратур. Адкрыты чэмпіянат Сен-Амера. Францыя.
23.20 Гольф клуб. Навіны гольфу.
23.25 Ветразны спорт. Медкап. Марсэль.
23.55 Яхт клуб. Навіны ветразнага спорту.
00.15 "Еўраспорт за чыстую планету". Часопіс.
00.45 Спартыўныя бальныя танцы. Паказальны выступ. Манака.
01.45 Лёгкая атлетыка. Камандны чэмпіянат Еўропы. Партугалія. Дзень 2.

БЕЛСАТ tv BELSAT

18.00 Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
18.05 «Ранча», серыял.
18.50 «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял.
19.40 «Беларускі фронт, альбо Размовы пра мову», дак. фільм, 2007 г., Беларусь.
20.30 Праект «Будучыня».
21.00 Аб'ектыў (навіны).
21.20 Гісторыя пад знакам Пагоні: «Міндоўг».
21.30 «Угару, уніз», маст. фільм, 2004 г., Чэхія.
23.15 Госць «Белсату».
23.35 «Калыханка» ад Сашы і Сірожы.
23.45 Аб'ектыў.

25 ЧЭРВЕНЯ, ЧАЦВЕР

1

05.35 Серыял "Як сказаў Джым" (ЗША).
06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55 Навіны.
06.05 Дзень спорту.
06.10, 07.05, 08.10 "Добрай раніцы, Беларусь!"
06.45, 07.45 Зона Х.
07.30, 08.30, 11.50 Дзелавое жыццё.
08.20 Гатуем разам.
08.35 Зямельнае пытанне.
09.05, 13.55 "Беларусь. Гісторыя Перамогі".
09.10 Баявік "Танкер "Танга". Закл.серыя.
10.05 Меладрама "Тэрыторыя прыгажосці".
10.50 Серыял "Два бакі адной Ганны".
11.40 Відэафільм АТН "Пастаўскія фарбы" цыклу "Зямля беларуская".
12.10 Серыял "Адчайныя хатнія гаспадыні". Закл. серыя.
13.05 Дэтэктыўны серыял "Монк" (ЗША).
14.05 Уласнай персонай.
14.30 Серыял "Офіс" (ЗША). Заключная серыя.
15.15, 19.20 Навіны рэгіёна.
15.25 Мастацка-публіцыстычны цыкл "Аперацыя "Баграціён". Хроніка Перамогі". Фільм 3-і.
16.05 Серыял "Двое з куфара" (Расія).
16.55 Меладрама "Тэрыторыя прыгажосці".
17.50 Меладраматычны серыял "Два бакі адной Ганны" (Украіна).
18.50, 00.20 "Зона Х". Крымінальная хроніка.
19.30 Сфера інтарэсаў.
19.55 Канцэрт Кліфа Рычарда (Аўстралія).
21.00 Панарама.
21.50 Меладрама "Кактэбель" (Расія).
23.50, 00.35 Камедыйны серыял "Офіс" (ЗША).
00.25 Дзень спорту.

Н

06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00 Нашы навіны.
06.05 АНТ прадстаўляе: "Наша раніца".
09.05 "Рудая". Шматсерыйны фільм.
10.05 "Смерць шпіёнам. Крым". Шматсерыйны фільм.
11.00 Нашы навіны.
11.05 Навіны спорту.
11.10 "Кантрольны закуп".
11.40 "Ералаш".
12.00 "Малахаў+".
13.00 Нашы навіны.
13.05 Навіны спорту.
13.10 "Зразумець. Прабачыць".
13.45 "Модны прысуд".
14.45 "Хачу ведаць".
15.10 "Гарачы лёд". Шматсерыйны фільм.
16.00 Нашы навіны.
16.10 Навіны спорту.
16.15 "Прынцэса цырку". Шматсерыйны фільм.
17.10 "Хай кажуць".
18.00 Нашы навіны.
18.15 Навіны спорту.
18.20 Камедыйны серыял «Гуманоіды ў Каралёве». Расія, 2008 год.
18.55 "Рудая". Шматсерыйны фільм.
20.00 Час.
20.30 Нашы навіны.
21.00 Навіны спорту.
21.05 АНТ прадстаўляе: "Музычныя вечары ў Мірскім замку". Сольны канцэрт А.Агурбаш.
22.50 Прэм'ера. "Смерць шпіёнам. Крым". Шматсерыйны фільм.
23.55 Нашы навіны.
00.10 Навіны спорту.
00.15 "Наша Russia".
00.40 "Шпіталь каралеўства". Шматсерыйны фільм.
01.25 Нашы навіны.
01.40-01.50 Навіны спорту.

ТВ

06.00 "24 гадзіны".
06.10 "Міншчына".
06.20 "Раніца. Студыя добрага настрою".
07.30 "24 гадзіны".
07.40 "Раніца. Студыя добрага настрою".
08.30 "Дабро пажаліцца".
08.50 "Зграя". Серыял. Заключная серыя.
10.00 "Пяць гісторый".
10.30 "24 гадзіны".
10.40 "Далёкія сваякі".
11.00 "Танга ўтрох". Тэленавэла.
11.50 "Сіла прыцягнення". Серыял.
12.40 "Званая вячэра".
13.30 "24 гадзіны".
13.50 "Прыватныя гісторыі".
14.40 "Гадкае качаня". Моладзевы серыял.
15.30 "Інструктар". Серыял.
16.30 "24 гадзіны".
16.50 "Малая Радзіма".
17.20 "Міншчына".
17.30 "Званая вячэра".
18.30 "Сіла прыцягнення". Серыял.
19.30 "24 гадзіны".
20.00 "Сталічныя падрабязнасці".
20.10 "СТБ-спорт".
20.15 "Добры вечар, маляня".
20.30 "Беларусьфільм" прадстаўляе: "Маёр Вятроў". Серыял.
21.40 "Аўтапанарама".
22.00 "Асабісты інтарэс".
22.30 "24 гадзіны".
22.55 "СТБ-спорт".
23.00 "Інструктар". Серыял.
23.55 "Сакрэтныя гісторыі".

1+1

06.55 ЛАДная раніца.
07.55 Смачна з Барысам Бурдой.
08.15 Дэтэктыўны серыял "Вяртанне Турэцкага" (Расія).
09.05 У гэты дзень.
09.10 Гадзіна суду. Справы сямейныя.
10.00 Серыял "Спадчынніца" (Мексіка).
10.45 "І зноў рану сэрца кранаючы..." Маналогі аб вайне.
11.00 Невытлумачальна, але факт.
11.50 Дэтэктыўны серыял "Двайняты" (Расія).
12.45 Моладзевы дэтэктыўны серыял "Вераніка Марс" (ЗША).
14.10 Мультфільм.
14.30 Мультсерыял "Джордж з джунгляў" (ЗША). 1-я і 2-я серыі.
15.15 Пазакласная гадзіна.
15.30 Гадзіна суду з Паўлам Астахавым.
16.25 Смачна з Барысам Бурдой.
16.55 Медычныя таямніцы.
17.35 Серыял "Спадчынніца" (Мексіка).
18.35 Навіны культуры.
18.50 Дэтэктыўны серыял "Вяртанне Турэцкага" (Расія).
19.45 Беларуская часіна.
20.40 Калыханка.
21.00 Экспедыцыя.
21.05 "І зноў рану сэрца кранаючы..." Маналогі аб вайне.
21.15 Час футболу.
21.45 Меладрама "Мае чарнічныя ночы" (Ганконг-Кітай- Францыя).
23.25 "Проста праграма".

РОССИЯ

07.00 Добрай раніцы, Расія!
09.20 Тэлесерыял «Кармеліта".
11.00 Весткі.
11.30 Тэлесерыял «1941». 2009 г.
12.20 "Трымай мяне мацней". Тэлесерыял.
13.15 "Кулагін і партнёры".
13.50 Навіны - Беларусь.
14.00 Весткі.
14.20 "Апраўданне Гогаля". Дакументальны серыял. Фільм 3.
14.40 Тэлесерыял «Трое супраць усіх-2».
15.30 Фільм «Варыянт «Амега». 4-я серыя.
16.50 Навіны - Беларусь.
17.00 Весткі.
17.25 "Формула ўлады".
17.55 "Трымай мяне мацней". Тэлесерыял.
18.50 Навіны - Беларусь.
19.00 Весткі.
19.30 Тэлесерыял «Кармеліта".
21.20 Тэлесерыял «1941». 2009 г.
22.20 Тэлесерыял «Трое супраць усіх-2».
23.20 Навіны - Беларусь.
23.30 "Весткі+".
23.50 "Кулагін і партнёры".
00.20 Заканчэнне эфіру.

НТВ

06.00 Сёння.
06.05 Інфармацыйны канал "Сёння раніцай".
09.00 "І зноў добры дзень!".
10.00 Сёння.
10.20 "Кухары і кухцікі".
10.50 "Барацьба за ўласнасць".
11.20 Вострасюжэтны серыял "Пагоня за анёлам".
12.05 Вострасюжэтны серыял "Псеўданім "Албанец-2".
13.00 Сёння.
13.35 Дэтэктыўны серыял "Вяртанне Мухтара-2".
15.05 Серыял "Аэрапорт".
16.00 Сёння.
16.30 Крымінальны серыял "Вуліцы пабітых ліхтароў".
18.30 "Агляд. Надзвычайнае здарэнне".
19.00 Сёння.
19.35 Прэм'ера. Вострасюжэтны серыял "Горад спакус".
21.40 "Рускія не здаюцца!".
22.35 "Агляд. Надзвычайнае здарэнне".
23.00 Сёння.
23.25 Серыял "Псеўданім "Албанец-2".
00.20 Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял "Эксперты".

EUROSPORT

09.35 Конны спорт. Кубак нацый. Ратэрдам (Нідэрланды).
10.30 "Еўраспорт за чыстую планету". Часопіс.
11.00 Футбол. Кваліфікацыя да Кубка свету 2010. ПАР.
12.00 Футбол. Чэмпіянат Еўропы да 17 гадоў. Жанчыны. Швейцарыя. Матч за 3-е месца.
13.45 Футбол. Кваліфікацыя да Кубка свету 2010. ПАР. Сербія - Аўстрыя.
14.30 Футбол. Кваліфікацыя да Кубка свету 2010. ПАР. 8-ы тур. КНДР - Іран.
15.30 Футбол. Чэмпіянат Еўропы да 17 гадоў. Жанчыны. Швейцарыя. Фінал.
17.15 Футбол. Кваліфікацыя да Кубка свету 2010. ПАР. Літва - Румынія.
18.00 Футбол. Кваліфікацыя да Кубка свету 2010. ПАР. Швецыя - Данія.
19.00 Футбол. Кваліфікацыя да Кубка свету 2010. ПАР.
20.00 Снукер. Зала славы.
21.00 Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб.
00.00 Ралі. Чэмпіянат свету. Польшча. Прэв'ю.
00.30 Пра рэстлінг. Vintage Collection. ЗША.
01.30 Пра рэстлінг. Агляд WWE (World Wrestling Entertainment).
02.00 Ралі. Чэмпіянат свету. Польшча. Прэв'ю.

БЕЛСАТ tv BELSAT

18.00 Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
18.05 «Ранча», серыял.
18.50 «Апошні сезон», серыял.
19.45 «Скрадзеная малітва», дак. фільм, 2008 г., Польшча.
20.05 YoLife! (моладзевая праграма).
20.25 На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу "Нямецкая хваля").
21.00 Аб'ектыў (навіны).
21.20 Гісторыя пад знакам Пагоні: «Давыд Гарадзенскі» (спазнаваўчая праграма).
21.30 Дакументальная гадзіна: «Рэвалюцыя: як гэта робіцца», дак. фільм, 2001 г., Галандыя.
22.30 МакраФон: «Сон-трава», канцэрт гурта «Троіца», ч. 2.
23.05 «Еўрапейскі Саюз без сакрэтаў», 1 серыя: «Валютная палітыка».
23.25 «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма).
23.40 Аб'ектыў (паўтор).

26 ЧЭРВЕНЯ, ПЯТНІЦА

05.35 Камедыйны серыял "Як сказаў Джым" (ЗША).
06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 18.35, 23.55 Навіны.
06.05 Дзень спорту.
06.10, 07.05, 08.10 "Добрай раніцы, Беларусь!".
06.45, 07.45 Зона Х.
07.30, 11.50 Дзелавое жыццё.
08.20 Гатуем разам.
08.35 Сфера інтарэсаў.
09.10, 13.55 "Беларусь. Гісторыя Перамогі".
09.15 Дакументальны цыкл "Мая праўда" (Украіна).
10.00 Меладрама "Тэрыторыя прыгажосці" (Украіна).
10.50 Меладраматычны серыял "Два бакі адной Ганны" (Украіна).
11.40 "OFF STAGE LIFE".
12.10 Дакументальны фільм "Беларусы - Героі Савецкага Саюза" ("Белвідэацэнтр").
13.05 Камедыйны дэтэктыўны серыял "Монк" (ЗША).
14.05 Шпілька.
14.30 "Будні чэмпіёнаў".
15.15, 18.55 Навіны рэгіёна.
15.25 Вострасюжэтны серыял "Двое з куфара" (Расія).
16.25 Жаночае ток-шоў "Жыццё як жыццё".
17.30 Меладраматычны серыял "Два бакі адной Ганны" (Украіна).
19.10 Футбол. Чэмпіянат Еўропы. U-21. Паўфінал. Прамая трансляцыя.
21.10 Панарама.
22.00 Фантастычны серыял "Зорны крэйсер "Галактыка" (ЗША - Вялікабрытанія).
23.45 Камедыя "Містэр Лёс" (ЗША).
01.45 Дзень спорту.

06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00 Нашы навіны.
06.05 АНТ прадстаўляе: "Наша раніца".
09.05 "Рудая". Шматсерыйны фільм.
10.05 "Смерць шпіёнам. Крым". Шматсерыйны фільм.
11.00 Нашы навіны.
11.05 Навіны спорту.
11.10 "Кантрольны закуп".
11.40 "Ералаш".
12.00 "Малахаў+".
13.00 Нашы навіны.
13.05 Навіны спорту.
13.10 "Зразумець. Прабачыць".
13.45 "Модны прысуд".
14.45 "Хачу ведаць".
15.10 "Гарачы лёд". Шматсерыйны фільм.
16.00 Нашы навіны.
16.10 Навіны спорту.
16.15 "Прынцэса цырку". Шматсерыйны фільм.
17.10 "Хай кажуць".
18.00 Нашы навіны.
18.15 Навіны спорту.
18.20 АНТ прадстаўляе: "Дакументальны дэтэктыў".
19.00 "Поле цудаў".
20.00 Час.
20.30 Нашы навіны.
21.00 Навіны спорту.
21.05 АНТ прадстаўляе: "Музычныя вечары ў Мірскім замку". Канцэрт групы "Воплі Відаплясава".
22.50 Прэм'ера. Драма "Зграя".
00.35 Фільм "Крымінальны раман".
02.10 Нашы навіны.
02.25-02.35 Навіны спорту.

06.00 "24 гадзіны".
06.10 "Мінчына".
06.20 "Раніца. Студыя добрага настрою".
07.30 "24 гадзіны".
07.40 "Раніца. Студыя добрага настрою".
08.30 "Аўтапанарама".
08.50 "Беларусьфільм" прадстаўляе: "Маёр Вятроў". Серыял.
10.00 "Пяць гісторый".
10.30 "24 гадзіны".
10.40 "Дарагая перадача".
11.00 "Танга ўтрох". Тэленавэла.
11.50 "Сіла прыцягнення". Серыял.
12.40 "Званая вячэра".
13.30 "24 гадзіны".
13.50 "Добры дзень, доктар!".
14.20 "Далёкія сваякі".
14.40 "Гадкае качаня". Моладзевы серыял.
15.30 "Інструктар". Серыял.
16.30 "24 гадзіны".
16.50 "Асабісты інтарэс".
17.20 "Мінчына".
17.30 "Званая вячэра".
18.30 "Сіла прыцягнення". Серыял.
19.30 "24 гадзіны".
20.00 "Сталічныя падрабязнасці".
20.10 "СТБ-спорт".
20.15 "Добры вечар, маляня".
20.30 КВЗ. Першая ліга. 1/4 Фіналу.
22.30 "24 гадзіны".
22.55 "СТБ-спорт".
23.00 "Відзьмо-невідзьмо". Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
23.40 Фільм "Рой". Канада, 2005 г.

06.55 ЛАДная раніца.
07.55 Смачна з Барысам Бурдой.
08.30 Дэтэктыўны серыял "Вяртанне Турэцкага" (Расія).
09.15 У гэты дзень.
09.20 Гадзіна суду. Справы сямейныя.
10.10 Час футболу.
10.45 Серыял "Спадчынніца" (Мексіка).
11.30 "І зноў рану сэрца кранаючы..." Маналогі аб вайне.
11.45 "Лабірынты: зачараваныя замкі паннаў Горват".
12.15 Дэтэктыўны серыял "Двайняты" (Расія).
13.05 Моладзевы дэтэктыўны серыял "Вераніка Марс" (ЗША).
14.35 Пазакласная гадзіна.
14.45 Школа рамонту.
15.35 Гадзіна суду з Паўлам Астахавым.
16.30 Смачна з Барысам Бурдой.
16.55 Медычныя таямніцы.
17.35 Серыял "Спадчынніца" (Мексіка).
18.35 Навіны культуры.
18.50 Усё аб бяспецы.
19.20 Бітва экстрасэнсаў.
20.20 Рэпарцёр "Беларускай часіны".
21.05 Калыханка.
21.25 Экспедыцыя.
21.30 "І зноў рану сэрца кранаючы..." Маналогі аб вайне.
21.40 Іранічная камедыя "Квартэт для дваіх" (Украіна).
23.25 Трылер "Альфа Дог" (ЗША).

07.00 Добрай раніцы, Расія!
09.20 Тэлесерыял «Кармеліта».
11.00 Весткі.
11.30 Тэлесерыял «1941». 2009 г.
12.20 "Трымай мяне мацней". Тэлесерыял.
13.15 "Кулагін і партнёры".
13.50 Навіны - Беларусь.
14.00 Весткі.
14.20 "Апраўданне Гогаля". Дакументальны серыял. Фільм 4.
14.50 Тэлесерыял «Трое супраць усіх-2».
15.40 Фільм «Варыянт «Амега». 5-я серыя.
16.50 Навіны - Беларусь.
17.00 Весткі.
17.25 "Гарадок". Дайджэст.
17.55 "Трымай мяне мацней". Тэлесерыял.
18.50 Навіны - Беларусь.
19.00 Весткі.
19.30 Тэлесерыял «Кармеліта".
21.20 "Юрмала". Міжнародны фэст гумарыстычных праграм.
23.10 Навіны - Беларусь.
23.20 Фільм "Ідэальная жонка". 2007 г.
01.10 Заканчэнне эфіру.

06.00 Сёння.
06.05 Інфармацыйны канал "Сёння раніцай".
09.00 "Галоўны герой".
10.00 Сёння.
10.25 "Шнур вакол свету".
10.50 "Авіятары".
11.20 Вострасюжэтны серыял "Пагоня за анёлам".
12.10 Вострасюжэтны серыял "Псеўданім "Албанец-2".
13.00 Сёння.
13.30 Дэтэктыўны серыял "Вяртанне Мухтара-2".
15.10 Серыял "Аэрапорт".
16.00 Сёння.
16.30 Крымінальны серыял "Вуліцы пабітых ліхтароў".
18.30 "Агляд. Надзвычайнае здарэнне".
19.00 Сёння.
19.35 "Следства вялі...".
20.40 "Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне".
21.00 "Летні Суперстар": "Незвычайны канцэрт".
22.55 Дэтэктыўны трылер "Памежны горад".
00.55 Трылер "Крык-3".

09.30 Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе Турынг. Часопіс.
10.00 Ралі. Чэмпіянат свету. Польшча. Прэв'ю.
10.30 Футбол. Кваліфікацыя да Кубка свету 2010. ПАР. Швецыя - Мальта.
11.15 Футбол. Кваліфікацыя да Кубка свету 2010. ПАР. Нідэрланды - Нарвегія.
12.00 Футбол. Чэмпіянат Еўропы да 17 гадоў. Жанчыны. Швейцарыя. Матч за 3-е месца.
13.30 Футбол. Чэмпіянат Еўропы да 17 гадоў. Жанчыны. Швейцарыя. Фінал.
15.00 Футбол. Кваліфікацыя да Кубка свету 2010. ПАР. 9-ы тур. Аўстралія - Бахрэйн.
16.00 Футбол. Кваліфікацыя да Кубка свету 2010. ПАР. 10-ы тур. Аўстралія - Японія.
17.30 Футбол. Кваліфікацыя да Кубка свету 2010. ПАР. 10-ы тур. Паўднёвая Карэя - Іран.
18.15 Футбол. Кваліфікацыя да Кубка свету 2010. ПАР. Швецыя - Мальта.
19.00 Футбол. Кваліфікацыя да Кубка свету 2010. ПАР. Нідэрланды - Нарвегія.
20.00 Самыя моцныя людзі планеты. Ліга чэмпіёнаў. Фінляндыя.
21.00 Покер. Турнір Partouche. Францыя.
22.00 Бокс. Міжнародны паядынак. Германія.
00.00 Ралі. Чэмпіянат свету. Польшча. Дзень 1.
00.30 Супербайк. Чэмпіянат свету. Агляд.
01.30 Армрэстлінг. PAL/NAL.
02.00 Ралі. Чэмпіянат свету. Польшча. Дзень 1.

18.00 Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
18.05 «Ранча», серыял.
18.55 Праект «Будучыня» (навукова-папулярны тэлечасопіс каналу "Нямецкая хваля").
19.25 Форум (ток-шоў): Каб людзьмі звацца.
20.15 Кінастужка (агляд кінарынку).
20.40 Госць «Белсату».
21.00 Аб'ектыў (навіны).
21.20 Гісторыя пад знакам Пагоні: «Міндоўг» (спазнаваўчая праграма).
21.35 «У Бога за пазухай», камедыя, 1998 г., Польшча.
23.10 Жаўтуха (сатырычная праграма).
23.40 Аб'ектыў.

27 ЧЭРВЕНЯ, СУБОТА

06.15 Моладзевы серыял "Сэрца акіяну" (Францыя).
06.45 Брытва Окама.
07.10 Існасць.
07.35 Дзень спорту.
07.45 "Добрай раніцы, Беларусь!".
08.45 Гатуем разам.
08.55, 12.10 "Беларусь. Гісторыя Перамогі".
09.00, 12.00, 15.00, 18.00 Навіны.
09.05 Камедыйны серыял "Як сказаў Джым" (ЗША).
09.55 Здароўе.
10.30 Шпілька.
11.05 Ранішняя хваля.
11.40 "OFF STAGE LIFE".
12.15 Камедыя "Сем нянек" (СССР).
13.45 "Залатыя Віцязі Беларусі".
14.30 "Будні чэмпіёнаў".
15.10 Навіны рэгіёна.
15.40 Вакол планеты.
16.20 "Зона Х". Вынікі тыдня.
16.45 Дакументальны цыкл "Мая праўда" (Украіна).
17.45 Відэафільм АТН "Спадчына зямлі Аршанскай" цыклу "Зямля беларуская".
18.20 "Ваша лато".
19.10 Латарэя "Пяцёрачка".
19.20 Меладрама "Вораг №1" (Украіна).
21.00 Панарама.
21.45 Гангстэрская камедыя "Аналізуй гэта" (ЗША - Аўстралія).
23.40 Уласнай персонай.

07.00 АНТ прадстаўляе: "Суботняя раніца".
08.00, 09.00 Нашы навіны.
09.05 "Шчаслівыя разам". Камедыйны серыял.
09.35 "Здароўе".
10.20 "Смак".
11.00 Прыгодніцкі фільм "Турэцкі гамбіт".
13.25 Тэлечасопіс "Саюз".
13.55 "Кінаметры вайны".
14.25 "Канстанцін Заслонаў". Мастацкі фільм.
16.00 Нашы навіны.
16.15 Навіны спорту.
16.20 Вялікая палітыка.
16.50 Тэорыя неверагоднасці. "Гіпноз".
17.25 Праект "Агульнае справа".
18.45 "Асабістае жыццё доктара Селіванавай". Шматсерыйны фільм.
20.30 Нашы навіны.
21.00 Навіны спорту.
21.05 АНТ прадстаўляе: "Музычныя вечары ў Мірскім замку". Канцэрт Крыса Нормана.
22.50 Прэм'ера. "Прытулак камедыянтаў".
00.25-2.15 Трылер "Смяротны спадарожнік".

06.10 "Анфас".
06.25 "Турысты". Камедыйны серыял.
07.15 Фільм "Прыгоды Электроніка". СССР, 1980 г. 1-я і 2-я серыі.
09.35 "Я - вандроўца".
10.00 "Крокі да поспеху".
10.55 "Мінск і мінчане".
11.30 "Каханне Маё". Камедыйны серыял.
12.30 "Новыя падарожжы дылетанта".
13.00 Фільм "Не бойся, я з табой!". СССР, 1981 г.
15.30 "Ваенная таямніца".
16.20 "Наша справа".
16.30 "24 гадзіны".
16.40 "Відзьмо-невідзьмо". Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
17.20 "Нашы рэкорды".
18.10 "Top Gear. Руская версія".
19.00 "Ля параднага пад'езду".
19.30 "24 гадзіны".
20.00 "СТБ-спорт".
20.10 Фільм "Монстр". Германія-ЗША, 2003 г.
22.10 Канцэрт М.Задорнава.
23.20 Фільм "Апошняе сонца". Францыя-Бразілія-Швейцарыя, 2001 г.
00.50 Фільм "Сапфіравыя дзяўчыны". ЗША, 2003 г.

07.45 Дакументальна-пазнавальны серыял "Сардэчна запрашаем у маю краіну" (Францыя).
08.15 Серыял для дзяцей "Філ з будучыні" (ЗША).
09.00 Свая кампанія.
10.05 Таемны густ.
10.35 Школа рамонту.
11.30 "І зноў рану сэрца кранаючы..." Маналогі аб вайне.
11.40 Невытлумачальна, але факт.
12.40 "Лабірынты: святло ад пекла Вільні".
13.05 Запал па культуры. Ток-шоў.
13.50 Жаночая ліга.
14.15 Прыгодніцкі баявік "Жоўты цмок" (Расія). 1-4 серыі.
17.20 Дакументальны фільм "На мяжы: гульні Х-трэмалаў" (ЗША).
18.05 Прыгодніцкая драма "З'явіўшыся на свет, ужо не схаваешся" (Італія - Францыя - Вялікабрытанія).
20.20 Жаночая ліга.
20.50 "І зноў рану сэрца кранаючы..." Маналогі аб вайне.
21.05 Дэтэктыў "Падаленыя наступствы" (Расія). 1-я і 2-я серыі.
23.00 Футбол. Чэмпіянат Беларусі. Матч тура.

07.00 Весткі.
07.10 "Юрмала". Міжнародны фэст гумарыстычных праграм.
08.50 "Суботнік".
09.30 "Ранішняя пошта".
10.05 "Мой срэбны шар".
11.00 Весткі.
11.15 Пакой смеху.
13.05 Тэлесерыял "Каменская".
14.00 Весткі.
14.20 "Вялікая таямніца вады". Дакументальны фільм.
15.20 Фільм "Гран-па".
17.00 "Гарадок". Дайджэст.
17.30 "Аншлаг і Кампанія".
19.00 Весткі ў суботу.
19.40 "Суботні вечар".
21.25 Фільм "Сядзелка". 2007 г.
23.20 Фільм "Дробны нячысцік".
01.20 Заканчэнне эфіру.

07.35 "Казкі Бажэнава".
08.00 Сёння.
08.15 "Рускія не здаюцца!".
09.00 "Агляд".
09.30 "Без рэцэпту".
10.00 Сёння.
10.25 "Галоўная дарога".
10.55 "Кулінарны паядынак".
11.55 "Кватэрнае пытанне".
13.00 Сёння.
13.30 "Асоба небяспечны!".
14.05 Вострасюжэтная меладрама "Свой - чужы".
16.00 Сёння.
16.30 "Жаночы погляд".
17.05 Дэтэктыўны серыял "Закон і парадак. Аддзел аператыўных расследаванняў".
19.00 Сёння.
19.30 "Прафесія-рэпарцёр".
20.00 "Праграма Максімум.Скандалы. Інтрыгі. Расследаванні".
21.05 "Рускія сенсацыі".
22.00 "Ты не паверыш!".
23.00 Крымінальная драма "Трафік".

09.30 Ралі. Чэмпіянат свету. Польшча. Дзень 1.
10.00 Супербайк. Чэмпіянат свету. Агляд.
11.00 Веславанне на байдарках і каноэ. Чэмпіянат Еўропы на гладкай вадзе. Германія. Дзень 3.
12.15 Футбол. Кваліфікацыя да Кубка свету 2010. ПАР. Швецыя - Мальта.
13.00 Футбол. Кваліфікацыя да Кубка свету 2010. ПАР. Нідэрланды - Нарвегія.
14.00 Формула-2. Чэмпіянат свету. Спа-Франкашам (Бельгія). Гонка 1.
15.00 Веславанне на байдарках і каноэ. Чэмпіянат Еўропы на гладкай вадзе. Германія. Дзень 3.
16.30 Веславанне. Кубак свету. Мюнхен (Германія).
17.00 Супербайк. Чэмпіянат свету. Агляд.
18.00 Супербайк. Чэмпіянат свету. Суперпоул. Вялікабрытанія.
18.45 Плаванне. Міжземнаморскія гульні. Пескара (Італія). Дзень 1.
21.00 Веславанне на байдарках і каноэ. Чэмпіянат Еўропы на гладкай вадзе. Германія. Дзень 3.
21.30 Конны спорт. Турнір Global Champions. Манака.
23.00 Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб.
01.00 Ралі. Чэмпіянат свету. Польшча. Дзень 2.
01.30 Веславанне на байдарках і каноэ. Чэмпіянат Еўропы на гладкай вадзе. Германія. Дзень 3.
02.30 Ралі. Чэмпіянат свету. Польшча. Дзень 2.

18.00 Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
18.05 «Кіно і катлеты», дак. фільм, 2008 г., Беларусь.
19.15 На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу "Нямецкая хваля").
19.45 YoLife! (моладзевая праграма).
20.00 Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Заўчасны падарунак», дак. фільм, 1996 г., Польшча.
21.00 Аб'ектыў (навіны).
21.10 Гісторыя пад знакам Пагоні: «Багі» (спазнаваўчая праграма).
21.15 Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу "Нямецкая хваля").
21.45 Чалавек-эпоха: «Франка: на варце Захаду», дак. фільм, 2006 г., Іспанія.
22.45 «Апошні сезон», серыял.
23.40 Аб'ектыў.

ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

28 ЧЭРВЕНЯ, НЯДЗЕЛЯ

06.50 Сямейны серыял "Мая мама - ветэрынар" (Германія).
08.30 Альманах вандраванняў.
09.00, 12.00, 15.00 Навіны.
09.05, 15.30 "Беларусь. Гісторыя Перамогі".
09.10 Арсенал.
09.40 Камедыйны серыял "Як сказаў Джым" (ЗША).
10.25 Культурныя людзі.
11.00 Усе стыхіі.
11.25 У свеце матораў.
12.10 Камедыйная меладрама "Закаханы па ўласным жаданні" (СССР).
14.00 Хранікальна-дакументальны цыкл "Нябачны фронт" (Беларусь).
14.30 Хранікальна-дакументальны фільм "Лётчык Рыгор Дзянісенка" цыклу "Вялікай Перамогі Салдаты" (Беларускае тэлебачанне).
15.10 Навіны рэгіёна.
15.35 Nota Bene.
16.05 Фантастычны серыял "Паверхня" (ЗША).
17.45 Суперлато.
18.40 Прэм'ера. Камедыйная меладрама "Я лічу: раз, два, тры, чатыры, пяць..." (Расія-Украіна).
20.35 "Спортлато 5 з 36". Забаўляльнае шоў.
21.00 "Панарама тыдня".
22.05 Драма "Кожная нядзеля" (ЗША).

07.00 АНТ прадстаўляе: "Нядзельная раніца".
08.00, 09.00 Нашы навіны.
09.05 Нядзельная пропаведзь.
09.20 "Шчаслівыя разам". Камедыйны серыял.
09.50 "Шалапутныя нататкі".
10.10 Пакуль усе дома.
11.00 Фазэнда.
11.35 "Разумніцы і разумнікі".
12.20 АНТ прадстаўляе: "Ранішняя пошта".
12.45 "Зваротны адлік".
13.15 "М.Міронава і А.Менакер. Да і пасля Андрэйкі...".
14.15 Прэм'ера. Фільм "Кадэт".
16.00 Нашы навіны.
16.15 Навіны спорту.
16.20 Нядзельны "Ералаш".
16.35 "Пабочны бізнэс зорак".
17.35 "КВЗ". Прэм'ер-ліга.
19.10 АНТ прадстаўляе: "Рэкламная паўза".
20.00 Контуры.
21.05 АНТ прадстаўляе: "Музычныя вечары ў Мірскім замку". "Новыя галасы Беларусі". Частка 2.
22.50 "Вялікая розніца".
23.50 Цырымонія закрыцця 31-га Маскоўскага Міжнароднага кінафэсту.
00.50-02.25 Камедыя "Больш грошай".

06.55 "Праверана на сабе".
07.40 "Турысты". Камедыйны серыял.
08.25 Фільм "Прыгоды Электроніка". СССР, 1980 г. Заключная серыя.
09.30 "Добры дзень, доктар!".
10.00 Відавочнік прадстаўляе: самае смешнае".
10.55 "Вялікі сняданак".
11.30 "Каханне Маё". Камедыйны серыял.
12.30 "Аўтапанарама".
13.00 Фільм "Старэйшы сын". СССР, 1975 г.
15.30 "Культурнае жыццё".
16.00 "Прыватныя гісторыі".
16.30 "24 гадзіны".
16.50 "Уваскрэсенне класікі".
18.00 "Фантастычныя гісторыі".
19.00 "Аўтапанарама".
19.30 "Тыдзень". Інфармацыйна-аналітычная праграма.
20.30 Фільм "Маё вясёлае жыццё". ЗША-Вялікабрытанія, 1999 г.
22.25 "Спартыўны тыдзень".
22.45 "Сусветны бокс".
23.35 "Поўня". Серыял. Заключная серыя.

08.10 Дабравест.
08.40 Мір вашай хаце.
08.50 Бухта капітанаў.
09.30 Наша пяцёрачка.
10.00 Фільм-казка "Як Іванка-дурылка за цудам хадзіў" (СССР).
11.30 Медычныя таямніцы.
12.00 Сезон ля дачы.
12.35 "І зноў рану сэрца кранаючы..." Маналогі аб вайне.
12.50 Пасоўванне+.
13.10 "Сярод сваіх родных і блізкіх". Алег Янкоўскі.
13.35 Прэм'ера. Псіхалагічны дэтэктыў "Танец гарнастая" (Расія). 1-4 серыі.
16.55 Камедыйны серыял "Дурнушка Бэці-2" (ЗША).
18.30 Эксцэнтрычная камедыя "На колах" (Германія).
20.30 Тэлебарометр.
20.50 Экспедыцыя.
21.20 "І зноў рану сэрца кранаючы..." Маналогі аб вайне.
21.30 "Вялікае сэрца".
22.00 Авантурная камедыя "Невыносная жорсткасць" (ЗША).
23.45 "Правы чалавека".
00.00 Свая музыка.
00.25 Пасоўванне+.

06.50 "Печкі-лавачкі" Лідзіі Шукшыной". Дакументальны фільм.
07.35 Фільм "Боты ўсмятку".
09.00 Фільм "Перад світанкам".
10.30 "Смехапанарама".
11.00 Весткі.
11.10 "Сам сабе рэжысёр".
12.00 "Месяц. Сакрэтная зона".Дакументальны фільм.
13.00 Тэлесерыял "Каменская".
14.00 Весткі.
14.20 Музычны фільм "31 чэрвеня".
16.55 "Смяяцца дазваляецца". Гумарыстычная праграма.
18.20 "Сумленны дэтэктыў".
19.00 Весткі тыдня.
20.05 "Танцы з Зоркамі". Гала-канцэрт.
22.30 Фільм "Тры паўграцыі".
00.45 Фільм "Палюбоўнік".
02.30 Заканчэнне эфіру.

07.40 Мультфільм.
08.00 Сёння.
08.15 "Дзікі свет".
08.45 "Іх норавы".
09.25 " Ямо дома!".
10.00 Сёння.
10.20 "Выратавальнікі".
10.50 "Прафесія-рэпарцёр".
11.20 "Авіятары".
11.55 "Дачны адказ".
13.00 Сёння.
13.20 "Крамлёўскія пахаванні".
14.15 Прыгодніцкая фантастыка "Таямніцы Бярмудскага трыкутніка". Фільм 3.
16.00 Сёння.
16.30 "Барацьба за ўласнасць".
17.05 Дэтэктыўны серыял "Закон і парадак. Злачынны намер".
19.00 Сёння. Выніковая праграма.
19.55 "Чыстасардэчнае прызнанне".
20.25 "Надзвычайнае здарэнне".Агляд за тыдзень.
21.00 "Галоўны герой".
22.10 Крымінальная драма "Зман".
00.05 Фантастычны трылер "Незабыўнае".

09.30 Ралі. Чэмпіянат свету. Польшча. Дзень 2.
10.00 Супербайк. Чэмпіянат свету. Суперпоул. Вялікабрытанія.
10.30 "Еўраспорт за чыстую планету". Часопіс.
11.00 Веславанне на байдарках і каноэ. Чэмпіянат Еўропы на гладкай вадзе. Германія. Дзень 4.
12.00 Веславанне на байдарках і каноэ. Чэмпіянат Еўропы на гладкай вадзе. Германія. Дзень 3.
13.00 Плаванне. Міжземнаморскія гульні. Пескара (Італія). Дзень 1.
14.00 Супербайк. Чэмпіянат свету. Вялікабрытанія. Заезд 1.
15.00 Суперспорт. Чэмпіянат свету. Вялікабрытанія.
16.00 Формула-2. Чэмпіянат свету. Спа-Франкашам (Бельгія). Гонка 2.
17.00 Супербайк. Чэмпіянат свету. Вялікабрытанія. Заезд 1.
17.30 Супербайк. Чэмпіянат свету. Вялікабрытанія. Заезд 2.
18.30 Мотаспартыўны часопіс.
18.45 Плаванне. Міжземнаморскія гульні. Пескара (Італія). Дзень 2.
21.00 Веславанне на байдарках і каноэ. Чэмпіянат Еўропы на гладкай вадзе. Германія. Дзень 4.
21.30 Бокс. Паядынак за тытул Чэмпіёна Еўропы. Германія.
23.30 Ралі. Чэмпіянат свету. Польшча. Дзень 3.
00.00 Супербайк. Чэмпіянат свету. Вялікабрытанія. Заезд 1.
00.30 Суперспорт. Чэмпіянат свету.
01.00 Супербайк. Чэмпіянат свету. Вялікабрытанія. Заезд 2.
01.45 Мотаспартыўны часопіс.
02.00 Ралі. Чэмпіянат свету. Польшча. Дзень 3.

18.00 Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
18.15 «Элі Макбіл», тэлесерыял.
19.05 МакраФон: «Рок па вакацыях–1996», канцэрт.
19.55 Форум (ток-шоу): Каму служыць беларускі чыноўнік.
20.40 Хто ёсць кім: «Бард і літаратар Міхаіл Валодзін. Тут мой дом».
21.00 Аб'ектыў (вынікі тыдня).
21.20 Гісторыя пад знакам Пагоні: «Гедзімін» (спазнаваўчая праграма).
21.25 Акно ў Еўропу (інфармацыйная праграма).
21.55 Фільматэка майстроў: «Чалавечая прырода», маст. фільм, 2001 г., ЗША.
23.40 Аб'ектыў.

ШАНОЎНЫЯ ЧЫТАЧЫ!

Газета «Новы час» працягвае падпіску на 2009 год. Падпісацца на выданне можна на перыяд ад 1 месяца да 1 года праз пошту або праз банк.

Падпіска на «Новы час» праз пошту

1. Выразаем купон.
2. На ПАШТОВЫМ ПЕРАВОДЗЕ пішам суму грашовага пераводу ў лічбах і прапісам.
3. У графе «Ад каго» пішам прозвішча, імя, імя па бацьку.
4. Ніжэй указваем адрас.
5. Ідзем на бліжэйшае паштовае аддзяленне і здзяйсняем паштовы перавод.
6. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
7. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

Министерство связи и информатизации
Республики Беларусь
№ _____ (по реестру ф. 11)
№ _____ (по реестру ф. 10)

ПРИЕМ

Предоплата за доставку г-ты "Новы час"

Наименование предприятия связи, к - гербовая печать	Календарный шт. места подачи	№ по ф. 5	Сумма, вид услуги, подпись оператора

ПОЧТОВЫЙ ПЕРЕВОД на _____ руб.
(сумма прописью)

Кому / Куда: Г-та "Новы час", р/с 3012211080010 фил. МГДОАО "Белинвестбанк", код 153001764, УНН 190790926 г. Минск, ул. Коллекторная,11

От кого _____

Адрес _____
(почтовый индекс и подробный адрес)

ИСПРАВЛЕНИЯ НЕ ДОПУСКАЮТСЯ

Падпіска на «Новы час» праз банк

1. Выразаем купон.
2. Пішам прозвішча, імя, імя па бацьку і адрас.
3. Указваем суму аплаты.
4. Ідзем у адзяленне банка і здзяйсняем пералік грошай.
5. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
6. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

ИЗВЕЩЕНИЕ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
МГД ОАО «Белинвестбанк» г. Минск
(наименование банка)

Счет получателя: 3012211080010 Лицевой счет: Код 764
УНП*: 190790926

(фамилия, имя, отчество, адрес)

Вид платежа			Дата	Сумма
Предоплата за июль, август, сентябрь 2007 г. (Ненужное зачеркнуть)				

Плательщик

Пеня _____
Всего _____

Кассир

КВИТАНЦИЯ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
МГД ОАО «Белинвестбанк» г. Минск
(наименование банка)

Счет получателя: 3012211080010 Лицевой счет: Код 764
УНП*: 190790926

(фамилия, имя, отчество, адрес)

Вид платежа			Дата	Сумма
Предоплата за июль, август, сентябрь 2007 г. (Ненужное зачеркнуть)				

Плательщик

Пеня _____
Всего _____

Кассир

ЦІКАВА

ВАЙНА ЗА “НАЦЫЯНАЛЬНЫ КАМПАНЕНТ”

Алег Новікаў

Акрамя Рэспублікі Беларусь апошнім часам выклік Крамлю кінула і іншая РБ — Рэспубліка Башкірыя.



Беларусь і Башкірыя падобныя не толькі абрэвіятурамі сваіх афіцыйных назваў. Напрыклад, не так даўно прэзідэнт Мядзведзеў папярэдзіў башкірскія ўлады, каб яны са сваім малаком не лезлі на рынкі суседзяў (Башкірыя найбольш буйны вытворца малака сярод рэгіёнаў РФ).

Аднак, натуральна, галоўнае, у чым падобныя абедзве РБ, — крытычная сітуацыяй з правамі чалавека. Так, слова “Благавешчанск” стала ў Расіі ўжо хадзячай назвай. У гэтым башкірскім гарадку АМАП колькі гадоў таму правёў масавую зачыстку. Лічыцца, што такім чынам гараджанам адпомсцілі за тое, што яны абралі не таго, каго трэба. У краі фактычна няма незалежнай прэсы, а ў афіцыёзе ўсе дасягненні прыпісваюцца Муртазе Рахімаву, прэзідэнту рэспублікі.

Рахімаў амаль 20 гадоў свайго кіравання знаходзіў кампраміс з цэнтрам. Аднак апошнім часам адносіны сталі вельмі кепскімі. Уфа дазваляе сабе вельмі вострыя шпількі наконт унутранай палітыкі федэральнага ўраду і адміністрацыі. Як жартуе расійская прэса, Рахімаў у нечым нават пераплюнуў Каспарава і Лімонава. Аднак ад гэтых палітыкаў, якія лічаць сябе лібераламі, Рахімаў моцна адрозніваецца. Ён крытыкуе Крэмль з платформы башкірскага нацыяналізму. Кажа, што назіраецца тэндэнцыя ліквідацыі інстытутаў башкірскай дзяржаўнасці і культуры.

Муртаза Рахімаў мае рацыю. Расійскі ўрад апошнім часам пачаў наступ на правы нацменшасцяў.

Па-першае, як ужо пісаў “НЧ”, прыняты федэральны закон № 309, адпаведна якому з навучальных праграм прыбіраецца так званы “нацыянальна-рэгіянальны кампанент” (прадметы па вывучэнню мовы і культуры тытульнай нацыі аўтаноміі). Трохі раней Мінадукацыі запатрабавала, каб дзяржаўная выніковая атэстацыя ў школах па ўсіх прадметах праходзіла на рускай мове. Самае цікавае, што такой практыкі не было нават у СССР, тады ў школах захоўвалася выкладанне на башкірскай або татарскай мовах.

Апошняя навіна з фронту барацьбы Масквы з сепаратызмам рэгіёнаў — патрабаванне ад парламентаў Башкірыі, Татарстана і Якуціі тэрмінова ўнесці змены ў свае канстытуцыі, а дакладней, прыбраць пункт аб суверэнітэце сваіх нацый.

Нельга сказаць, што аўтаноміі маўчаць. Прэзідэнт Татарстана Шаймієў уступіў у адкрытую перапалку з кіраўніком Мінадукацыі, назваўшы закон пра “кампанент” актам асіміляцыі. Аднак да Рахімава яму далёка.

У інтэрв’ю “*Московскому комсомольцу*” Рахімаў абвінавацiў вядучую крамлёўскую партыю “Адзіная Расія” ў цэнтралізацыі і адыходзе ад прынцыпаў дэмакратыі. “У нас усё насаджваецца зверху. Узровень цэнтралізацыі горшы, чым у савецкія часы”, — сказаў башкірскі прэзідэнт. А вось цытата з ягонага выступу на Асамблеі народаў Башкірыі:

“Мы паслядоўна будзем абараняць прынцып федэрацыі і катэгарычна адмаўляем спробы рэанімацыі імперскіх і унітарных падыходаў”.

Яшчэ весялей чытаць афіцыйныя сайты башкірскага ўраду: “На старонках цэнтральных газет, каналах цэнтральнага тэлебачання ўзмацняюцца атакі на лідэраў нацыянальных рэспублік, ігнаруюцца іх вялікія заслугі ва ўмацаванні асноў федэральнай дзяржавы. У абарот запушчаны тэрмін “этнакраты”, якія быццам захапілі ўладу ў рэспубліках і 19 гадоў таму абвясцілі аўтаномію”.

Больш таго, Рахімаў выдаў карт-бланш мясцовым нацыяналістам. Па меры ўзмацнення канфрантацыі з Масквой у рэспубліцы актывізавалася групоўка “Кук Бурэ” (“Нябесныя ваўкі”). “Кук Бурэ” — відавочная калька назвы турэцкай радыкальнай арганізацыі “Шэрыя ваўкі”.

У галоўным дакуменце “Кук Бурэ” гаворыцца, што башкіры павінны стаць гаспадарамі на сваёй зямлі. Галоўную ролю ў рэалізацыі гэтага праграмнага пункту мусіць адыграць башкірская моладзь. У саміх дакументах і матэрыялах арганізацыі шмат цікавых пасажаў. Напрыклад: “Наша арганізацыя супраць асіміляцыі башкір… У нашу арганізацыю не будуць прымацца башкіры, якія заключылі шлюб з прадстаўніком іншай нацыі. Чалавек, які не закахаўся ў башкірку, каб заключыць з ёй шлюб, не любіць свой народ і да яго няма даверу… Павінны быць цэлыя мікрараёны, дзе жывуць выключна башкіры, гучыць башкірская мова. Мы адсочваем, каб да кожнага башкіра ставіліся з павагай. Калі да нас даходзіць інфармацыя пра тое, што нехта крыўдзіць башкіра, мы дапамагаем пакрыўджанаму... Святкаванне 450-й гадавіны ўваходжання Башкірыі пад пратэктарат Расійскай імперыі — гэта ганьба!” І самы галоўны пункт: “У цяперашні час “Кук Бурэ” не падтрымлівае ідэю выхаду башкір са складу Расійскай Федэрацыі. Адначасова мы не можам выключаць формаў самавызначэння ў выпадку сістэматычнага парушэння цэнтрам нацыянальнага суверэнітэту башкірскага народу”.

Нягледзячы на яўна экстрэмісцкі характар установак “Кук Бурэ”, групоўка змагла правесці нават вулічную акцыю (практычна нерэальная з’ява ў рахімаўскай Башкірыі). Прыкладна 150 маладых людзей патрабавалі надаць аўтаноміі права самім абіраць сваіх кіраўнікоў.

Відавочна, што да стварэння “Нябесных ваўкоў” прыклалі руку ўлады. У прынцыпе, ход зразумелы: калі не мы, будзеце мець справу з такімі “адмарозкамі”.

Таксама няма сумневу, што Рахімавым кіруе страх згубіць пасаду прэзідэнта (кажуць, што адпаведны дакумент у Маскве ўжо падпісаны). Гульня ў нацыяналізм прымушае Крэмль быць больш асцярожным з башкірскім прэзідэнтам, гарантаваць яму ўдзел у прыняцці кадравых рашэнняў.

Пакуль рэакцыя цэнтру на такія відавочна дысідэнцкія крокі жорсткая. Рахімаву прыгразілі выключэннем з партыі “Адзіная Расія”.

Гульня ў нацыяналізм, якую вядзе Рахімаў, на самай справе вельмі небяспечная. Башкірскія медыя, матэрыялы якіх супярэчаць цэнтральным, фактычна падрываюць адзіную інфармацыйную прастору і ўносяць у масавую свядомасць элемент нестабільнасці. Працэсамі ў Башкірыі вельмі цікавяцца суседнія татары. Лунае ідэя стварэння канфедэрацыі абодвух народаў для барацьбы за захаванне так званага “кампаненту”.

Нарэшце, у гэтым годзе рэспубліка гучна і шырока святкуе 90-ю гадавіну стварэння Башкірскай АССР, якая стала падмуркам дзяржаўнасці башкір. Было б вельмі дзіўна святкаваць юбілей адраджэння дзяржаўнасці і адначасова глядзець, як нацыю пазбаўляюць права вучыцца на роднай мове.

ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

Мінск крыўдуе на Расію за рост коштаў на газ. А Масква на Беларусь — за ўсё больш актыўныя спробы супрацоўніцтва з Захадам.

“Reuters” (Вялікабрытанія)

Канфлікт з-за малочных прадуктаў значна ўскладніў расійска-беларускія адносіны. Расія цісне на Беларусь за непадпарадкаванне загадам Масквы. Адзін з чыннікаў — адмова Мінска прызнаць Абхазію і Паўднёвую Асецію. Расійскі бок, у сваю чаргу, адмаўляецца прызнаваць, што такія ўмовы наогул існуюць. Нягледзячы на далучэнне краіны да праграмы ЕС «Усходняе партнёрства», у Лукашэнкі ўсё яшчэ не занадта шмат прыхільнікаў у заходніх краінах. Там беларускага кіраўніка па-ранейшаму крытыкуюць за парушэнне правоў чалавека і дэспатычны кантроль у палітыцы.

“The New York Times” (ЗША)

Пасля таго, як Мінск адмовіўся ад удзелу ў пасяджэнні АДКБ у Маскве, Лукашэнка паспрабуе аддаліцца ад свайго расійскага суседа, пазбавіцца ад іміджу недэмакратычнага лідэра і зблізіцца з ЕС.

Італьянскае бюро «Euronews» (Італія)

У сувязі з крызісам, які закрануў эканоміку Беларусі, краіна мае вельмі сумныя перспектывы. Пачатая Масквой «малочная вайна», новыя цвёрдыя правілы імпарту ставяць Беларусь у вялікую залежнасць ад Крамля. Як кажуць у кулуарах, шанцы Беларусі пазбегнуць эканамічнага краху надзвычай нізкія.

“Volkskrant” (Нідэрланды)

Раней гэта вырашалася досыць спакойна. І, між іншым, дарма, таму што, па-першае, усе выказванні на тэму таго, што беларускія прадукты каштуюць танней, чым нашы, — гэта няпраўда. Варта адзначыць, што мы таксама дзеля Мінскага трактарнага завода фактычна давялі да банкруцтва некалькі расійскіх заводаў. І тут паўстала пытанне пра тое, што нашы малочныя заводы ва ўмовах крызісу таксама спыняцца. Проста Расія перастала прабачаць Беларусі некаторыя вольнасці. Трэба прайсці сертыфікацыю, і ўсё. А тое, што на гэта заплюшчвалі вочы, — вось гэта і ёсць палітыка.

“Regnum” (Расія)

Магчыма, што гэта свядомая пазіцыя Мінска: узяць курс на Захад. Наўрад ці гэта добра як для Расіі, так і для самой Беларусі. Чаму? З аднаго боку, Беларусь моцна залежыць ад паставак прадукцыі ў Расію, прыкладна палова таваразвароту рэспублікі прыходзіцца на нашу краіну. Нават калі Еўрасаюз і асабіста Папа Рымскі паабяцалі Аляксандру Лукашэнку пачаць купляць беларускія тавары, гандлёвы канфлікт з Расіяй ставіць пад удар палову беларускай эканомікі. А значыць, і палітычную стабільнасць у гэтай краіне.

“Известия” (Расія)

У выпадку прызнання Паўднёвай Асеціі і Абхазіі Беларусь не толькі маментальна пазбавіцца заходніх крэдытных ліній, але і патрапіць у амаль поўную залежнасць ад Расіі.

“Газета.ру” (Расія)

Праблема ў тым, што ў Беларусі прарасійскіх палітычных сіл няма. У 1997 годзе Лукашэнка наўмысна задушыў усе арганізацыі прарасійскай скіраванасці. І новых з тых часоў не з’явілася. Таму казаць, што хтосьці мог бы прадстаўляць інтарэсы народаў праз тэзіс сяброўства з Расіяй, не даводзіцца. Такіх структур у Рэспубліцы Беларусь няма.

“Взгляд” (Расія)

МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

УКРАІНА. БУМ ПРАСТЫТУЦЫІ

На думку заходніх журналістаў, якія працуюць ва Украіне, наша паўднёвая суседка ніколі ў гісторыі не перажывала такі бум прастытуцыі. Сітуацыя і раней была вельмі складаная. Аднак, як сцвярджае аўтарытэтнае выданне "Christian science monitor", за час крызісу гэты сектар вырас удвая. Галоўныя фактары крызісу — інфляцыя мясцовай валюты і беспрацоўе. Прававы аспект праблемы заключаецца ў тым, што нават у выпадку арышту прадстаўніцам самай старажытнай прафесіі пагражае максімум штраф памерам у 6–35 долараў ЗША. Што да іх кліентаў, то яны ўвогуле не могуць быць прыцягнутыя да адказнасці. Юрый Луцэнка, міністр унутраных спраў, у закліку да нацыі канстатаваў, што краіна ператварылася ў рай для сексуальных турыстаў. Мясцовая грамадская арганізацыя *FEMEN* называе жудасныя лічбы: 67 працэнтам жанчын у Кіеве ва ўзросце ад 17 да 22 гадоў іншаземцы прапанавалі заняцца прастытуцыяй. Кульмінацыя чакаецца падчас футбольнага турніру Еўра–2012, калі ў краіну нахлыне плынь турыстаў.

Па матэрыялах "Christian science monitor" (ЗША)

АЗЕРБАЙДЖАН. КРАІНА СВЯТКУЕ ВЯРТАННЕ ДА ЎЛАДЫ АЛІЕВА

15 чэрвеня Азербайджан адсвяткаваў экзатычнае з пункту гледжання іншаземцаў свята. Азербайджанцы святкавалі Дзень нацыянальнага выратавання. Менавіта 15 чэрвеня 1993 года пачалося вяртанне ва ўладу Гейдара Аліева (былога лідэра кампартыі, якога пазбавіў улады Народны Фронт). Цікава чытаць афіцыйныя матэрыялы, прысвечаныя значэнню гэтай даты. Вось як апісваюцца часы, калі краінай кіраваў Народны Фронт: "У краіне назіраўся хаос. Баку фактычна кіравалі бандыцкія групоўкі. Людзі не маглі спаць спакойна з-за перастрэлак паміж групоўкамі. Гора-кіраўнікі таго перыяду трымалі ў гатоўнасці свае самалёты, каб збегчы з краіны. Дзяржавы фактычна не існавала. Адзінай надзеяй быў Гейдар Аліеў. Цяпер наш народ упэўнена крочыць наперад у накірунку бліскучай будучыні. Кожная дзіця радзімы і народ удзячныя геніяльнаму выратавальніку Гейдару Аліеву — Атацюрку нашай Айчынны".

Па матэрыялах "Day.az" (Азербайджан)

ТУРЦЫЯ. ЗВОЛЬНЕНЫ ФУТБОЛЬНЫ СУДДЗЯ-ГОМАСЕКСУАЛІСТ

Прыхільнікі тэзісу пра тое, што Турцыі яшчэ рана ў склад ЕС, атрымалі новы аргумент. Анкара парушае правы геяў, якія прызнаюцца еўрапейцамі. Футбольная федэрацыя Турцыі забараніла 33-гадоваму Халілу Ібрагіму суддзіць спаборніцтвы ў вышэйшай лізе турэцкага чэмпіянату з-за яго нетрадыцыйнай сексуальнай арыентацыі. Выпадак ператварыў Халіла ў сімвал барацьбы турэцкіх гомасексуалістаў за свае правы. Атрымаўшы воўчы білет, былы рэферы нават звярнуўся да сваіх калег з тэлевізійнага экрану з заклікам да суддзяў праявіць салідарнасць. Хаця ролік паказалі па цэнтральнаму каналу, эфекту ён не меў. Цікава, што ў Турцыі няма законаў, якія забараняюць геям займацца тымі ці іншымі прафесіямі. Шматлікія мясцовыя артысты падчас шоу адкрыта даюць зразумець, што яны цікавяцца не жанчынамі. Больш таго, у мінулым годзе Вярхоўны суд палічыў, што суд ніжэйшай інстанцыі дапусціў памылку, забараніўшы асацыяцыю пад шматзначнай назвай "Лямбда". Аднак да свету футболу гэтыя тэндэнцыі, здаецца, яшчэ не дайшлі.

Па матэрыялах "Le Monde" (Францыя)

ГЕРМАНІЯ. КАНЕЦ АДНОЙ УТОПІІ

Кіраўніцтва фракцыі партыі "Вольныя выбаршчыкі" ў баварскім парламенце выключыла са сваіх шэрагаў старшыню — Габрыэле Паўлі. Навіна цікавая для тых, хто сцвярджае, што з-за крызісу і змены вытворчай парадыгмы (прыход мяккіх тэхналогій) выбаршчыкі адмовяцца ад традыцыйных партый кшталту эсдэкаў або хрысціянскіх дэмакратаў. Менавіта пра такую бліскучую будучыню марылі "Вольныя выбаршчыкі". Схема партыі наступная: людзі фармуюць напярэдадні выбараў платформу без усялякіх ідэйных забабонаў, але якая абяцае нешта канкрэтнае, важнае для камуны. Напрыклад, пабудаваць у двары дзіцячую пляцоўку. Такога кшталту ініцыятывы існуюць з пачатку 1970-х і ўжо давялі сваю эфектыўнасць. На мясцовых выбарах за іх галасуюць часам да 5 працэнтаў. Аднак сапраўдны фурор "Вольныя выбаршчыкі" зрабілі ў мінулым годзе ў Баварыі, дзе іх спіс атрымаў 10 працэнтаў. І яны вырашылі пайсці на еўрапейскія і нацыянальныя выбары, аднак прайгралі. Аказалася, што грамадства цікавяць не толькі дзіцячыя пляцоўкі. На чэрвеньскіх выбарах у парламент ЕС "Вольныя выбаршчыкі" атрымалі 1,7 працэнта. Гэта і стала прычынай адстаўкі Габрыэле. Дарэчы, апошняя ўжо заявіла, што на восеньскіх выбарах у Бундэстаг будзе балатавацца самастойна.

Па матэрыялах "Tageszeitung" (Германія)

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

УСЁ ПРАПАЛА!

Алег Пятроў

Старыя чуткі пра фармаванне неверагоднай кааліцыі паміж Блокам Юліі Цімашэнка (БЮТ) і Партыяй рэгіёнаў (ПР) Віктара Януковіча ледзь не сталі рэальнасцю. Аднак у апошні момант умяшалася дзіўная сіла.

Спекуляцыі пра перамовы паміж БЮТ і Партыяй рэгіёнаў хадзілі з пачатку красавіка. Саму ідэю стварэння ПР+БЮТ (ПР плюс БЮТ) спачатку шмат хто ўспрымаў як нешта з галіны фантастыкі. Больш антаганістычных партый на Украіне, мабыць, няма. У сваю чаргу, прадстаўнікі

абедзвюх партый каментавалі магчымасць з'яўлення такога блоку вельмі асцярожна.

Так ці інакш, з самага пачатку стала зразумела, што БЮТ і "рэгіяналы" арганізуюць нешта большае, чым парламенцкую кааліцыю. Мова ішла пра тое, каб стварыць цалкам новую палітычную сістэму, якая б пасавала выключна партыям — удзельніцам кааліцыі. Кажучы прасцей, прыняць новую канстытуцыю. Нагадаем, што, адпаведна цяперашняму Асноўнаму закону, прыняць новую канстытуцыю могуць дэпутаты Вярхоўнай Рады. ПР і БЮТ маюць самыя буйныя фракцыі, што фактычна гарантавала б поспех.

2 чэрвеня прадстаўнік фракцыі БЮТ пафасна паведаміў з трыбуны: "Сёння існуе гістарычны шанец пакласці канец расколу Украіны. У нас ёсць лекі ад хваробы. Імя ім — шырокая кааліцыя". Ён таксама адзначыў, што адной з задач кааліцыі БЮТ+ПР ёсць унясенне змен у канстытуцыю.

Хутка публіцы прадставілі праект новага Асноўнага закона. Тэкст выклікаў супярэчлівыя каментары. У законе прысутнічалі відавочна антыдэмакратычныя нормы, ствараласяўражанне, што канстытуцыя напісаная выключна для БЮТ і "рэгіяналаў". Астатнім палітычным сілам там папросту не знаходзілася месца.

Такім чынам, Украіна павінна была ператварыцца з прэзідэнцка-парламенцкай у парламенцкую рэспубліку. Аўтары праекту меркавалі, што кіраўніка дзяржавы будзе абіраць Вярхоўная Рада. Тэрмін прэзідэнцкай кадэнцыі — 5 гадоў.

Прэзідэнт пры гэтым пазбаўляўся рычагоў кантролю за дзейнасцю прэм'ера і магчымасці спыняць нарматыўныя акты ўрада. Адначасова ў яго заставаўся кантроль за кіраўнікамі сілавых ведамстваў і права датэрміновага роспуску парламента. Праўда, калі для гэтага былі выключныя падставы.

Што да канкрэтнага падзелу пасад, то ён выглядаў наступным чынам: Юлію Цімашэнка чакала пасада прэм'ера, а Віктара Януковіча — прэзідэнта. А каб Партыя рэгіёнаў не лічыла, што яе кінулі, падсунуўшы крэсла

прэзідэнта з мікраскапічнымі паўнамоцтвамі, бела-сінім прапанавалася палова партфеляў ва ўрадзе.

Нарэшце, канстытуцыйная рэформа прадугледжвала падаўжэнне паўнамоцтваў цяперашняга парламента да 2014 года. У тым жа годзе павінны былі адбыцца наступныя прэзідэнцкія і парламенцкія выбары.

Фармаванне парламента, на думку БЮТ і Партыі рэгіёнаў, мусіла праходзіць вельмі арыгінальна — у два туры. Спачатку палітычныя партыі спаборнічаюць за выхад у фінал. Тыя, якія занялі першае і другое месца, праходзяць у другі тур; партыя, якая перамагла ў другім туры, аўтаматычна атрымлівае 50 працэнтаў плюс 1 месца ў Вярхоўнай Радзе. Астатнія партыі дзеляць месцы меншасці прапарцыйна сваім вынікам у першым туры. Другі тур не будзе праводзіцца, калі якая-небудзь партыя набярэ ў першым туры колькасць галасоў, якая дазволіць ёй атрымаць большасць дэпутацкіх мандатаў (мінімум 226 з 450).

Такая схема гарантуе, што ў парламенце і мясцовых радах больш не будзе праблемаў з тым, каб сфармаваць большасць. Гэта ў сваю чаргу дазволіць хутка абіраць кіруючыя і выканаўчыя органы, больш аператыўна рэагаваць на цякучыя праблемы.

Важны момант зменаў — устанаўленне дыктатуры ўнутры партый. Праект прапануе ўвесці цвёрды імператыўны мандат. Гэта значыць, паўнамоцтвы народнага дэпутата спыняюцца датэрмінова ў выпадку яго выключэння з фракцыі. Гэта рашэнне нельга аспрэчыць у судовым парадку.

Законапраект таксама прапануе правесці глыбокую рэформу судовай сістэмы. Кіраўніцтва дзейнасцю судоў перадаецца Дзяржаўнай судовай адміністрацыі — калегіяльнаму органу са складаным парадкам прызначэння сяброў. Гэта, на думку аўтараў ідэі, зводзіць да мінімуму магчымасць кантролю якой-небудзь палітычнай сілы над дзейнасцю Феміды.

Савет бяспекі як сталы дарадчы орган, дэ-факта падкантрольны прэзідэнту, прапануецца скасаваць. Уводзіцца адказнасць прэсы за публікацыю ілжывай інфармацыі.

Можна было прагназаваць, што праект не выкліча ў Юшчанкі вялікага захаплення. Ён назваў яго замахам на дзяржаўны лад. Пагражаў роспускам Вярхоўнай Рады і г.д.

Між тым, нішто цяпер фармальна не замінала БЮТ і ПР сфармаваць кааліцыю і пачаць дэбаты па новай канстытуцыі. Больш таго, працэс стварэння кааліцыі быў завязаны на ідэі канстытуцыйнай рэформы: у выпадку, калі яе не паспелі б прыняць у двух чытаннях, лідэры абедзвюх партый павінны былі адмовіцца ад аб'яднання. Аднак тут адбылося нечаканае.

Віктар Януковіч, памаліўшыся ў Трапезным храме Кіева-Пячорскай лаўры, паведаміў журналістам, што прыняў рашэнне спыніць далейшыя перамовы наконт кааліцыі з БЮТ.

"Падчас перамоў мне стала відавочным, што нават пры гатоўнасці ўсіх удзельнікаў да сур'ёзных кампрамісаў, шырокая кааліцыя сутыкнецца з шэрагам праблем, якія хутка вырашыць не атрымаецца", — заявіў Януковіч.

Адказу Юліі Цімашэнка прыйшлося чакаць некалькі гадзін. Гэтак жа, як і Януковіч, Юлія Уладзіміраўна распавяла, што яна прыкладала ўсе намаганні для аб'яднання краіны перад тварам эканамічнага крызісу, у тым ліку гатова была пайсці нават на перамовы з апазіцыяй. "На жаль, сёння Віктар Януковіч паставіў на іх кропку", — паведаміла яна.

Што за муха ўкусіла Віктара Фёдаравіча? Гэта галоўнае пытанне для ўсіх палітолагаў. У любым выпадку, Януковіч згуляў добрую партыю. Флірт Юліі з Партыяй рэгіёнаў яшчэ больш панізіў рэйтынг яе папулярнасці на Захадзе краіны, садзейнічаў расколу аранжавага электарату. Акрамя таго, Цімашэнка таксама будзе вымушана самастойна несці цяжкі крыж адказнасці за эканамічную сітуацыю да наступных выбараў.

Гісторыя з правалам праекта мела цікавы і сімвалічны фінал. Падчас запісу на ТБ каментара прэм'ера наконт выхаду Партыя рэгіёнаў з перамоўнага працэсу, на экране суфлёра нечакана знік тэкст прамовы. "Усё прапала!" — эмацыянальна вырвалася ў палітыка ў той момант. Выпадкова гэты ролік з тым: "Усё прапала!" пайшоў у эфір. Народ, натуральна, нічога не ведаў пра непаладку апаратуры на студыі і зразумеў Юлію літаральна.

КІНО

ХУТКА НА ЭКРАНАХ

Іван Біч

Летні час для аматараў кіно — самы гарачы сезон. У гэты час Галівуд выпускае на экраны свае хіты, робячы стаўку на дзяцей, якім на канікулах няма чаго рабіць, і людзей у адпачынку (ім таксама сумна ўвесь час валяцца на пляжы). Галоўнымі карцінамі лета 2009 года, па версіі брытанскага выдання "Guardian", абяцаюць стаць наступныя фільмы.

"Трансформеры. Помста паўшага" (Transformers: Revenge of the Fallen). Рэжысёр Майкл Бэй. Прэм'ера адбудзецца 19 чэрвеня.

Для тых, хто не ведае, трансформеры — гэта вялікія робаты, якія могуць ператварацца (трансфармавацца) у рознага кшталту бытавыя электрычныя прылады. Увогуле, машыны жывуць недзе ў космасе, аднак планета Зямля іх (асабліва нядобрых трансфармераў) вельмі цікавіць. Тут быў забіты іх былы лідэр Мегатрон. Таму кепскія трансформеры час ад часу спрабуюць адрадзіць Мегатрона, што патрабуе знішчэння ўсяго чалавецтва. Аднак акрамя злых трансфармераў ёсць трансформеры добрыя, якія запісаліся ў саюзнікі да зямлян. У другой серыі сагі "Трансформеры" (першая выйшла год таму) робатам зноў давядзецца мерыцца сілай. Пры гэтым яны абавязкова разбураць усё навокал (дамы, масты, заводы і г.д.), што не можа не шакаваць публіку ў зале.

"Ворагі грамадства" (Public Enemies). У рускім перакладзе будзе ісці пад назвай "Джоні Д.". Рэжысёр Майкл Манн. Прэм'ера пройдзе 1 ліпеня.

Фільм — экранізацыя дакументальнай стужкі "Ворагі грамадства. Самая вялікая хваля злачынства ў ЗША і нараджэнне ФБР", які быў зняты ў далёкім 1934 годзе. Сюжэт крымінальнай драмы наступны: Мелвіс Первіс, агент ФБР, па персанальнаму заданню прэзідэнта Эдварда Гувера павінен знішчыць гангстэра Джона Дзілінджэра (такі сапраўды існаваў). Злачынцу іграе Джоні Дэп.



"Ледавіковы перыяд–3: Канец дыназаўраў" (Ice Age 3: Dawn of the Dinosaurs). Студыя: Blue Sky. Прэм'ера адбудзецца 1 ліпеня.



Адзін з самых паспяховых галівудскіх анімацыйных праектаў, разлічаных на сямейны прагляд. Героі "Ледавіковага перыяду" падабаюцца як дзецям, так і дарослым. Галоўны персанаж — вавёрка Скрэт — зноў стаў прычынай глабальных катаклізмаў на планеце: у вечнай пагоні за сваім арэхам ён адчыняе праход у жудасны свет дыназаўраў. Акрамя таго, за тым жа арэхам ганяецца ягоны канкурэнт.

"Бруна" (Bruno). Рэжысёр Саша Барон Коэн. Прэм'ера чакаецца 9 ліпеня.

Арнольд Шварценегер — не адзіны аўстрыец, які заваяваў Галівуд. Другім гарантавана стане аўстрыйскі журналіст з нетрадыцыйнай сексуальнай арыентацыяй Бруна. Па ходу фільму Бруна робіць рэпартажы з розных гарадоў свету. Пры гэтым светапогляд гламурнага гея спрабуе пераварыць такія складаныя пытанні, як канфлікт арабаў і яўрэяў або жаночая мода.



"Гары Потэр і Прынц-паўкровак" (Harry Potter and the Half-Blood Prince). Рэжысёр Дэвід Йетс. Прэм'ера — 15 ліпеня.

Мы набліжаемся да заканчэння прыгод Гары Потэра. У перадапошняй частцы ён ужо не хлопчык, а юнак. Тым лепш, паколькі Цёмны Лорд пачынае новую, яшчэ больш вычварную, чым раней, інтрыгу. Увогуле, сюжэт фільма даўно вядомы па кніжцы. Усе ведаюць, што Дамблдора — рэктара Ховарда — у фінале заб'юць. Аднак калі ты ўжо паглядзеў папярэднія пяць фільмаў пра прыгоды Гары, абавязкова пойдзеш і на шосты.

"Захоп Пелхама 123" (The Taking of Pelham 123). Рэжысёр Тоні Скот. Прэм'ера — 24 ліпеня.

"Захоп Пелхама 123" — рэмейк фільма 1974 года. Тая карціна лічыцца культавай для кіношнікаў, якія здымаюць у стылі Таранціна (Квенцін таксама фанат фільму). Фабула прымітыўная: банда пад кіраўніцтвам нейкага Рэйдэра (акцёр Джон Траволта) захоплівае цягнік з усімі пасажырамі ў метро Нью-Йорка. Выкуп за закладнікаў — мільён долараў. Прычым кожную гадзіну злачынцы забіваюць па аднаму з узятых у палон. Паліцэйскі прапануе сябе ў якасці закладніка.

"Ганебныя падонкі" (Inglourious Basterds). Рэжысёр Квенцін Таранціна. Прэм'ера — 21 жніўня.

Зноў рэмейк, і зноў у падобным стылі. У 1978 годзе ў Італіі быў зняты фільм з такой самай назвай, які трапіў у ЗША і ўразіў маладога Квенціна. Праз 30 гадоў ён вырашыў перазняць стужку, запрасіўшы на галоўную ролю Брэда Піта. Герой Піта — камандзір спецгрупы антыгітлераўскіх саюзнікаў, якіх закідваюць у тыл нацыстаў. Тут яны знішчаюць усіх, каго бачаць на сваім шляху. Прычым у арыгінальнай манеры: забіўшы праціўніка, здымаюць яго скальп. Фільм быў прыняты крытыкамі вельмі супярэчліва. Адны называюць карціну наборам клішэ, іншыя — адным з лепшых твораў рэжысёра.

"Смешныя людзі" (Funny People). Рэжысёр Джад Апатау. Прэм'ера — 28 жніўня.

Недзе ў ЗША ёсць папулярны акцёр, які выступае ў шоу. Нечакана дактары кажуць артысту, што з-за парушэння крывяноснай сістэмы жыць яму застаецца максімум год. Герой павінен як мага хутчэй думаць, каму перадаць свае акцёрскія навыкі. Вось такая абсалютна не смешная тэма для смешнай, як пішуць крытыкі, камедыі.

Прыемнага вам прагляду.

ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ

ДЖЫДЖЫ БЕКАЛІ

Румынскі алігарх, прэзідэнт папулярнага ў краіне футбольнага клубу "Сцяуа" зрабіў, здавалася, неверагоднае. Пасля таго, як яго ўзімку адправілі ў турму за самасуд над злодзеем, які абрабаваў яго машыну, Бекалі ўвесну выставіў сваю кандыдатуру на выбары ў Еўрапарламент. Справа ў тым, што дэпутаты заканадаўчага органа ЕС маюць статус недатыкальнасці і могуць пакінуць краіну. Дзякуючы папулярнасці клуба і саюзу з правай партыяй "Вялікая Румынія" Джыджы атрымаў мандат. Увогуле, "Вялікая Румынія" здабыла 8 працэнтаў галасоў і будзе прадстаўлена ў Бруселі трыма дэпутатамі. Аднак усе намаганні Джыджы не мелі сэнсу. Вярхоўны суд краіны забараніў яму пакідаць радзіму, а гэта аўтаматычна азначае, што Бекалі застаецца за кратамі. Вязень-дэпутат назваў рашэнне суда "цыркам у цырку". З іншага боку, усе выбары ў Румыніі можна ахарактарызаваць падобнымі словамі. У еўрапарламент таксама прайшла Елена Басэску — дачка прэзідэнта Траяна Басэску . Яна атрымала 4,2 працэнта. Прычына поспеху — апека бацькі. Ад секцыі ліберал-дэмакратычнай партыі, якую ўзначальвае Траян, патрабавалі, каб кожны дзесяты сябра прагаласаваў за партыю дачкі боса.

ХОРСТ ЗЕЕХОФЕР

Старшыня партыі Хрысціянска-сацыяльны саюз (CSU), якая дзейнічае выключна на тэрыторыі Баварыі і лічыцца самым кансерватыўным палітычным аб'яднаннем сярод буйных нямецкіх партый, апошнім часам робіць папросту фантастычныя ўчынкі з пункту гледжання аматараў кансерватыўных каштоўнасцяў. Не так даўно стала вядома, што ў той час, калі Хорст быў дэпутатам Бундэстага, ён завёў сабе каханку Анэту Фроліх, якая ўжо мае ад яго дачку. Скандал ледзь удалося замяць. Сам Хорст пераехаў у Баварыю, дзе ўзначаліў партыю і публічна прынёс прабачэнні за свае амаральныя ўчынкі. Аднак цяпер высвятляецца, што ўсё гэта было няшчыра. На самай справе, ён дасюль больш часу праводзіць не ў сям'і, а з Анэтай. Больш таго, апошняя чакае ад яго другое дзіця. Калі згадаць, што ў Баварыі галоўным чынам жывуць каталікі, можна зразумець, якія наступствы для партыі будуць мець паводзіны Хорста. Застаецца дадаць, што Зеехофера перацягнулі ў Баварыю як антыкрызіснага менеджэра, які павінен быў выратаваць партыю пасля таго, як упершыню за 50 гадоў яна страціла абсалютную большасць у зямельным парламенце.

УЛАДЗІМІР ПУЦІН



Прэм'ер-міністр Расійскай Федэрацыі праявіў сябе не толькі як добры адміністратар, аднак і як мастацкі крытык. З нагоды 79-й гадавіны вядомага расійскага мастака Іллі Глазунова Пуцін наведаў ягоную студыю. Падчас прагляду прац аўтара ён крытычна прайшоўся па шэрагу з іх. Напрыклад, яму не спадабалася выява мяча ў руцэ князя на карціне "Князь Алег і Ігар", якую Глазуноў напісаў аж у 1972 годзе. "Меч вельмі маленькі. Ім быццам кілбасу будуць рэзаць", — пракаментаваў Пуцін малюнак. Таксама прэм'ер пракаментаваў карціну "Вечная Расія", дзе сярод іншых палітычных асобаў выяўленыя пакутнікі-князі Барыс і Глеб, якіх паводле летапісу забілі падчас сну. Пуціну не спадабалася, што князі ў прынцыпе вельмі лёгка памерлі. "Трэба было змагацца і не аддаваць сваё жыццё без барацьбы", — мудра адзначыў лідэр ураду. На ўсе такога кшталту заўвагі Глазуноў рэагаваў стэрэатыпна: "Вы цалкам маеце рацыю. У Вас добры вакамер". З іншага боку, Пуцін не ў першы раз выступае ў ролі крытыка. Пасля прагляду п'есы "Горе от ума" ў маскоўскім тэатры «Современник» ён знайшоў фігуру Чацкага вельмі слабай у праекцыі на персанаж Аляксандра Матросава.

ТАЯМНІЦЫ ГІСТОРЫІ

ВЕРШНІКІ НА КОНЯХ

Аляксей Хадыка

Гэты артыкул і сур'ёзны, і забаўляльна-павучальны. Таму што ён закранае гісторыю ўрачыста-рэпрэзентатыўных манументаў у Беларусі, а ўвасабленне ў помніках чалавечай памяці існуе на мяжы з эксплуатацыяй аднаго са смяротных грахоў, славалюбства, superbia. Што нярэдка нараджае да жыцця смешныя, жартаўлівыя сітуацыі. У той жа час існуе сфера "высокага" і афіцыйнага мастацтва, дзе вобраз уваходзіць у межы пашырэння прызнаных грамадствам знакаў і сімвалаў.

ЕЎРАПЕЙСКІЯ ВЕРШНІКІ

"Гіпіка" Дарагастайскага

Кожны народ перажывае перыяды ўвекапомнення ў манументальным мастацтве старонак гісторыі, якія падаюцца соцыуму ці пануючаму кіраўніку вартымі праслаўлення ў метале манументаў ці ў камяні маўзалеяў. Так было ад старажытнаегіпецкіх пірамід і антычных рымскіх помнікаў імператарам. Некаторыя скульптуры, быццам бы валодаючы закладзенай у іх мастакамі таямнічай сілай, адраджаліся праз стагоддзі. Паводле «волі рымскага народа» і загадзе папы Паўла III у сярэдзіне XVI стагоддзя вялікі Мікеланджэла ўрачыста ўсталяваў у цэнтры перабудаванага ім Капіталійскага ўзгорка ў Рыме старадаўнюю конную скульптуру рымскага імператара-філосафа Марка Аўрэлія.

Увасабляючы ўяўленне пра веліч уласнай імперыі, Кацярына II у 1782 годзе ўсталявала на Сенацкай плошчы ў Пецярбургу апеты пазней Пушкіным манумент Пятру I работы Эцьена Фальканэ — з надпісам на нязвыклых памерах камяні-пастаменце «Кацярына II — Пятру I». Помнік, які, паводле «падання пра маёра Батурына», засцярог горад ад захопу французамі ў 1812 годзе. Убачыўшы містычны сон пра ахоўную моц скульптуры, персанаж падання быццам пераканаў імператара Аляксандра I не вывозіць помнік з горада пад пагрозай наступу непрыяцельскіх войскаў. І ў другую сусветную вайну «медны вершнік» застаўся на сваім месцы.

Гераічны, манументальны вершнік на кані — тыповы спосаб праслаўлення спартрэтызаванай асобы ў скульптуры. Канструкцыя гэтага вобраза канчаткова ўсталявалася ў свядомасці еўрапейцаў хіба з часоў ранняга сярэднявечча, калі іх продкі, сядаючы на коней, фармавалі атрады і арміі вершнікаў і спрабавалі абараніцца ад хваляў наступу варварскіх плямёнаў з Усходу. І такім чынам стварылі аснову еўрапейскага рыцарства, а пазней — арыстакратычных сем'яў.

У хрысціянскай свядомасці моцны рыцар-воін увасабляў ідэал і абаронцы, і спагадліваго да слабых і пакрыўджаных апекуна. Гэты спектр якасцяў адбіўся ў культах некалькіх святых, вядомых яшчэ ад ранняга хрысціянства. Ад пераможца пякельных злых сілаў і ратавальніка жанчын св. Георгія да св. Марціна Турскага, ключавы эпізод гісторыі якога апавядае пра ахвяраванне гэтым воінам паловы плашча змерзламу жабраку.

УСЯСЛАЎ ЧАРАДЗЕЙ І МІНДОЎГ

Што тычыцца Беларусі, то лічыцца агульнапрызнаным стварэнне мемарыялаў з выявай вершніка толькі ў наш час. Першы конны манумент — князю Усяславу Чарадзею, які кіраваў Полацкім княствам з 1044 па 1101 гады, пастаўлены ў Полацку ў верасні 2007 года на рагу вуліц, што носяць імя яго ўнучкі, св. Ефрасінні, і Кастрычніцкай. Скульптар Аляксандр Прохараў у злёгку архаічным стылі рамантызаваў князявешчуна, змясціўшы постаць у ваўчынай скуры з паляўнічым сокалам за плячыма на імклівым кані. Разам кампазіцыя дасягае 3,5 метраў. Хіба такая вобразнасць, наўпрост перагукаючыся з радкамі летапісаў і «Слова пра паход Ігаравы» («Скочыў ад іх лютым зверам... Сінім воблакам ахінуўся...») найлепш дапамагае запоўніць лакуну, што існавала ў беларускай манументальнай пластыцы. Князь-герой часоў росквіту буйнейшага беларускага княства эпохі сярэднявечча, безумоўна, пазнавальны і блізкі яго хрэстаматыйнаму ўспрыняццю. У доўгім жыццяпісе князя — і будаўніцтва храма св. Сафіі ў Полацку, і супрацьстаянне з кіеўскімі валадарамі з бітвай на Нямізе, палон і кароткае панаванне ў Кіеве...

Падобна, што следам за Полацкам атрымае маэстатычны конны манумент Навагрудак — першая сталіца Вялікага Княства Літоўскага, які летась святкуе сваё 965-годдзе. Да таго ж на 2009 год прыпадае 1000-годдзе летапіснай згадкі старажытнай Літвы. Адзначыць гэтыя даты, як мяркуюць мясцовыя ўлады, будзе слушна размяшчэннем у цэнтры горада выявы вершніка з мячом, першага князя ВКЛ Міндоўга (1195?—1263). Над праектам працуе мінскі скульптар Генадзь Буралкін.

Генадзь Буралкін. Міндоўг

Марк Аўрэлій у Рыме

АМАТАРЫ КОНЕЙ

Але ці быў манумент Усяславу Чарадзею першай у гісторыі Беларусі спробай усталявання коннай скульптуры? І якія культурныя традыцыі і коды маглі паслужыць падставай дзеля звароту да такой рэпрэзентатыўнай формы?

Дасведчаныя знаўцы спашлюцца на багатыя традыцыі шанавання вызначаных у дзяржаўнай і вайсковай справе шляхетных асобаў, назавуць завядзёнку ствараць партрэтныя мемарыялы ў магнацкіх палацах і храмах, сустракаць рэальных пераможцаў з палёў баталій трыумфальнымі брамамі, пад якімі праходзілі кавалькады шляхетна ўбраных коннікаў... І коней шанавалі адметна — даволі прыгадаць маршалка ВКЛ Крыштафа Монвіда Дарагастаскага (1562–1615), які навуцы абыходжання з коньмі навучыўся ў лепшых майстроў гадоўлі і выездкі гэтых высакародных жывёл у першай у свеце школе коннай выездкі ў Неапалі. У вольны ад вайны і палітыкі час ён падрыхтаваў у бацькоўскай Мураванай Ашмянцы і выдаў у Кракаве ў 1603 годзе "Гіпіку пра коней". Трактат пра гісторыю коней і гадаванне маладняка, выездку і ветэрынарыю вытрымаў па-польску, на мове арыгінала, пяць перавыданняў, бо выкладзеная ў ім навука была надзвычай папулярнай.

Вялікія аматары коней, а да іх належалі многія прадстаўнікі арыстакратычнага саслоўя, трымалі не толькі цудоўныя стайні, але часам замаўлялі ўвасабленні сваіх гадаванцаў у пластыцы. Такую выяву паставіў каля свайго новазбудаванага палаца ў набытым у 1803 годзе Валожынскім маёнтку граф Юзаф Ігнацій Тышкевіч. Але дзве лініі культуры — захапленне коньмі і прыхільнасць да ўрачыстай рэпрэзентацыі — ніяк не ўвасабляліся ў з'яўленне адпаведнага манумента.

ЮЗАФ ПАНЯТОЎСКІ

У гэтай гісторыі ёсць адна ўзбочная лінія. Палац Румянцавых-Паскевічаў у Гомелі — старонка ўжо з часоў страчанай нашай краінай незалежнасці. У 1834 годзе палац перайшоў з рук другога з Румянцавых у шэрагу яго гаспадароў, графа Сяргея Пятровіча, ва ўласнасць царскага намесніка ў Польшчы генерал-фельдмаршала Івана Паскевіча. Ён атрымаў гэтую пасаду пасля кіравання задушэннем паўстання 1830–1831 гадоў у былой Рэчы Паспалітай. Пры ім палац займеў аздобу, якой вельмі ганарыўся новы гаспадар: працу еўрапейскага ўзроўню славутасці, дацкага скульптара-класіцыста Бертэля Торвальдсэна. Гэта быў вобраз пляменніка апошняга караля Рэчы Паспалітай Станіслава Аўгуста Панятоўскага, Юзафа. Удзельнік змагання супраць апошніх падзелаў Рэчы Паспалітай і паплечнік Касцюшкі, кіраўнік 5-га, у асноўным польскага корпуса Вялікай арміі Напалеона, ён загінуў, прайшоўшы ўсю расійскую кампанію, у "бітве народаў" пад Лейпцыгам 19 кастрычніка 1813 года.

Уласна, помнік, дзе скульптар выявіў Панятоўскага ў абліччы рымскага легіянера, праектаваўся для Варшавы, але ва ўмовах паразы лістападаўскага паўстання 1830–1831 гадоў і новых рэпрэсій, адліты ў 1832 годзе манумент ставіць у Варшаве забаранілі. І твор Торвальдсэна, на які пайшло амаль 10 год працы, аплачаны сабранымі ў Польшчы праз агульнанацыянальную падпіску грашыма, загінуў бы. Вердыкт расійскага імператара Мікалая I быў "разбіць і запісаць у лом".

Выратавала скульптуру калекцыянерскае захапленне Паскевіча, яго не палохаў вобраз "ворага Расіі", затое натхняў узнёслы скульптурны шэдэўр. Манумент упрыгожваў тэрыторыю перад палацам, ператвораным гаспадарамі ў сапраўдны музей коштам збору ваенных трафеяў, уласных набыткаў і калекцый, канфіскаваных у беларускіх паўстанцаў 1830–1831 гадоў.

Так, прывезеная ў Гомель у 1842 годзе скульптура, якая ў Варшаве была б сімвалічным знакам памяці пра гады польскага нацыянальнага супраціву апошняму падзелу Рэчы Паспалітай, зберагалася тут да 1922 года. Менавіта тады, па ўмовах Рыжскага міру паміж Савецкай Расіяй і Польшчай, яна вярнулася ў горад, для якога першапачаткова і прызначалася, каб загінуць у 1944 годзе, расстралянай немцамі падчас знакамітага варшаўскага паўстання.

"Гіпіка"

Аляксандр Прохараў. Усяслаў Чарадзей

Але Варшаве пашанцавала атрымаць аўтэнтычную копію работы Торвальдсена, зробленую з мадэлі, захаванай у Капенгагене, — падарунак датчан палякам. Зараз яна месціцца перад рэзідэнцыяй польскага прэзідэнта, былым палацам Радзівілаў у раёне Новы Свят у Варшаве... Гомелю на ўспамін пра помнік Юзафу Панятоўскаму засталіся выявы на старых паштоўках.

Гомельская гісторыя, аднак, тычыцца мастацкага помніка, які апынуўся ў Беларусі ў эміграцыі. Амаль стагоддзе раней у Слуцку найбагацейшы магнат Беларусі, мецэнат і самадур Геранім Фларыян Радзівіл рыхтаваўся да ўрачыстага ўшанавання сваіх жыццёвых здзяйсненняў...

Працяг у наступным нумары.

ПАДЗЕЯ

“У БЕЛАРУСІ АДНОЙЧЫ МУСІЦЬ РАСПРАНУЦЦА КОЖНЫ”

Алесь Гінзбург

“Вам чытаць ці на сценку вешаць?” — з такім пытаннем 16 чэрвеня сустракалі на ўваходзе ў кавярню “Gripp” журналістаў, што сабраліся на прэзентацыю візуальна-літаратурнага праекта “Канец словаў” для прэсы. У палове асобнікаў спружынка знаходзілася ўверсе — як у насценным календары, а ў палове — збоку, як у часопісе. Арганізатары, скарыстаўшы працаўнікоў пяра як фокус-групу, вырашалі, якому варыянту аддаць перавагу ў асноўным друку. Журналісты пераважна хацелі вешаць. Прадстаўнікі выданняў з прэтэнзіяй на высакалобасць — чытаць. “Але лепей — і тое, і другое разам”, — заахвочвалі стваральнікі.

Ідэя распрануць беларускіх літаратараў належыць літаратарцы Марыі Мартысевіч. Крыніцамі натхнення выступілі скандальная прапанова пісьменніка Алеся Аркуша зрабіць ню-фотасесію маладых паэтак дзеля “прапаганды беларускай літаратуры” і прыклад чэшскіх пісьменнікаў, якія распрануліся на мяжы тысячагоддзяў дзеля мастацтва. Потым з’явілася канцэпцыя “Канцу словаў”, распрацаваная журналісткай Дар’яй Сітнікавай і культуролагам Максімам Жбанковым. Візуальную частку першапачаткова мусілі рэалізоўваць некалькі фатографаў — Андрэй Шчукін і Дзяніс Нядзельскі, Ігар Саўчанка, Віталь Брусінскі і іншыя. Але ў выніку асноўнымі фотамастакамі календару сталіся Андрэй Шчукін і Дзяніс Нядзельскі.

“Голы каляндар”, як па-свойску называюць яго стваральнікі, выклікаў неадназначную рэакцыю ўжо на этапе абмеркавання ідэі стварыць штосьці такое ў беларускім кантэксце. Беларускія літаратары здаваліся публіцы надта пурытанскімі, каб пагадзіцца на такую авантуру — агаліць перад чытачом не толькі душу. Але, як зазначыў падчас прэзентацыі культуролаг Максім Жбанкоў, цнатлівасць і сарамлівасць белліту — міф. Прапанову агаліцца перад публікай атрымалі праз адкрытыя інтэрнэт-крыніцы каля 50 беларускіх літаратараў розных пакаленняў (найстарэйшым быў 73-гадовы Васіль Сёмуха). І каля 30 аўтараў папярэднюю згоду далі. І ўжо з гэтай трыццаткі смелых стваральнікі праекту і фатографы падбіралі 12 месяцаў беларускага літаратурнага года. Выглядае ён так: студзень — Віктар Шалкевіч, люты — Віталь Рыжкоў, сакавік — Юрась Барысевіч, красавік — Севярын Квяткоўскі, май — Анатоль Івашчанка, чэрвень — Андрэй Такінданг, ліпень — Андрэй Хадановіч, жнівень — Сяргей “Пістончык” Прылуцкі, верасень — Андрэй Адамовіч, кастрычнік — Усевалад Сцебурака, лістапад — Ілля Сін, снежань — Лявон Вольскі.

Папярэднюю згоду давалі Уладзімір Арлоў і Уладзімір Някляеў, Віктар Жыбуль, Алесь Аркуш, але па розных прычынах гэтыя пісьменнікі ўдзелу ў здымках узяць не змаглі. Адам Глобус пагадзіўся на распрананне, аднак паставіў строгую ўмову: здымаць яго павінна яго жонка, вядомая фотамастачка Алена Адамчык. Былі і такія літаратары, якія выказалі катэгарычную нязгоду з удзелам у праекце. Напрыклад, Альгерд Бахарэвіч з Гамбургу або Сяргей Балахонаў з Гомеля. Апошняга, аднак, ідэя моцна зачапіла канцэптуальна. Сяргей Балахонаў — аўтар прадмовы да календара “Канец словаў”, у якой ён сцвярджае, што ідэя беларускіх літаратараў агаліцца перад публікай далёка не новая і сягае каранямі яшчэ ў часы вешчага Баяна. Аўтар упэўнена ілюструе прыклады пісьменніцкага эпатажу звесткамі з “гістарычных” крыніцаў.

Стваральнікі календара падкрэсліваюць, што гэта чарговы супольны праект беларускай культуры, дзеля якога аб’ядналіся рэдакцыя часопіса pARTisan і студыя моднага фатографа Андрэя Шчукіна. “Мне вельмі спадабалася працаваць над календаром. Гэта была творчая праца — на фоне руцінай рэкламы, якую мне даводзіцца здымаць штодня. І ў той жа час было цікава расказаць пра беларускую літаратуру візуальнымі сродкамі рэкламы, зрабіць з іх глянец, які можна чытаць, гартаць…”

Але каляндар — гэта не толькі 12 ню-фотаздымкаў беларускіх пісьменнікаў. Гэта яшчэ і іх тэксты. У тэкставую частку ўваходзяць: інтэрв’ю з героем (пра выявы, словы і неапранутыя целы); ягоныя рэфлексіі з нагоды магістральнай тэмы “Канец словаў” (літаратары атрымалі поўны карт-бланш у трактоўцы тэмы); лепшае з напісанага (уласны “зэ бэст” аўтар абіраў сам); ілюстрацыі прасторы, “Вы можаце выдраць гэтыя распусныя здымкі і атрымліваць асалоду ад тэкстаў, вы можаце наадварот — выдраць тэксты і пакінуць сабе каляндар, але мы раім успрымаць праект як адзінае цэлае, чым ён і ёсць”. А Марыйка Мартысевіч звярнула ўвагу журналістаў на тое, што каляндар “вечны” — маўляў, ars longa. І ўладальнік календара можа сам праставіць дні тыдня для года, у які ён хоча яго распачаць.

На прэс-канферэнцыі стваральнікі календара паспрабавалі апярэдзіць шмат лагічных пытанняў шырокай публікі. “Чаму толькі мужчыны?” — пыталіся стваральнікі самі ў сябе. “Таму што дзеючая асоба белліта ў масавай свядомасці — гэта, перадусім, мужчына. Літаратары мужчынскага полу працавалі на гэты статус з часоў набыцця тутэйшым насельніцтвам здольнасці пісаць і чытаць напісанае. А, як кажуць, статус урэшце абавязвае”. “Чаму мужчыны голыя?” — не суніміліся стваральнікі. “Сёння аголенае жаночае цела дыскрэдытавала сябе як жанр. Але ў нашым збольшага патрыярхальным грамадстве выкарыстанне эфекту яго т. зв. “хараства” і/ці “сексуальнасці” — гэта нармальна. Праз жанчыну прадаюць/прапагандуюць разнастайныя тавары, паслугі і ідэі — ад антыфрызу да алею, ад паэзіі да “твару краіны”.

“Канец словаў”, напэўна, беспрэцэдэнтны для Беларусі выпадак выкарыстання нестандартнага мужчынскага цела ў культурных мэтах. Бо кансерватыўны спажывец, калі чуе пра аголеных мужчын, чамусьці адразу ўяўляе сабе лазню з адпаведным візуальным шэрагам. І не прымае мужчынскую постаць у тым, што ў нас лічыцца традыцыйна “жаночым” кантэкстам — у сітуацыі “мадэляў” для разглядання. Але нашая мэта — не задавальненне сярэднестатыстычнага спажыўца. Наша мэта — правакацыя і гульня, у тым ліку і з гендэрнымі клішэ. Як сказаў адзін з удзельнікаў праекту, прыспеў час “паказаць “фак” нашаму пурытанскаму грамадству”.

“Чаму некаторыя літаратары не зусім літаратары? Па якіх крытэрах адбіраліся ўдзельнікі?” — працягвалі катаваць сябе пытаннямі стваральнікі. І сапраўды — сярод літаратараў наяўныя аж тры шоумены, музыкі, спевакі: Вольскі, Такінданг і Шалкевіч. “Нашы літаратары — літаратары ў шырокім сэнсе, — тлумачаць рэдакцыя календара. — Яны не абавязкова аўтары бестселераў ці ўладальнікі дзяржаўных узнагарод. Мы абіралі людзей слова — тых, хто, на наш погляд, таленавіта працуе з тэкстамі, незалежна ад таго, піша ён раманы, эсэ, вершы або песні. У дадатак было цікава змяшаць жанры — музыку, тэксты, малюнкі, фота. І не ўзбоўтваць — каб атрымаць шматслойны кактэйль”.

Ці то расслабляючая атмасфера кавярні “Gripp”, ці то апярэджаныя правакацыйныя пытанні, але атмасфера на прэс-канферэнцыі панавала надзіва мірная. Удзельнікі календара — Віталь Рыжкоў і Севярын Квяткоўскі — прызнаваліся ў каханні да фатографаў і рэдактараў, тыя — у любові да беларускіх пісьменнікаў. “А хто каму плаціў падчас распранання — літаратары фатографам ці наадварот?” — “Ніхто нікому. Усё было па любві. Ніхто не зарабіў на гэтым праекце”.

Захопленыя ці абураныя водгукі ён збірае — абыякавым новы артэфакт беларускай культуры не пакідае нікога. Набыць арт-каляндар, як гэта водзіцца з усёй незалежнай беларускамоўнай кніжнай прадукцыяй у Беларусі, можна будзе ў Мінску ў краме “Падземка”, на кніжным кірмашы “Мир книг”, у незалежных распаўсюднікаў і падчас прэзентацый.

Фота Юрыя Дзядзінкіна

Фота Юрыя Дзядзінкіна

Удзельнікі пра каляндар:

Андрэй Адамовіч: “Гэты праект — чыста эстэтычная акцыя, а не эратычная ці парнаграфічная. (…) Думаю, што калі б я быў дзяўчынай, дык не пагадзіўся б удзельнічаць ці, прынамсі, вельмі доўга вагаўся б. Бо тады б заставалася верагоднасць, што хтосьці можа лічыць гэта эротыкай. А так... Прынамсі, мае фотаздымкі эротыкай ніхто не палічыць.

Андрэй Хадановіч: “У Беларусі аднойчы мусіць распрануцца кожны. Калі літаратары — святарныя каровы, настаўнікі жыцця, жывыя помнікі самім сабе, аголеная задніца — адзіны жывы атрыбут, які ва ўсім гэтым ёсць. Нешта гарантавана “сваё”.

Стваральнікі пра каляндар:

Марыя Мартысевіч, аўтарка ідэі, каардынатарка: “Ці не ўпершыню за гісторыю найноўшай беларускай літаратуры пісьменнікі стварылі штосьці не на густы айчыннай публікі (збольшага кансерватыўныя), не ў чаканні пахвалы крытыкі (збольшага афіцыёзнай), а… для сябе. Успрымайце гэта як чарговы мастацкі твор нашых мадэляў, напісаны ў суаўтарстве з фатографамі — уласным целам. Калі ж казаць пра значэнне гэтага праекту ў літаратурным вымярэнні — то гатоўнасць распрануцца перад камерай наўпрост карэлюе з раскаванасцю ў творчасці. Фактычна вядзецца пра прэзентацыю ліберальнага канону беларускай літаратуры”.

Дар’я Сітнікава, суаўтарка канцэпцыі, каардынатарка: “Кажуць, Мэрылін Манро ў свой час прачытала джойсаўскага “Уліса”. Ёсць адмысловае фота, дзе зафіксавана, што яна дачытвае апошнія старонкі. Ці — прынамсі — робіць выгляд. Наш праект — спроба выцягнуць сучасную беларускую літаратуру па-за межы цьмяных залаў і ўзнёслых (ці — наадварот — прыніжальных) дыскурсаў. І зрабіць яе моднай, прывабнай для чытача — праз скандал, гламур, свядомую “папсавізацыю”. Дзеля таго, каб аднойчы пабачыць Люсю Лушчык, якая дачытвае томік Хадановіча ці Акудовіча. Ці — прынамсі — робіць выгляд”.

Максім Жбанкоў, суаўтар канцэпцыі: “Навошта мы гэта зрабілі? Каб выказаць вельмі простую думку: «Звярніце ўвагу на нашых герояў! Вось яны: розныя, таленавітыя, рызыкоўныя. Любіце іх, пакуль яны жывыя, пакуль яшчэ не пераўтварыліся ў помнікі ды школьныя падручнікі». Наш праект — гэта прызнанне ў любові да герояў сучаснай айчыннай культуры. Добра, што яны ёсць. Добра, што робяць сваю няўдзячную справу. Варта іх ведаць і варта шанаваць”.

АГЛЯД



САЦЫЯЛЬНЫЯ ВЫСТАВЫ МУЗЕЯ КІНО

Аляксей Хадыка

Музей гісторыі беларускага кіно, размешчаны паміж гасцініцай "Мінск" і Чырвоным касцёлам, у чэрвені адзначыўся дзвюма выставамі сацыяльнага гучання.

Першая, "Неа-Сармацкі партрэт", адлюстравала спробу выхаду ў сферы новых відаў творчасці аднаго з прадстаўнікоў папулярнага з 1990-х гадоў руху гістарычных рэканструкцый, клуба "Жалезны Воўк", створанага ў Наваполацку ў 1997 годзе.

Сябры клуба ўжо выпрабоўвалі сябе ў кіназдымках і тэатральных пастаноўках, не кажучы пра ўдзел у рыцарскіх фэстах. Нарэшце, прыцягнуўшы да дзейнасці клуба мастакоў, звярнуліся да выяўлен-

чага мастацтва. У выніку нарадзіўся праект, у межах якога з 2003 года адбылася арганізацыя шэрагу выстаў, першасна натхнёных вобразнасцю і паэтыкай беларускага шляхецкага сармацкага партрэта XVI–XVIII стагоддзяў. У той знакамітай з'яве мастацкай культуры ўвасобіліся і генеалагічныя (сармацкія і рымскія) міфы, і рыцарскі этас, і арыенталізаваная эстэтыка побытавай моды, якая вызначала густы шляхты. Як і ўяўленні пра саслоўныя і сацыяльна-палітычныя вартасці, увасобленыя ў разнастайным наборы атрыбутаў.

Неасармацкі варыянт адрозны: ён найперш адбітак, сцэнічная рэканструкцыя ўяўленняў пра гістарычная мінулае і летапіс самога клуба, непасрэдных стылічна-кампазіцыйных паралеляў са старажытным мастацтвам небагата, а жывапіс адзначаны эклектычнасцю форм — ад рамантычнага рэалізму работ Юліі Хінтэманн ("Крысціна і Алаферн") да кубістычных рэмінісцэнцый Андрэя Мікалаева. З'ява з катэгорыі "неа", жаданне з пієтэтам глядзецца ў люстэрка гісторыі і папулярызаваць уласнае ёю захапленне. Выдадзены буклет да выставы, распрацавана канцэпцыя — хіба нехта будзе пярэчыць ператварэнню рыцарскіх фэстаў у святы розных відаў мастацтва і ў спалучэнні з паказам твораў жывапісу, рэканструкцый зброі, гістарычных дакументаў?

А з 19 чэрвеня ў той жа невялікай зале фотаэкспазіцыя прэзентуе праект сур'ёзнай грамадскай значнасці — фотаработы Ксеніі Авімавай з'яўляюцца часткай сацыяльнай акцыі "Тэатр у турме". Акцёраў, здымкі якіх можна ўбачыць у музеі, на сцэну тэатра прывяла калонія. А ідэя прыйшла са Швецыі: ужо некалькі гадоў Беларускі саюз жанчын разам з дэпартаментам выканання пакаранняў і шведскай грамадскай арганізацыяй "N-STUDIO" праводзяць у месцах зняволення лекаванне пад знакам Таліі і Мельпамены.

Пачалося ўсё ў 2005 годзе з наведання жаночай папраўчай калоніі №4 акцёрам і рэжысёрам Каралеўскага акадэмічнага тэатра Стакгольма Іона Йонсана. Першы спектакль "Восем закаханых жанчын" па п'есе француза Раберта Тама як кіраўнік трупы і рэжысёр рыхтаваў актор Гомельскага абласнога драматычнага тэатра Аляксей Бычкоў.

На сцэну мінскага маладзёжнага тэатра эстрады свае пастаноўкі ў мінулым годзе прывозілі выканаўцы ўжо з дзвюх калоній — Віцебскай і Бабруйскай, — выклікаючы непадробнае захапленне публікі пранізлівай шчырасцю выканання роляў. Ніна Абухова, актрыса Віцебскага драматычнага тэатра, абіраючы акцёраў для сваёй пастаноўкі "Маленькага прынца" Экзюперы, не памылілася ў эфекце ўздзеяння эмацыйна насычанай літаратуры на душы маладых зняволеных. Пераапрананне з турэмнай робы ў сцэнічны касцюм — як вяртанне да сапраўднага паўнакроўнага

МІНУЎШЧЫНА

ЛЕГЕНДЫ І ПАДАННІ НАШАГА КРАЮ

У мінулым годзе нашы чытачы ўжо мелі магчымасць пазнаёміцца з легендамі розных куткоў Беларусі. На гэты раз прапануем вашай увазе паданні Бялыніцкага раёну Магілёўскай вобласці, сабраныя мясцовым журналістам Барысам Вырвічам.

Юркаў Брод

На поўдзень ад вёскі Мяжонка раскінулася велізарнейшае балота. У старыя, яшчэ паганскія часы на месцы яго знаходзіліся лугі, пашы, лясы, палі. І стаяла тут вёска Броньсевічы, у якой жылі добрыя, працавітыя людцы. І быў сярод іх адзін хлопец. Юркам яго звалі.

Каля самае вёскі працякала невялікая рачулка. Задумалі аднойчы чэрці запрудзіць рэчку, павярнуць яе плынь з поўдня на поўнач, каб усю гэту прыгожую, квяцістую зямлю ператварыць у гнілое, смярдзючае балота і ладзіць потым у багнявішчы свае чартоўскія шабашы ды ігрышчы.

Нацягалі яны камення, дрэў панаварочвалі — стварылі-такі запруду і назвалі яе Чортавай грэбляй. І стала рэчка разлівацца па лясах, палях, агародах, пачалі забалочвацца палі ды сенажаці.

Бачаць людзі — дрэнна будзе, калі не даць рады гэтай навале. Думалі яны, думалі... І нарэшце Юрка прыдумаў. Ён прапанаваў аднавяскоўцам выкапаць глыбокае возера, каб уся вада збеглася туды.

Уся прырода пачала дапамагаць людзям: звяры рылі зямлю, а птушкі ў дзюбах адносілі яе далей ад яміны. Значна пазней на тым высокім месцы, куды зносілася зямля, вырас лес, які людзі назвалі Высокі Бор.

Праз некалькі гадоў цяжкай працы возера было выкапана, яно, як і казаў Юрка, запоўнілася вадой. Лішак яе адводзіўся па канаве, выкапанай у абход чортавай грэблі да старога рэчышча. З цягам часу канава паглыбілася, пашырылася ў берагах і ператварылася ў сапраўдную раку.

І зноў людзям стала добра. Балота больш не наступала, заквітнелі сады, зазеляцелі лугі, ураджай на агародах пачаў вырастаць яшчэ лепшы за ранейшы.

Але не хацелі змірыцца з гэтым і чэрці — змарнавалася іх праца, людзі жывуць шчасліва і ў дастатку. Раззлавалася нячыстая сіла і надумалася звесці са свету Юрку. А за ім і ўсіх вяскоўцаў.

Аднойчы, калі юнак гуляў ля рэчкі са сваёй каханай, чэрці зняцку накінуліся на яго. Юрка быў хлопцам не слабым. Магчыма, ён і адужаў бы нечысць, але ж надта шмат яе было. Спаўзлася адусюль.

Ратуючы каханую, Юрка загінуў. Укінулі чэрці яго цела ў рачулку, завалілі ламаччам, а зверху яшчэ і цяжкімі дрэвамі прыціснулі.

Дзяўчына паспела дабегчы да возера ды ад гора і страху — бо пасля расправы над Юркам нячысцікі кінуліся ўслед

за ёй — скокнула ў ваду і ўтапілася.

І адразу ж возера стала сінім-сінім — як напоўненыя слязамі блакітныя вочы дзяўчыны.

З таго часу і завецца месца, дзе загінуў хлопец, Юркавым Бродам, а возера паміж вёскамі Мяжонка і Дулебы — Блакітным. А вось ад Чортавай грэблі і знаку не засталося. Захавалася ў памяці людзей толькі адна назва.

Гняздзін

У тыя пракаветныя часы Гняздзін быў зусім маленькай вёсачкай, і яе аблюбавалі буслы. А гэтае здарэнне надарылася яшчэ тады, калі буслы ў вырай не ляталі. Яны жылі з людзьмі і зімой, сябравалі з людзьмі.

А вораг роду людскога, чорт, не любіць, калі ўсё ідзе добрым ладам. Вось і вырашыў чорт пасварыць людзей з буслямі. І дабіўся, нячысцік, свайго. Сталі гняздзінцы злоснымі, нецярпімымі, крыўдзілі адзін аднаго, жывёл і птушак перасталі шанаваць.

Неяк увосень сабраліся ўсе буслы і пакінулі гэтых людзей. Засталіся на дрэвах толькі іхныя гнёзды. І так іх многа было, што саму вёску назвалі Гняздзін.

Праз некалькі гадоў буслы даравалі-такі людзям і вярнуліся па вясне на радзіму. Але зноў доўга вытрымаць цяжкога характару гняздзінцаў не змаглі і цяпер ужо назаўсёды пакінулі гэту вёску. А разам з імі зляцелі і многія іншыя птушкі.

Васількі

Даўным-даўно жыў тут чалавек. Зваўся ён Васілём. Вельмі любіў Васіль кветкі, а таму і сам вырошчваў іх. Новым кветкам даваў імёны.

Аднойчы ў яго садзе з'явілася новая кветачка. Была яна блакітнага колеру. Яна ўмела размаўляць і пры першым спатканні папрасіла Васіля, каб ён хутчэй даў ёй імя. Прыгожае, мілагучнае.

Доўга-доўга думаў Васіль і нарэшце разважыў, што назвы лепшай за Васілёк не прыдумаць.

Васіль з Васільком многа чаго не дагаварылі. Але аб новай кветачцы, якая да таго ж умее гаварыць, даведаўся туташні злосны пан. Ён і загадаў Васілю прынесці кветку да яго ў святліцу.

Пра гэтае няшчасце дачуўся і Васілёк. Ён таксама не хацеў жыць у злоснага чалавека і ператварыўся ў чырвоную нікім незаўважаную кветачку.

Азвярэлы пан люта пакараў Васіля, а напрыканцы мучэння загадаў укінуць яго цела ў рэчку. Так і загінуў Васіль, але кветачка — засталася. А людзі і перайменавалі сваё паселішча Васількамі — як памяць аб Васільку, Васілю і яго кветках.

Прыбарская крыніца

Жыў калісьці ў гэтай мясцовасці (паміж Цяхціном і Прыбарам) пан. І была ў таго пана дачка. Прыгожая і адзіная ў панскай сям'і. Ведама, бацька яе вельмі шкадаваў і шанаваў.

Усяму прыходзіць свой час. Пакахала панская дачка маладога хлопца. Бацьку дзяўчыны ён вельмі не спадабаўся. Забараніў пан строга ім сустракацца.

Але што для закаханых забарона? Калі кахаеш, усе перашкоды адолееш. Вось і вырашылі яны ўцячы, каб жыць-пажываць разам.

Калі пан даведаўся пра іх змову, дачка ўжо ехала ў карэце са сваім каханым.

Бацька пракляў сваю дачку. І ў гэты самы момант, калі ён прамаўляў апошнія словы праклёну, зямля расступілася, і карэта пайшла пад зямлю.

На тым месцы ўтварылася крыніца: паміж вёскамі Цяхцін і Прыбар, каля лесу на лузе. І колькі было непагадзі, засухі, але тая крыніца, як жывая, заўсёды б'е ключом.

Працяг будзе

Новы Час
Масава-палітычная газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар **Алена Анісім**
Шэф-рэдактар **Аляксей Кароль**

Пасведчанне аб рэгістрацыі № 1798 ад 12 верасня 2008.
ЗАСНАВАЛЬНІК: Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.
ВЫДАВЕЦ: Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў».

Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.
АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:
220012, г. Мінск, зав. Інструментальны, 6-214.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 280 17 91.
novychas@gmail.com; www.novychas.org
НАДРУКАВАНА ў друкарні УП «Плутас-Маркет». Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова №
Падпісана да друку 19.06.2009. 8.00.
Наклад 5050 асобнікаў. Кошт свабодны.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы.
Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.